ВЫДАЕЦЦА З КАСТРЫЧНІКА 1991 г.
№ 6 (1080) 9 лютага 2013 г. Кошт 4000 рублёў.

КУЛЬТУРА

WWW.KIMPRESS.BY
ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА-АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА

12-га А дванаццатай

АДБУДЗЕЦЦА ВЫНІКОВАЯ КАЛЕГІЯ МІНІСТЭРСТВА КУЛЬТУРЫ КРАІНЫ

С. 10 — 11

БРЭНД ПАД БЕТОННЫМІ "НАКРЫЎКАМІ"

С. 4 — 5

АПГРЭЙД АРЭАЛА МІРСКАГА ЗАМКА

С. 3

ПРАБЛЕМНЫ ОН-ЛАЙН

ПРАВЯЛА РЭДАКЦЫЯ "К" НАПЯРЭДАДНІ КАЛЕГІІ

МИНСКАЯ МЕЖДУНАРОДНАЯ КНИЖНАЯ ЯРМАРКА

КІРМАШ КНІЖНЫХ ПРАЕКТАЎ: ШТО Ж ПАТРЭБНА ІНВЕСТАРУ?

С. 6

ІНСТЫТУТ ПАВЫШЭННЯ КВАЛІФІКАЦЫІ НА ПАЛОСАХ "К"

ПК

С. 13

НЕСТАЛІЧНЫ ТЭАТР: ВЕРСІЯ-2013

С. 7

Узнагароджаны дзяржавай

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка 4 лютага падпісаў Указ аб уганараванні дзяржаўнымі ўзнагародамі заслужаных людзей нашай краіны, у тым ліку шэрагу дзеячаў культуры і мастацтва.

За шматгадовую плённую працу, узорнае выкананне службовых абавязкаў, значны асабісты ўклад у развіццё сферы культуры ордэнам Францыска Скарыны ўзнагароджаны генеральны дырэктар Гомельскага дзяржаўнага цырка Якаў Лабовіч. Медалём "За працоўныя заслугі" адзначаны загадчык мастацка-пастановачнай часткі гэтай жа ўстановы Васіль Маркаў.

Ганаровае званне "Заслужаны артыст Рэспублікі Беларусь" прысвоена артыстам балета (салістам) — вядучым майстрам сцэны Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Антону Краўчанку, Ірыне і Алегу Яромкіным, а таксама вядучаму майстру сцэны Магілёўскага абласнога тэатра драмы і камедыі імя В.І. Дуніна-Марцінкевіча (г. Бабруйск) Аляксандру Парфяновічу.

Ганаровае званне "Заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь" прысвоена генеральнаму дырэктару Нацыянальнага мастацкага музея Уладзіміру Пракапцову, званне "Заслужаны дзеяч культуры Рэспублікі Беларусь" — начальніку аддзела культуры Ельскага райвыканкама Валерыю Гейхману.

Ю.Ч.

"Купалінка" — у Таліне, "Эстонія" — у Мінску

8 лютага ў Эстонскай Рэспубліцы распачаліся Дні культуры Беларусі. Іх арганізатары — міністэрствы культуры абедзвюх краін пры падтрымцы Пасольства Беларусі ў Эстоніі. У складзе нашай дэлегацыі — амаль 300 чалавек. У адкрыцці мерапрыемства прыняў удзел міністр культуры Рэспублікі Беларусь Барыс Святлоў. Наша нацыянальнае мастацтва будзе прадстаўлена за мяжой лепшымі ўзорамі оперы, балета, музыкі, фальклору.

Адна з цэнтральных падзей мерапрыемства — выступленні Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Рэспублікі Беларусь. Яны пройдуць у Эстонскай нацыянальнай оперы. Нашы артысты прэзентуюць балеты "Спартак" і "Шахразада", оперы "Князь Ігар" і "Мадам Батэрфляй".

Працуе выстаўка сучаснай беларускай фатаграфіі з калекцыі Музея сучаснага выяўленчага мастацтва "Адлюстраванне". У экспазіцыі — 25 работ Міхаіла Баразны, Кацярыны Кёнігсберг, Паліны Ляжанскай, Юрыя Пеўнева, Сяргея Торбіка. Тэма работ — архітэктурныя помнікі і вуліцы беларускай сталіцы.

Фальклорны гурт "Купалінка" выступае ў Доме культуры горада Нарвы і ў Цэнтры рускай культуры Таліна.

Запланавана правядзенне сустрэч з кіраўніцтвам Міністэрства культуры Эстоніі, а таксама наведванне ўстаноў культуры краіны…

У сценах старадаўняга палаца роду Радзівілаў у Нясвіжы сёння адбудзецца знакавая падзея — асвячэнне капліцы ў гонар Маці Божай Ларэтанскай. Урачыстая літургія пройдзе пры ўдзеле арцыбіскупа Тадэвуша Кандрусевіча, Мітрапаліта Мінска-Магілёўскага.

Капліца — па фотаздымках

Аднаўленню капліцы папярэднічалі грунтоўныя рэстаўрацыйныя работы. У прыватнасці, памяшканне капліцы ўзнаўлялася па фотаздымках канца XIX — пачатку XX стагоддзя. Да прыкладу, на сценах былі адноўлены іерусалімскія крыжы, якія Міхал Казімір Радзівіл "Рыбанька" размясціў у памяць пра тое, што ягоны продак Мікалай Крыштаф Радзівіл "Сіротка" здзейсніў паломніцтва ў Святую Зямлю і стаў рыцарам Ордэна Святой Труны Пана Іерусалімскага, чыёй эмблемай з'яўляецца гэты крыж. Таксама яшчэ летась адбылося перанясенне каменных пліт з нясвіжскага касцёла Божага Цела, якія знаходзіліся там да пачатку Другой сусветнай вайны, у капліцу. Акрамя таго, у капліцу вярнуўся, няхай сабе і ў выглядзе копіі, абраз Маці Божай Ларэтанскай.

Трэба адзначыць, што Міхал Казімір Радзівіл "Рыбанька" пры ўзвядзенні сваёй рэзідэнцыі адразу планаваў і будаўніцтва асобнага памяшкання для палацавай капліцы. Паводле яго задумы, у капліцы павінен быў знаходзіцца менавіта шанаваны абраз Божай Маці Ларэтанскай, які князь атрымаў ад нашчадкаў караля Рэчы Паспалітай Яна Сабескага.

18 чэрвеня 1758 г. капліцу ўрачыста асвяціў біскуп Жамойцкі Антоній Дамінік Тышкевіч. На самім жа асвячэнні прысутнічалі знакамітыя госці з усёй Рэчы Паспалітай, а таксама сваякі Міхала Казіміра Радзівіла "Рыбанькі".

У далейшым палацавая капліца перажыла шмат выпрабаванняў. У прыватнасці, пасля таго, як у 1812 г. Дамінік Радзівіл выступіў на баку Напалеона, расійскія ўлады канфіскавалі палац, а ў памяшканні капліцы размясцілі сталярную майстэрню. Толькі ў 1878-м Антоній Вільгельм Радзівіл і Марыя Дарота дэ Кастэлян пачалі аднаўленне палаца пасля паўвекавога запусцення. У ліку іншых работ пачалося аднаўленне і капліцы. З тых часоў і да пачатку 40-х гадоў мінулага стагоддзя капліца дзейнічала. Вядома, што ў 1920-я князь Альбрэхт Радзівіл заключыў дамову з парафіяй Божага Цела, каб у капліцы перыядычна служылася імша.

К.А.

На здымку: копія абраза Божай Маці ў палацавай капліцы.

Прастора і час Леаніда Шчамялёва

5 лютага ў Нацыянальным мастацкім музеі адбылося свята для ўсіх, хто цікавіцца нацыянальным выяўленчым мастацтвам. Пры вялікай колькасці наведвальнікаў была адкрыта юбілейная рэтраспектыўная выстаўка "Мастак і час" твораў народнага мастака краіны, лаўрэата Дзяржаўнай прэміі Беларусі і прэміі Саюзнай дзяржавы, удзельніка Вялікай Айчыннай вайны Леаніда Шчамялёва.

У экспазіцыі чатырох залаў прадстаўлена звыш 120 жывапісных палотнаў і 40 графічных твораў: шматфігурныя карціны, пейзажы, партрэты, нацюрморты, у тым ліку самыя даўнія — канца 1950-х — пачатку 60-х гадоў, якія раней мала хто бачыў. Але дзясяткі і дзясяткі работ, канешне ж, адсутнічаюць: яны знайшлі сваё пастаяннае месца ў шматлікіх музеях ды галерэях свету.

Але і на сённяшняй выстаўцы можна натхніцца "шчамялёўскімі" фарбамі, якія вось ужо больш за паўстагоддзя радуюць нас, яго ўдзячных прыхільнікаў ды гледачоў. Таму што непрыхаваны інтарэс да ўсяго новага, юначую ўлюбёнасць у мастацтва Шчамялёў нясе ў сабе ўсё жыццё.

Леаніду Дзмітрыевічу — дзевяноста, але і сёння яму па-ранейшаму ўласціва пастаяннае адчуванне чакання, спадзявання на ажыццяўленне мары, прадчуванне сустрэчы з будучым.

На вернісажы віншавальны адрас Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі ў сувязі з юбілеем мастака зачытаў міністр культуры краіны Барыс Святлоў. Таксама выдатнага жывапісца сучаснасці павіншавалі вядомыя дзеячы культуры, прадстаўнікі Мінгарвыканкама і прафсаюзаў, кіраўнікі Беларускага саюза мастакоў, Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў і інш.

У сваім выступленні Леанід Шчамялёў сардэчна падзякаваў усім за ўвагу да ягонага мастацтва.

Б.К.

На здымку: Віншавальны адрас Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь Аляксандра Лукашэнкі мастаку зачытвае міністр культуры краіны Барыс Святлоў.

Фота аўтара

XX Кніжная: Кірмаш + вакзал + "...Фаліянт"

Гэтымі днямі завяршае сваю працу прадстаўнічая Мінская міжнародная кніжная выстаўка-кірмаш. Традыцыйная ўвага з боку шырокай грамадскасці да яе назіралася з першых гадзін працы форуму і сёлета. Без перабольшвання, каб праціснуцца паміж аматарамі кніжных навінак у "гадзіны пік", трэба было добра пастарацца.

І гэта не выпадкова. Як адзначаецца ў адрасе Прэзідэнта краіны Аляксандра Лукашэнкі ўдзельнікам і гасцям XX Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, бо за мінулыя дваццаць гадоў гэты форум стаў не толькі адной з яркіх падзей у культурным і духоўным жыцці краіны, але і набыў шырокую вядомасць у сусветнай кніжнай супольнасці. Акрамя таго, як падкрэсліў Кіраўнік дзяржавы, цяперашняя, юбілейная, выстаўка-кірмаш падводзіць своеасаблівы вынік Года кнігі.

За дні працы форуму прайшоў шэраг разнастайных мерапрыемстваў, у тым ліку дабрачынны марафон "Пачытаем!" па зборы кніг для стварэння бібліятэчак для дзіцячых дамоў сямейнага тыпу, канцэрты духоўнай і класічнай музыкі, аўтограф-сесіі, прэзентацыі кніг, літаратурныя чытанні і нават спектакль-прэзентацыя "Сябрына", арганізаваны выдавецтвам "Мастацкая літаратура".

Сёлета, як паведамляла "К" у мінулым нумары, Ганаровым госцем Кніжнай выстаўкі-кірмашу з'яўляецца Расійская Федэрацыя. Маштабны стэнд яе стаў не толькі пляцоўкай для адметных выданняў, але і месцам сустрэч з аўтарамі кніг, выдаўцамі. Адметны нацыянальны стэнд, які заняў плошчу ў 50 квадратных метраў, прадставіла Ісламская Рэспубліка Іран — у гэтым годзе ён з'яўляецца цэнтральным экспанентам. Акрамя кніг, на іранскай пляцоўцы можна палюбавацца адмысловым посудам, мініяцюрамі, дэкаратыўна-прыкладнымі ўзорамі ўсходняга мастацтва. А ці не самай каштоўнай кнігай, прадстаўленай там, стаў альбом мініяцюр майстра іранскага жывапісу М. Фарсчыена.

Не менш цікавай выглядае і французская экспазіцыя, стэнд якой нагадвае Паўночны вакзал у Парыжы: там можна пагартаць кнігі французскіх выдавецтваў на мове арыгінала, а таксама пазнаёміцца з некаторымі іх аўтарамі. Можна адзначыць і турэцкі стэнд на форуме: там, акрамя кніг, можна набыць парфумерыю, вырабы са скуры, а таксама паласавацца традыцыйным далікатэсам — рахат-лукумам.

Варта адзначыць, што адным з самых яркіх момантаў форуму стала ўрачыстая цырымонія ўзнагароджання лепшых кніжных праектаў конкурсу "Мастацтва кнігі-2013", якая адбылася ў Нацыянальнай бібліятэцы. Усяго на перамогу ў 14 намінацыях прэтэндавалі 175 выданняў ад 31 выдавецтва. Так, уладальнікам Гран-пры ў намінацыі "Трыумф" стаў фотаальбом "Полацк. 1150". Ганаровы знак-сімвал "Залаты Фаліянт" і ганаровы дыплом імя Францыска Скарыны ўручаны выдавецтву "Беларуская Энцыклапедыя імя Петруся Броўкі", дызайнеру Усеваладу Свентахоўскаму і паліграфічнаму прадпрыемству — выдавецтву "Беларускі Дом друку".

К.А.

На здымку: аўтограф-сесія французскіх літаратараў.

Фота аўтара

НАГАДВАЕМ!
ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" НА САКАВІК І НАСТУПНЫЯ МЕСЯЦЫ І-ГА ПАЎГОДДЗЯ 2013 г.
Падпісныя індэксы:
індывідуальная падпіска — 63875,
ведамасная падпіска — 638752.

Аб'ява*

Дворец Республики объявляет конкурс на замещение вакантных должностей в Президентский оркестр Республики Беларусь

артист эстрадно-симфонического оркестра: альт — 1 чел.; контрабас — 1 чел.; электрогитара — 1 чел.; валторна — 1 чел.; саксофон-тенор, сопрано — 1 чел.; ударные инструменты — ударная установка, перкуссия (на время отпуска по уходу за ребенком) — 1 чел.; а также требуется звукорежиссер с опытом работы — 1 чел.

Срок подачи заявок и документов — до 15.03.2013 г., по адресу: Октябрьская пл., д. 1, 220030, г. Минск.

К заявлению прилагать документы, предусмотренные Инструкцией о порядке проведения конкурса, утвержденной Министерством культуры Республики Беларусь от 22.01.2009 г. № 3;

Для резюме:
факс 229-91-84; e-mail — dirork@yandex.ru
Дополнительная информация — по телефонам: 229-90-50, 229-90-08, 229-90-04

Эканоміка культуры: тэрыторыя кааперацыі намаганняў

Па Міры ў "несезон"

Ізноў пра ўзаемастасункі Карэліч і Міра: як аб'яднаць намаганні з карысцю для абодвух бакоў

Завяршыць цыкл публікацый пра эканамічныя ды культурныя стасункі Міра і Карэліч мы планавалі сустрэчай з дырэктарам музея "Замкавы комплекс "Мір" Вольгай Папко. Яна, як кажуць, магла падсумаваць згаданае ў мінулых трох артыкулах, а таксама праявіць праз прызму ўласнага бачання тыя "болевыя кропкі", што замінаюць пэўным працэсам развіцця турыстычнай "інфраструктуры". У наступных жа матэрыялах — перайсці да сітуацыі з іншымі брэндамі краіны, да іх дзелавых кантактаў на "роднай тэрыторыі". Такім чынам, гаворка з Вольгай Мікалаеўнай была асноўнай мэтай маёй апошняй камандзіроўкі ў славутае мястэчка. Выезд спланаваў такім чынам, каб мець час на шпацыр па мірскіх вуліцах. Першае ўражанне ад гарадскога пасёлка: не сезон! У тым сэнсе, што мястэчка зноў жыве ў сваім звычайным рытме, непадобным на летні гармідар, калі турыстаў тут, часам здаецца, больш, чым мясцовых жыхароў. Згадаю самую свежую статыстыку: з моманту адкрыцця ў замку музея яго наведала 500 тысяч чалавек, а насельніцтва Міра — дзве з паловай. Па яе словах, дырэкцыя музея не бярэ грошай за экскурсіі гасцявых дэлегацый райвыканкама. Аднак выступленні мясцовых самадзейных артыстаў "з-пад крыла" аддзела культуры, калі імпрэза замоўлена замкам, аплачвае.

"Музей павінен займацца сваёй справай"

Пытаюся у Вольгі Мікалаеўны, як яна ставіцца да ідэі стварэння турыстычнага "Залатога кольца Беларусі", сегмент якога ахопліваў бы прастору ад Нясвіжа да Гродна з цэнтрам у Міры.

"Музей павінен займацца сваёй справай, — адказвае яна. — Лагічна, каб згаданую вамі ідэю распрацоўвалі эканамісты. Нам бы хоць сваё запланаванае зрабіць. А ў бліжэйшых планах маем адрадзіць прыгажосць паркаў Мірскага замка. Першы на чарзе — так званы Італьянскі сад. Ён, паводле нашых намераў, павінен быць такім, як пры Мікалаі Радзівіле "Сіротку". Потым займемся Пейзажным, або Англійскім, паркам, які ўзнік пры Святаполк-Мірскім. Паркі нададуць замкавану комплексу яшчэ большую прывабнасць. І, што істотна, наведвальнікам музея будзе дзе бавіць час, будзе дзеля чаго заставацца ў Міры пасля заканчэння экскурсіі па замку. Сёння тая экскурсія доўжыцца паўтары гадзіны. Яшчэ гадзіны дзве турыст шпацыруе па ваколіцах, потым снедае і з'язджае. Такім чынам, у Міры ён праводзіць палову дня. А калі адродзяцца паркі з іх дзівосамі, ён можа затрымацца на дзень, а мо і на два — з адпаведным для нас эканамічным эфектам".

Цікаўлюся, а ці будуць да паркавай эпапеі прыцягнуты кадры раёна, Карэліч і Міра, у прыватнасці.

"Праект распрацоўвае сталічная ўстанова "Мінскпраект", а рэалізацыяй яго зоймуцца спецыялісты "Белрэстаўрацыі". Гаворка ж ідзе не пра звычайнае азеляненне, а пра аднаўленне гістарычнага ландшафту. Тут патрэбен не проста чалавек з рыдлёўкай, а дасведчаная асоба. Праўда, праект зараз на такой стадыі, што казаць пра дэталі яго рэалізацыі зарана".

Далей Вольга Папко падкрэслівае: маўляў, калі тры гады таму ў музейнай гаспадарцы нават касы не было, дык сёння ў штаце Мірскага замка — інжэнер па садова-паркавым абуладкаванні, у падпрадкаванні якога — рабочыя "зялёнага будаўніцтва".

І тут размова наша выходзіць на кадравае пытанне…

Ізноў пра кадры…

Паводле слоў Вольгі Папко, у 2011 годзе, калі Мірскі замак атрымаў "незалежнасць" ад Нацыянальнага мастацкага музея, у яго штаце было 67 чалавек. Сёння ў штаце ўстановы "Музей "Замкавы комплекс "Мір" — 130 чалавек, і яшчэ не ўсе вакансіі заняты. Мірскаму замку, напрыклад, патрэбны тры інжынеры-праграмісты для абслугоўвання ўнікальнага абсталявання. Тэхналогія клімат-кантролю "Разумны дом" у Беларусі скарыстоўваецца, акрамя замка, толькі ў двух сталічных гатэлях. Прафесіяналаў высокага класа патрабуюць іншыя сістэмы ды камунікацыі. А дзе гэтых спецыялістаў узяць? Таго, хто мае запатрабаваную спецыяльнасць, цяжка прывабіць жыццём у вёсцы ці пасёлку гарадскога тыпу. А Мір — гэта, фактычна, вялікая вёска. Ды і кватэру тут знайсці немагчыма, у той час як службовага жытла ў замка няма.

Пытаюся, чаму Карэлічы не дапамогуць. Вольга Мікалаеўна згадвае, што ёй, быў час, прапаноўвалі жытло ў Карэлічах, але ездзіць кожны дзень на працу за 25 кіламетраў (адлегласць ад Карэліч да Міра) вельмі нязручна. Зрэшты, неяк абуладкавалася ў Міры.

Сённяшняя праблема кадраў для Міра, на яе думку, была "закладзена" яшчэ ў час рэстаўрацыі замка. Ужо тады трэба было пачынаць рыхтаваць спецыялістаў, якія прыйдуць працаваць у Замкавы комплекс "Мір". Як робіцца зараз, калі будуецца АЭС у Астраўцы: паралельна з будаўнічымі работамі рыхтуюцца кадры атамшчыкаў для працы на станцыі.

Развіваць напрацаванае

Апошняе маё пытанне ў нашай размове — перспектывы развіцця Мірскага комплексу. Дырэктар музея кажа, што стратэгію яна бачыць ва ўдасканаленні сённяшніх здабыткаў, сённяшніх пачынанняў. Усё, што мае дачыненне да Мірскага замка, павінна быць унікальным, непаўторным. Гэта датычыцца сувеніраў, друкаванай і відэапрадукцыі, стылю работы персаналу замка. Дзеля пошуку свайго, непаўторнага, аблічча мірскія музейшчыкі вывучаюць замежны досвед. У прыватнасці, вопыт расійскіх калег з Музейнага комплексу "Царскае Сяло" пад Пецярбургам, з якім падпісана дамова аб супрацоўніцтве.

Вольга Мікалаеўна з гонарам кажа пра прысвечаны Мірскаму замку відэафільм, да стварэння якога далучыліся многія супрацоўнікі музея. Стужка складаецца з трох частак. У адной з іх супрацоўнікі як акцёры іграюць саміх сябе і адначасова людзей, якія былі ў Міры ў мінулыя стагоддзі. Карціна — на шасці мовах: беларускай, рускай, англійскай, нямецкай, французскай, італьянскай. Рыхтуецца яе дубляж на кітайскую мову.

У музейнай краме дырэктар паказвае мне адмысловую кераміку, зробленую навучэнцамі Мірскага каледжа, элементы сярэднявечнай вопраткі, пашытыя ў мінскім каледжы, які рыхтуе спецыялістаў швейнай вытворчасці, копіі радзівілаўскага хрустальнага посуду, друкаваныя выданні пра Мір на розны густ і розную кішэню. Пры гэтым бядуе, што нават уласных супрацоўнікаў іншым разам бывае цяжка зацікавіць крэатыўнай ідэяй, выйсці за межы звыклага. Скажам, было праблемай угаварыць некаторых апрануцца ў сярэднявечныя строі для ўдзелу ў здымках таго самага рэкламна-асветніцкага відэа пра замак.

На развітанне Вольга Мікалаеўна падцвярджае, што зараз для турыстаў — не сезон. Гэта адчувае і замак, і мястэчка Мір. Таму ў гасцініцы свабодныя нумары і кавярня закрытая стаіць. Але супрацоўнікам музея і ёй асабіста працы ўсё адно хапае. Вось сёння былі тэлефанаванні з Мюнхена, з Пасольства Італіі ў Беларусі… Дарэчы, яшчэ ў кастрычніку музей прыняў столькі ж наведвальнікаў, як і ў ліпені. А сыдзе снег — ізноў пачнуцца гарачыя дні…

■■■

…Да аўтобуса заставалася яшчэ гадзіна. Я некалькі разоў абышоў па перыметры галоўную і адзіную плошчу Міра, названую ў гонар падзей 17 верасня 1939 года, зрабіў некалькі здымкаў "негламурнага" фармату. У "несезон" у Міры, як і паўсюль, відовішча сумнае. Падумалася: калі музей "Замкавы комплекс "Мір" разгорнецца настолькі, што захопіць у сваю сферу прылеглыя мясціны, надыдзе час штосьці прапанаваць вандроўнікам і ў халодную пару года. Цікава, а як бавілі час зімою Радзівілы? Ездзілі на санях па наваколлі? Палявалі? А можа, вандравалі па тых самых, актуальных сёння, "залатых кольцах", наведваючы Нясвіж, Навагрудак, Гродна? Уводзіны ў цяпершчыну мінулага — падстава ўбачыць будучыню. Хто не дае, скажам, у нашы дні для зімовых прагулак "з ветрыкам" коней у сані ўпрэгчы? Чаму ўжо не распачаць праект "Залатое кольца": Нясвіж, Мір, Навагрудак"?

Праўда, сіламі адных музейшчыкаў такі праект не зладзіш — тут спатрэбяцца рэсурсы раёна і вобласці. А на добрай справе яшчэ больш плённа паразумеюцца замак і Карэлічы. Урэшце, стварыць умовы для таго, каб турысты затрымаліся ў Міры і, шырэй, на Карэліччыне ды ў суседніх раёнах, падаецца, — справа гонару, прынамсі, для райвыканкама. Памятаеце, у адным з нумароў эканаміст райвыканкама згадала пра інвестпраекты акурат для турыстычнай інфраструктуры, што так і не знайшлі сваіх спонсараў. Чаму так адбылося? Не зацікавіліся бізнесмены? Або іх не зацікаўлівалі? А як бачыцца сітуацыя дэпутату ад Карэліччыны ў Палаце прадстаўнікоў?

Але пра гэта — у наступных нумарах. Не атрымліваецца завяршыць тэму. Будзе працяг…

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ

У двух апошніх нумарах "К" звярталася да тэмы міжраённай кааперацыі для эфектыўнага выкарыстання рэгіянальных брэндаў. Сёння мы працягваем серыю тэматычных публікацый на прыкладзе раёнаў Гродзеншчыны з трансляцыяй меркаванняў прадстаўнікоў Міністэрства спорту і турызму, Міністэрства транспарту і камунікацый, а таксама адказных асоб з абласной выканаўчай улады.

Дзяжурны па нумары

"Выкрыццё", што патрабуе "апраўданняў"

У працяг інтэрнэт-дыскусіі пра якасць адукацыі ў Акадэміі мастацтваў

Як запраграмаваць і запланаваць працэс з'яўлення яркіх, нешараговых творчых асоб? Гэтыя наіўныя і шмат у чым рытарычныя пытанні зрабіліся, між іншым, тэмай для шматлікіх дыскусій пасля таго, як у айчыннай інтэрнэт-прасторы з'явіліся журналісцкія "даследаванні", што "выкрывалі" непрафесіяналізм педагогаў Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Не прэтэндуючы на ролю абаронцы сваёй альма-матэр — ВНУ, у якой атрымала адукацыю, захацелася разабрацца ў саміх прычынах, што выклікалі такі ход думак, іншымі словамі — зразумець, дзе закапаныя карані прэтэнзій і да нашых творчых "кузняў кадраў", ды і да ўласнай прафесійнай нерэалізаванасці.

Памятаю, як пад час вучобы ў аспірантуры Акадэміі мастацтваў у рамках маёй педагагічнай практыкі студэнты-"навабранцы" любілі задаваць, як ім здавалася, правакацыйнае пытанне, што мусіла паставіць выкладчыка ў тупік: маўляў, навошта нам, будучым акцёрам, рэжысёрам ці мастакам, вывучаць, акрамя профільных, мноства такіх "непатрэбных" прадметаў, як гісторыя літаратуры, этыка, эстэтыка, паліталогія і г. д. Заўсёды адказвала: "Выключна дзеля таго, каб праз некалькі гадоў мець магчымасць сказаць, што вы — выпускнікі не прафтэхвучылішча, а людзі з вышэйшай адукацыяй". І да сёння застаюся перакананай, што галоўная задача любой ВНУ — даць сваім студэнтам базавы інтэлектуальна-практычны багаж, той "камплект ведаў", дзякуючы якому ён у сваім далейшым прафесійным жыцці зможа рэалізоўваць уласныя прафесійныя і творчыя амбіцыі.

Мне могуць адказаць, што гэткі пасыл добры для тэхнічных ВНУ, аднак зусім не падыходзіць да гуманітарных. Аднак на паверку такі падзел не вытрымлівае крытыкі. Найперш таму, што адукацыйная сістэма не здатная "змяніць" чалавека. Яе функцыі — аснасціць яго тым "прафесійным інструментарыем", дзякуючы якому ён сам у будучым зможа рэалізавацца як прафесіянал.

Зрэшты, варта адзначыць, што і Акадэмія мастацтваў таксама шмат у чым справакавала такое "спажывецкае" стаўленне да сябе. Найперш тым, што ў рэчышчы агульных тэндэнцый да пашырэння платнай адукацыі з элітарнай установы, дзе адзінымі крытэрыямі мусяць быць талент і творчы патэнцыял, ператварылася ў ВНУ, куды можна трапіць, маючы жаданне ды магчымасць заплаціць за навучанне. А гэткія грашова-рыначныя ўзаемаадносіны немінуча цягнуць за сабой і іншую сістэму ўзаемаадносін: маўляў, я грошы заплаціў, дык, калі ласка, выньце ды пакладзіце мне за гэта маю "творчую будучыню" ў якасці акцёра, рэжысёра ці мастака.

Вельмі добра памятаю свой першы год у рэдакцыі, куды я прыйшла адразу па заканчэнні Акадэміі. Выпускніца-выдатніца, я штотыдзень, працуючы над чарговым артыкулам, "здавала экзамены" — найперш самой сабе, уласным творчым амбіцыям: па тым, як акадэмічную тэорыю транскрыбіраваць у рэальную, практычную дзейнасць. І тыя прафесійныя "тройкі-двойкі", аб якія даводзілася раз-пораз спатыкацца, далі мне магчымасць са "спецыяліста з дыпломам аб вышэйшай адукацыі" з цягам часу перайсці ў лагер прафесіяналаў. І — марыць пра творчыя вышыні.

Дык чаму ж такая відавочная ісціна пра тое, што ніякая ўстанова ні за якія, нават самыя вялікія, грошы, не здольная выдаць "дыплом творцы" ды забяспечыць інтарэс да сябе як да цікавай, нешараговай і крэатыўнай асобы, нават сёння патрабуе "апраўданняў" ды тлумачэнняў? І ці не пара перастаць ужо шукаць "вінаватых" ва ўласнай няздатнасці, імкнучыся перакласці на чужыя плечы галоўны запавет творцы — працу над сабой?..

Таццяна КОМАНАВА

У час выязной рэдакцыі газеты "Культура" вядомы археолаг, доктар гістарычных навук Алена Калечыц звярнулася да журналістаў "К" з просьбай зноў акцэнтаваць увагу на праблемах, дакладней, "замарожаным стане" Юравіцкай стаянкі першабытнага чалавека. Мы абяцалі. І вось вынік той дамовы.
— А вы ведаеце, як нашы продкі палявалі на маманта? — пытае вядомы археолаг, доктар гістарычных навук Алена Калечыц. — У гэтых мясцінах былі гіганцкія валуны, і людзі заганялі жывёлін у своеасаблівыя пасткі. Маманты ламалі ногі і станавіліся лёгкай здабычай...
Навакольны антураж мала пасуе для такіх рэмінісцэнцый. Вонкава горад Калінкавічы нагадвае суцэльны спальны раён, і шукаць у ім нейкія сведчанні хоць якой даўніны — справа зусім марная. Таму ёсць, напэўна, нешта сімвалічнае ў тым, што найстарэйшы на беларускай зямлі помнік спадчыны першабытнага чалавека месціцца акурат пад бокам у гэтага цалкам сучаснага горада. Адсюль і опцыя для турыстаў: праязджаеш усяго якіх 20 кіламетраў у вёску Юравічы — і нібыта пераносішся на пару-тройку тысячагоддзяў назад!
Выраз "рэгіянальны брэнд" тут напрошваецца сам сабою, а пра патэнцыйны попыт на сувеніры з выявай маманта ўжо пісалі калегі ў матэрыялах выязной рэдакцыі па Гомельшчыне. На нядаўняй абласной спартакіядзе-конкурсе сярод дзяржслужачых (ёсць на Гомельшчыне такая цікавая традыцыя) калінкавіцкая "каманда" прадставіла свой край з дапамогай дасціпнага ды зухаватага нумара ў фармаце КВЗ. Завязка сюжэта наступная: супрацоўнікі адміністрацыі выдумляюць новыя спосабы прывабіць замежных гасцей у Юравічы. Маўляў, паляванне на маманта ды іншыя падобныя атракцыі ўжо настолькі прыеліся, што нікога імі не здзівіць, а турыстаў хацелася б бачыць не дзясяткі тысяч, а сотні...

Аб'ект на "ўзроўні шкілета". Але пакуль што не маманта...

"Вечная мерзлата" рэгіянальнага брэнда?

На жаль, пакуль гэта толькі мары: сёння ў Юравічах пра інтэрактыўны турэксклюзіў гутарка не вядзецца. Дый наўрад ці атрымаецца нават проста падняцца на той схіл, дзе ўпершыню на тэрыторыі Беларусі "адзначыўся" чалавек. Узімку бетонныя прыступкі, якія вядуць да археалагічнай адметнасці, пакрывае ці не паўметровы слой снегу…

І справа нават не ў браку руплівасці камунальнікаў. Справа ў тым, што ўнікальны, як мінімум па беларускіх мерках, аб'ект, што меўся быць здадзены напрыканцы мінулага года, нібыта захраснуў паміж небам ды зямлёю. Хаця праект яго музеефікацыі даўно гатовы, архітэктары належныя сродкі паспяхова асвоілі, ды і ладная частка будаўнічых работ ужо выканана!

А пакуль сам музей застаецца ў такім "палавінчатым" выглядзе, чысціць проста не будзе для каго. Ды і летняя кавярня, каркас якой ужо прадбачліва з'явіўся насупраць адметнасці, так і застанецца на "ўзроўні шкілета", ніколі не прыняўшы наведвальнікаў.

На жаль, гэты вобраз пакуль што застаецца "скразным" у дачыненні да ўсіх тых эфектных захадаў па турыстызацыі Юравічаў, пра якія мы ўжо пісалі неаднойчы. Не шчыруюць сёння будаўнікі і яшчэ на адной адметнасці вёскі — колішнім езуіцкім калегіуме, які 150 гадоў таму стаў праваслаўным манастыром і ўжо ў наш час адрадзіўся менавіта ў гэтай іпастасі. Тут сітуацыя тая ж самая: рэстаўрацыя былога касцёла пачалася ў добрым тэмпе і з уражальнымі вынікамі, ды... спынілася ў цяжкі для эканомікі пазамінулы год.

Сёй-той на гэты конт ужо паспеў прасякнуцца песімізмам. У сваю чаргу, начальнік аддзела культуры Калінкавіцкага райвыканкама Уладзімір Елісееў перакананы, што пераўтварэнне Юравічаў у турыстычны аазіс крыху адклалася, але... зусім ненадоўга.

— Увод абодвух аб'ектаў плануецца ўжо ў 2014-м, — распавёў ён. — На наступны год мяркуецца і асноўны аб'ём фінансавання. Зрэшты, у калегіуме работы павінны аднавіцца ўжо сёлета: з рэспубліканскага ды абласнога бюджэтаў на гэтыя мэты выдаткавана агулам каля пяці мільярдаў рублёў. Што да музеефікацыі археалагічнага аб'екта... Для яго завяршэння сродкаў патрабуецца менш. І таму мы спадзяёмся, што з імі затрымкі не будзе…

Падаецца, іншы варыянт развіцця падзей будзе, прынамсі, недарэчным — асабліва з увагі на сёлетні Год беражлівасці.

Перыяд пакуль не "засвоены"

Падобныя спадзевы мае і Алена Калечыц. Доўгі час яна разам з калегамі даследвала гэты помнік і таму можа шмат пра яго распавесці:

— Не так даўно галандскія навукоўцы пацвердзілі даціроўку гэтага аб'екта. Калі не лічыць нейкія адзінкавыя артэфакты, што не могуць стаць падмуркам для дакладных высноў, то больш даўніх сведчанняў пра сваю прысутнасць на тэрыторыі сучаснай Беларусі чалавек не пакінуў. Тут варта хіба ўдакладніць: хутчэй за ўсё, на тэрыторыі сучасных Юравічаў месціцца не стаянка першабытнага чалавека, а паляўнічы лагер. Менавіта таму было выяўлена вельмі шмат костак мамантаў (а таксама, зрэшты, і іншых жывёлін, кшталту аленя і насарога) ды параўнальна мала гаспадарчых прылад...

З цягам часу ў даследчыцы з'явілася заканамерная думка, што экскурс у далёкую мінуўшчыну цалкам можа мець праекцыю і на будучыню. Гадоў восем таму Алена Калечыц выступіла з прапановай старыць на месцы лагера археалагічны музей. Тагачасны старшыня аблвыканкама Аляксандр Якабсон ухваліў ідэю без ваганняў, і справа адразу зрушылася з мёртвай кропкі. Юравічам была наканавана асаблівая роля ў амбітным праекце "Залатое кольца Гомельшчыны".

Гэтаму населенаму пункту з неверагодна доўгай гісторыяй выпаў папраўдзе незайздросны лёс. У свой час буйное мястэчка было сапраўдным цэнтрам свайго рэгіёна, "выспачкай сярод палескіх балот", як пісалі ў адной дарэвалюцыйнай кнізе. Яно і не дзіва: галоўнымі транспартнымі ды гандлёвымі артэрыямі цягам доўгіх стагоддзяў былі рэкі, і ў прыватнасці — Прыпяць. Але тэхнічная рэвалюцыя канца XIX стагоддзя рэзка змяніла акцэнты на карысць невялічкай на той момант вёскі Калінкавічы, якая неспадзявана стала чыгуначным вузлом. І вось, у новым цэнтры сталі расці прадпрыемствы, а традыцыйныя саматужныя рамёствы Юравічаў пачалі занепадаць, насельніцтва — паступова скарачацца...

Ёсць спадзевы на тое, што спыніць гэты рух зможа менавіта той апошні мамант, якога забілі ды з'елі даўнія продкі цяперашніх вяскоўцаў. Спадзевы больш чым лагічныя: нічога падобнага да запланаванага музея айчынная турындустрыя не прапануе і блізка. Увогуле, той гістарычны (ці, дакладней, дагістарычны) перыяд, да якога ён апелюе, пакуль амаль не "засвоены". Гэта ж не якіясьці там "навабуды" кшталту замкаў альбо гатычных храмаў! І таму Гомельшчына, што не мае ніводнага з іх і таму займела рэпутацыю найбяднейшага на гісторыка-архітэктурныя адметнасці мінулага рэгіёна краіны, можа ўзяць сур'ёзны рэванш за кошт археалогіі... Як тут не прыгадаць ініцыятыву стварэння гісторыка-археалагічнага запаведніка на Рагачоўшчыне, пра што мы пісалі ў № 3 за 2013 г.

Зрэшты, на першых часах задума стварэння інавацыйнага музейнага аб'екта рэалізоўвалася ў тэмпе алегра. Упраўленне капітальнага будаўніцтва Калінкавіцкага раёна ўзялося за справу з імпэтам.

— Будаўніцтва было вельмі складаным: на вялікай вышыні, тэхніку не падгоніш, і таму рабочым даводзілася спраўляцца ўручную, — распавядае Алена Калечыц. — Мы ставілі перад сабой задачу захаваць рэшткі культурнага слою для наступных пакаленняў: а раптам яны здолеюць "выцягнуць" з яго тое, што сучаснай навуцы пакуль недаступна? І пад бетоннай "накрыўкай" гэты непадуладны нам пакуль матэрыял будзе захоўвацца столькі, колькі патрэбна…

Археолаг і навуковы кіраўнік новага музея недаўмявае, чаму работы спыніліся. Асабліва цяпер, калі столькі сродкаў ужо ўкладзена. І — шчыра спадзяецца на тое, што іх лагічны фінал усё ж не за гарамі, хаця стромкіх схілаў у ваколіцах Юравічаў нямала.

— І на адным з іх, дарэчы, яшчэ прыкладна ў дзясятым стагоддзі — ужо нашай эры, стаяў немалы па тагачасных мерках горад, — Алена Генадзьеўна плаўна пераходзіць праз эпохі гісторыі Юравічаў. — Гэта адно з найбуйнейшых гарадзішчаў таго перыяду на Беларусі. І, да таго ж, адтуль адкрываецца ашаламляльны спазор на даліну Прыпяці. Таму калі яго трохі добраўпарадкаваць, зрабіць там аглядную пляцоўку...

Барока — і нічога лішняга

Надзвычайная перавага Юравічаў заключаецца акурат у тым, што турыстычны пантэнцыял тут не канцэнтруецца толькі вакол аднаго аб'екта альбо эпохі. Яго можна плаўна рэалізоўваць і ўглыб, і ўшыркі, прымушаючы экскурсійны аўтобус "скакаць" праз стагоддзі — не раўнуючы, бы машыну часу. Наступным прыпынкам, натуральна, стане архітэктурная дамінанта былога мястэчка — і, адпаведна, першая палова XVIII стагоддзя.

Яшчэ зусім нядаўна колішні езуіцкі касцёл выклікаў такія самыя шчымлівыя пачуцці, як і яго велічныя ды занядбаныя "равеснікі" ў Селішчы, Смалянах, Лыскаве... Такіх сведчанняў еўрапейскага маштабу нашай культурнай спадчыны на Беларусі можна знайсці з добры тузін, і юравіцкі храм быў далёка не лепшы ў сваёй намінацыі паводле тэхнічнага стану. Скажам, у Княжыцах або Белай Царкве яшчэ сяк-так захаваліся скляпенні, а гэты храм прастаяў без даху ажно з вайны, штолета зарастаючы хмыззём, а штозіму напаўняючыся сумётамі…

Літаральна за некалькі гадоў рэстаўратары здолелі зрабіць тое, што многім падаецца проста неверагодным: ператварыць лядашчыя руіны ў жыццяздольны будынак. Адноўлены страчаныя аб'ёмы барочных вежаў і франтон, усталяваны купалы, якія, дарэчы, ужо паспелі трохі пакрыцца пацінай, з'явілася і вежачка-сігнатура, якую можна ўбачыць хіба на вельмі старых малюнках. І самае галоўнае — дах! Хаця работы і спыніліся, найгалоўны іх вынік быў дасягнуты: храму больш не пагражае небяспека. Між іншым, нават і сапраўдная керамічная дахоўка знайшлася менавіта ад айчынных вытворцаў!

Даўно заўважыў, што да Юравіцкай святыні на Гомельшчыне стаўленне асаблівае: маўляў, гэта ж сапраўднае *барока*! Апошняе слова вымаўляецца тут з асаблівым "прыдыханнем", і такую танальнасць можна лёгка зразумець. Жыхароў Гродзеншчыны альбо Віцебшчыны барочнымі абрысамі здзівіць куды складаней: у гэтых рэгіёнах шэдэўры стылю налічваюцца дзясяткамі. А вось Гомельшчына... Апрача Юравічаў, прыгадваюцца хіба яшчэ два храмы ў недалёкім адтуль Мазыры. І ўсё.

Натуральна, гэты "статус-кво" ніяк не змяніць: ад сучаснікаў ён не залежыць. Затое з нядаўняга часу вобласць мае іншую падставу для гонару: яна стала адзіным рэгіёнам краіны, дзе няма ніводнага занядбанага барочнага храма. Хаця службы ў юравіцкай царкве пакуль не ідуць, за яе лёс непакоіцца ўжо не выпадае.

Сапраўдная ўнікальнасць былога калегіума (прынамсі, у межах краіны) заключаецца менавіта ў тым, што ён захаваўся ў адноснай цэласнасці — уключна з мурамі ды невялічкімі вежамі, якія некалі мелі нават абарончае значэнне. Частка перыметру муроў была страчана — і ўжо часткова аднаўлена, за тыя лічаныя гады, калі ў Юравічах панаваў "рух"!

Карыстальнік аднаго інтэрнэт-форуму задаецца пытаннем: а што ж будзе з той буслянкай на адной з вежаў, якую даўно аблюбавалі фатографы? І тут жа змешчаны адказ: перанесці гняздо на нейкі суседні слуп няма ніякіх тэхнічных праблем. Па вяртанні з выраю буслы толькі ўзрадуюцца, атрымаўшы новую кватэру.

Новы статус для школьнага музея

Архітэктурных сведчанняў гісторыі Юравічаў наступных стагоддзяў, на жаль, не захавалася, але... Падарожжа не заканчваецца і на гэтым. Віруючы паміж незлічоных узгоркаў, тураўтобус, урэшце, апынаецца... ужо ў XXI стагоддзі. У тым папраўдзе гістарычным перыядзе, калі "збяднелая" з мястэчка вёска пераўтварылася ў аграгарадок, займеўшы ўвесь звыклы для гэтага статуса набор выгод. І нават больш: кавярню з гатэлем, што з'явіліся тут яўна з разлікам на будучых турыстаў — ды, як бачым, крыху "апярэдзілі падзеі". Але самы галоўны дадатак да "базавай" інфраструктуры аграгарадка — гэта менавіта музей. Яго памяшканням нават некаторыя рэспубліканскія ўстановы пазайздросцілі б, а экспанатам — і пагатоў!

— Турысты да нас рэгулярна завітваюць, у тым ліку і з-за мяжы, — распавядае дырэктар мясцовай школы Сяргей Блоцкі. — Вядома, мы іх ахвотна прымаем, я праводжу экскурсіі. Натуральна, выключна на энтузіязме: білеты ж сюды ніхто не прадае. Але мне, паверце, зусім не лянота...

У гэта ахвотна верыцца, але... Усё ж, падалося, гэты школьны музей заслугоўвае куды большага статуса. Ды, адпаведна, большых рэсурсаў — не толькі фінансавых, але і інтэлектуальных. Бо казаць пра тое, што шыкоўныя экспанаты сёння ўтвараюць цэласную экспазіцыю, на жаль, не выпадае. Але... Хіба здатны хоць які школьны музей запрасіць прафесійных мастакоў, стварыць належныя ўмовы захоўвання (а некаторыя косткі маманта ўжо пачынаюць трушчыцца), а потым і ўтрымліваць кваліфікаваны персанал?

— Безумоўна, гэты музей павінен увайсці ў адзіны турыстычны комплекс з лагерам першабытнага чалавека ды калегіумам, — мяркуе Алена Калечыц. — Але, вядома, у зусім іншым сваім увасабленні: з выразна аздобленай экспазіцыяй і актыўным выкарыстаннем мультымедыйных тэхналогій. Мы ўжо неаднаразова абмяркоўвалі дадзенае пытанне, наладзілася і супрацоўніцтва з выдатнай "камандай" маста-

коў. Як падаецца, ёсць усё, што патрэбна для таго, каб пераўвасобіць гэты музей. Апрача, самі ведаеце, фінансаў...

Натуральна, тут можа ўзнікнуць пытанне: а ці не зашмат будзе музеяў для адной вёскі? Алена Калечыц пераканана ў адваротным. І менавіта ў сваёй сукупнасці аб'екты Юравічаў утвараюць паўнавартасны турпрадукт, дзеля якога зацікаўлены падарожнік не палянуецца праехаць колькі соцень кіламетраў. Бензін каштуе нятанна, і калі ўражанні не здолеюць яго акупіць, інвестыцыі — дарэмныя.

— Не думаю, што на месцы лагера магчыма правесці нейкую паўнавартасную экскурсію, распавёўшы турыстам пра ўмовы жыцця першабытнага чалавека, — лічыць навуковы кіраўнік аб'екта. — Сам фізічны аб'ём гэтага не дазваляе, асабліва ў тых варунках, калі турыстаў будзе шмат. І таму я лічу, што туды яны павінны прыязджаць ужо інфармацыйна падрыхтаваны-

мі — пасля наведання школьнага музея. У ім трэба прадставіць не толькі першабытны перыяд: мінулае мястэчка ўтварае канцэпцыю экспазіцыі, насычанай рознымі сучаснымі метадалагічнымі прыёмамі. Мы прывезлі ў гэты музей адзіны на Беларусі рэканструяваны ўзор чалавечага жытла, зробленага з костак маманта. Але пакуль ён стаіць у разабраным выглядзе...

На думку Уладзіміра Елісеева, вырашэннем праблемы з'яўляецца перадача школьнага музея на баланс аддзела культуры.

— Ніякіх непаразуменняў на гэты конт у раёне няма, і калі прыйдзе час, застанецца толькі вырашыць разнастайныя юрыдычныя фармальнасці, — кажа начальнік аддзела культуры.

Натуральна, турысту няма ніякай справы да таго, на чыім балансе знаходзіцца той або іншы варты ўвагі аб'ект. Ды і ўвогуле, "вадападзел" паміж інстанцыямі тут так ці іначай мае быць выключна фармальным.

— Калі музей займее іншы якасны ўзровень, гэта паўплывае і на правядзенне школьных урокаў гісторыі, геаграфіі, біялогіі... — кажа Алена Калечыц. — Больш за тое: музей, павінен стаць цэнтрам адраджэння страчаных рамёстваў мястэчка. І хіба гэта можа адбыцца без чыннага ўдзелу настаўнікаў ды вучняў?..

У сённяшнім музеі ёсць папраўдзе шыкоўныя ўзоры вырабаў з лазы, якія ахвотна прыкупіў бы для сваіх інтэр'ераў сёй-той патрабавальны турыст. Запытаў у Сяргея Блоцкага, ці засталіся ў вёсцы тыя майстры, што памятаюць старыя традыцыі.

— Так, ёсць адзін чалавек, — адказаў той. — І калі ў яго з'явіцца матывацыя, ён, мяркую, здатны добра ўзяцца за справу, ды і іншых ёй навучыць...

■■■

На тле той цішы, што пануе сёння ў Юравічах, усе ідэі ўяўляюцца фантастыкай. Тым не менш, існуюць фактары, якія дазваляюць у іх верыць. І гэта перадусім энтузіязм тых людзей, з якімі давялося абмяркоўваць пытанне — і ў Юравічах, і ў Калінкавічах, і ў Гомелі, і ў Мінску.

У той самы час, ёсць і чыста аб'ектыўныя матывацыі. Без сумневу, "Залатое кольца Гомельшчыны" мае перспектыву менавіта ў сукупнасці сваіх "звёнаў": адметнасць "у чыстым полі" мае небагата шанцаў прыцягнуць увагу турыстаў. І вось, Юравічы становяцца адным з "кутніх камянёў" для цэлага канку-

І справа нават не ў браку руплівасці камунальнікаў. Справа ў тым, што ўнікальны, як мінімум па беларускіх мерках, аб'ект, што меўся быць здадзены напрыканцы мінулага года, нібыта захраснуў паміж небам ды зямлёю. Хаця праект яго музеефікацыі даўно гатовы, архітэктары належныя сродкі паспяхова асвоілі, ды і ладная частка будаўнічых работ ужо выканана! А пакуль сам музей застаецца ў такім "палавінчатым" выглядзе, чысціць проста не будзе для каго. Ды і летняя кавярня, каркас якой ужо прадбачліва з'явіўся насупраць адметнасці, так і застанецца на "ўзроўні шкілета", ніколі не прыняўшы наведвальнікаў.

рэнтаздольнага маршруту: побач — Мазыр, дзе, натуральна, ёсць на што паглядзець, а ў нейкай перспектыве, варта спадзявацца, і палац Горватаў у Нароўлі будзе не сорамна турыстам паказваць... Урэшце, гэтыя тры пункты злучае тая артэрыя, якая можа стаць сапраўднай "залатой жылай" для палескага турызму — судаходная рака Прыпяць, забяспечаная, дарэчы, ці не ўсёй патрэбнай для "круізаў" інфраструктурай.

Абмяркоўваем з начальнікам аддзела культуры тыя "тэхнічныя складанасці", што ўзнікнуць пры рэалізацыі задумы. Гутарка доўжыцца некалькі гадзін, бо і тэм для клопату зусім не бракуе. Патрэбны ж і руплівыя кадры — пры цяперашніх заробках тых жа музейшчыкаў, — і вырашэнне мноства юрыдычных момантаў. Але Уладзімір Елісееў цяжкасцей не баіцца.

— Не хвалюйцеся, крэатыўных ідэй у нас не бракуе, і мы забяспечым турыста не толькі паляваннем на маманта, але і... нешта яшчэ прыдумаем! — запэўніў ён. — Галоўнае, каб да гэтага дайшла справа, і лёс юравіцкіх цікавостак быў вырашаны…

Ілья СВІРЫН,
наш спецыяльны карэспандэнт
Мінск — Калінкавіцкі раён — Мінск

Дзве рэплікі крытыкаў пасля аднаго канцэрта

Гастрольныя "нажніцы"

Гастролямі апошнім часам нас не здзівіш. У тым ліку — балетнымі. І якой бы якасці яны ні былі, радавацца можна заўсёды. Бо вучыцца лепш на чужых памылках, а не на ўласных. У выпадку ж станоўчага прыкладу — ёсць што пераймаць. Менавіта з гэтага пункта гледжання паспрабуем ацаніць нядаўні прыезд Санкт-Пецярбургскага тэатра імя Л.Якабсона з трыма спектаклямі і сольны вечар "Трыумф танца" народнага артыста Расіі Фаруха Рузіматава.

"Гасцявыя": аншлагі ці праблемы?

Тэатр, заснаваны Леанідам Якабсонам, шмат увагі, вядома, надае папулярызацыі яго творчай спадчыны. Калі мініяцюры, што складаюць аднаактовы балет "Радэн", былі ў рэпертуары пастаянна, дык "Клоп" адноўлены зусім нядаўна. І тое, з якой любоўю гэта зроблена, наводзіць на развагі пра стаўленне да нашай нацыянальнай спадчыны. Якабсон працаваў у час панавання драмбалета (ці харэадрамы), калі ад танцавальнага мастацтва патрабавалі сюжэтнага пераказу, у тым ліку з дапамогай зразумелых жэстаў. Сёння ў пастаноўках гэты "стылёвы почырк часу" добра адчувальны, але невыпадкова яго работы можна лічыць адной з вяршынь гэтага зусім не бясспрэчнага кірунку, бо ў іх адразу чытаецца індывідуальнасць Майстра. Міжволі ўзнікаюць паралелі: ці ж з такой павагай мы ставімся да сусветна прызнаных пастановак нашага Валянціна Елізар'ева? Нават тыя, што яшчэ афіцыйна застаюцца ў рэпертуары, ідуць усё радзей, назіраецца і тэндэнцыя іх замены тымі ж найменнямі, але з іншай харэаграфіяй. Можа, наўмысна ўсё робіцца дзеля таго, каб іх давялося "аднаўляць", што называецца, "з нуля", і тады назваць усё гэта творчым подзвігам — як той жа расійскі праект "Рускія сезоны XXI стагоддзя", што ўсё больш ахоплівае беларускую прастору?

Сакцэнтаваў тэатр Якабсона і іншыя ўласцівыя нашаму балету праблемы. Адна з іх — асоба танцоўшчыка. Сыходзяць артысты, на якіх ставіліся спектаклі ды мініяцюры, і творы шмат страчваюць. А між тым, класіка (не толькі ў харэаграфіі, але і ў музыцы, дзе гэта яшчэ больш відавочна) трымаецца на далейшым удасканаленні былых выкананняў. І галоўную ролю ў гэтым працэсе адыгрывае індывідуальнасць, непаўторнасць артыста. У нашых гасцей, пры моцным кардэбалеце, не знайшлося такой Адэты/Адыліі, якая вылучалася б сярод астатніх лебедзяў. Гонар, канешне ж, узяў за нашых салістаў. Але ж ці маюць яны ў нас такую пашану, як госці? І ці ставіцца ў нас апошнім часам штосьці ў разліку на іх магчымасці?

"Нажніцы" паміж асобай артыста і ягоным рэпертуарам рэзалі вока на вечары Ф.Рузіматава. Акрамя дзвюх мініяцюр М.Бежара, ледзь не ўсё астатняе было пастаўлена Мікалаем Андросавым, вядомым у нас па рэжысуры і харэаграфіі "Блакітнай камеі" ў Музычным тэатры. Схільнасць да эстрадных нумароў, разлічаных, даруйце, на "рэстаранныя" густы публікі, кампілятыўныя "перабіранні" класікі, агульныя формы руху, уключаючы звычайнае хаджэнне па сцэне, — усё гэта вельмі далёкае ад мастацтва. А "прадаецца" — як нейкі эксклюзіў. І, што самае дзіўнае, — купляецца! Нягледзячы на астранамічны кошт білетаў. Таму, што было раскручана на тэлебачанні ды ў Сеціве? Ці таму, што замежнае, або, дакладней, "не сваё"? Узгадаю, што ў XIX стагоддзі беларускія спевакі, здаралася, выдавалі сябе за італьянцаў, маючы ашаламляльны поспех у тутэйшай публікі, вялікія ганарары і далейшыя судовыя разборы. Відаць, перакананасць у тым, што замежнае — лепш, засталося ў нас яшчэ з тых часоў?

А вось практыку сольных вечароў, надзвычай у нас рэдкую, ды паказ харэаграфічных мініяцюр, асабліва складзеных у цыкл, можна было б і "пераняць". Дакладней, аднавіць. "Клоп", да ўсяго, вымусіў задумацца пра пашырэнне нашага балетнага рэпертуару не адно трагедыямі. Усё ж разам прывяло да развагі: можа, нам наўмысна прывозяць сумніўныя харэаграфічныя здабыткі, каб на такім фоне ярчэйшымі былі нашы? Маўляў, чаго вы хочаце ад цяперашніх беларускіх харэографаў, калі і ў іншых — праблемы? Але дастаткова ўключыць тэлеканал "Mezzo", каб зразумець сапраўдныя, а не ўяўныя мастацкія прыярытэты…

Надзея БУНЦЭВІЧ

Найноўшы этап у гісторыі Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Беларусі, несумненна, пачаўся ў 2009 годзе, калі адбылося аб'яднанне опернай і балетнай труп ды іх вяртанне ва ўласны будынак пасля рэканструкцыі. Адна са станоўчых рыс гэтага перыяду звязана са значным пашырэннем міжнароднай актыўнасці тэатра. Новае кіраўніцтва арганізавала Маладзёжны форум опернага мастацтва краін СНД, Балтыі і Грузіі, тройчы — Мінскі міжнародны Калядны оперны форум (у рамках апошняга адбыўся фінал Міжнароднага конкурсу спевакоў, выканаўцаў італьянскай оперы "Competizione dell'Opera"). Але заўважце: усе названыя мерапрыемствы — оперныя.

"Сэканд-хэнд" з неадпаведнасцю

А як жа балет? На першы погляд, апошнія гады сталі сапраўдным прарывам. Пасля пэўнай ізаляцыі ў Мінск з зайдроснай рэгулярнасцю пачалі наведвацца гастралёры. Але не будзем упадаць у эйфарыю. За апошнія гады мы ўбачылі адзінкавыя "свежыя" пастаноўкі, якія можна лічыць мастацкімі адкрыццямі. У першую чаргу гэта "Анна Карэніна" (2005 г.) і "Чайка" (2007 г.) Барыса Эйфмана, а таксама асобныя пастаноўкі Тбіліскага тэатра оперы і балета. Па-свойму арыгінальнымі, хоць і спрэчнымі, выглядалі "Шчаўкунок" і "Дождж" (абедзве — 2007 г.) Раду Паклітару.

Што да астатняй харэаграфіі… Балет "Мара" Нацыянальнай танцавальнай кампаніі Уэльса больш нагадваў прадукцыю правінцыйнай трупы. "Кармэн-сюіта" ў харэаграфіі Алонса, што была паказана ў рамках Фестывалю Юрыя Башмета, падалася "зборнай" камандай выканаўцаў. Яшчэ былі "Сем прыгажунь" Азербайджанскага тэатра оперы і балета, "Клоп" і "Радэн" Санкт-Пецярбургскага тэатра імя Леаніда Якабсона… Спектаклі, прадстаўленыя ў рамках праекта "Рускія сезоны XXI стагоддзя", часам выглядалі як… запыленыя музейныя экспанаты. Згаданыя пастаноўкі з "Сезонаў…", юбілейны вечар Андрыса Ліепы, а таксама сольны канцэрт Фаруха Рузіматава, што адбыўся ў мінулую суботу ў Нацыянальным тэатры оперы і балета, нагадвалі яшчэ і спробу зарабіць немаленькія грошы на сапраўды зорных выканаўцах, чый росквіт прыйшоўся на мінулыя гады.

Як ні круці, а ёсць тут неадпаведнасць паміж чароўнай аўрай, легендай, што ўзнікла вакол імёнаў іх стваральнікаў (кампазітараў, харэографаў, выканаўцаў) і рэальнасцю. А яшчэ засмучае стаўленне да публікі. Няўжо нас лічаць тымі, каму можна прадаць балетны "сэканд-хэнд"?

Чаму б не запрасіць на гастролі калектывы, што знаходзяцца ў авангардзе сучаснага мастацкага працэсу? Напрыклад, маскоўскі Музычны тэатр імя Станіслаўскага і Неміровіча-Данчанкі або санкт-пецярбургскі Міхайлаўскі тэатр. Няўжо творчыя вечары ва ўласным тэатры не заслужылі айчынныя салісты? Напрыклад, чым Канстанцін Кузняцоў і Юлія Дзятко ці Вольга Гайко і Дзяніс Клімук горшыя за Андрыса Ліепу, які мае вельмі ўскоснае дачыненне да Беларусі?

Мяркую, кіраўніцтва тэатра, што робіць вельмі шмат для развіцця айчыннага опернага мастацтва, можа змяніць сітуацыю і ў балетнай сферы.

Дзяніс МАРЦІНОВІЧ

Паважаныя чытачы! Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах сённяшняга нумара. **Пішыце** на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77 або на электронную скрыню kultura@tut.by, **тэлефануйце** ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97, **абмяркоўвайце** тэму на www.facebook.com/kimpressby, www.twitter.com/kultura_by!

7 лютага ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі прайшоў Кірмаш інвестыцыйных праектаў. Мерапрыемства ладзілася ў рамках XX Мінскай міжнароднай выстаўкі-кірмашу "Кнігі Беларусі". Як кажа намеснік дырэктара НББ па навуковай рабоце і выдавецкай дзейнасці Алесь СУША, мерапрыемства ўпершыню праводзілася ў такім фармаце. Цягам двух папярэдніх гадоў прэзентавалася некалькі рэалізаваных ужо праектаў, а таксама анансаваўся рэестр кніжных помнікаў, найбольш важных для айчыннай культуры, якія варта альбо вярнуць з-за мяжы на Беларусь, альбо факсімільна аднавіць. Задзел за гэты час зроблены неблагі (НББ па выніках мінулага года ўзнагароджана спецыяльнай прэміяй Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь дзеячам культуры і мастацтва). Кірмаш — працяг работы з інвестарамі для рэалізацыі самых розных "кніжных" праектаў.

Нататкі да падзеі...

Ідэі ёсць. Інвестары пад кнігі — таксама?

Чаму бібліятэкары з райцэнтраў не спяшаюцца "прадаваць" крэатыў?

Факсімільна-электронны вынік

Апрача прэзентацыйных дзей, працавала на кірмашы і кніжная выстаўка, дзе на стэндзе НББ, акрамя факсімільных выданняў (вынік рэалізаваных праектаў), былі прадстаўлены старадрукі, рэдкія сучасныя кнігі, а таксама варыянты будучых праектаў як "прынада" для інвестараў.

Што ўжо зроблена? Пра кожны з рэалізаваных праектаў "К" пісала, таму вынік пазначым пункцірна. Калі ў 2009-м выйшла толькі адна факсімільная кніга (працягвалася праца і над Слуцкім Евангеллем, выдадзеным праз час разам з Экзархатам), дык летась такіх праектаў было ажно сем. Нешта бібліятэка зрабіла сама, нешта — з партнёрамі. Дзяржаўна-прыватныя стасункі аказаліся досыць эфектыўнымі...

А яшчэ былі праекты па вяртанні рэдкіх і каштоўных кніг з-за мяжы ці ад прыватнікаў-калекцыянераў. За мінулы год такіх выданняў набралася каля 850. Варта дадаць, што існуюць і альтэрнатыўныя варыянты вяртання. Замежныя дзяржаўныя кніжныя зборы арыгіналы аддаюць (у тым ліку і на часовае захаванне), мякка кажучы, без ахвоты. Тады на радзіму "едуць" лічбавыя копіі. Менавіта так да нас трапілі летась выданні Скарыны...

Слова — за партнёрам

На інвестыцыйны кірмаш меркавалася запрасіць партнёраў. І не толькі прадстаўнікоў пасольстваў. А партнёры ў НББ, па словах Алеся Сушы, — самыя разнастайныя: выдавецтва "Мастацкая літаратура", Расійская дзяржаўная бібліятэка, украінскія бібліятэчныя ўстановы. А таксама — выдаўцы, банкаўскія структуры, недзяржаўныя арганізацыі самага шырокага профілю (да прыкладу, кампаніі па продажы капіравальнай тэхнікі), грамадскія арганізацыі (Беларускі фонд культуры).

Словам, бізнес-асяродак з Беларусі, Украіны, Расіі. Гэткія ж і спосабы ўзаемадзеяння: нешта з праектаў Нацыянальная бібліятэка Беларусі рэалізуе за інвестарскія грошы, нешта — у выніку, так бы мовіць, узаемавыгаднага бартару.

А што прапануюць раёны?

З нашай Нацыянальнай бібліятэкай усё зразумела. Было б дзіўна, каб вядучая "кніжная ўстанова" не ўраджвала стракатасцю задумак і не здзіўляла эфектыўнасцю іх ажыццяўлення. А наколькі выніковым з'яўляецца дыялог паміж абласнымі, раённымі бібліятэчнымі ўстановамі і патэнцыйнымі інвестарамі? Алесь Суша перакананы, што існуюць усе падставы для таго, каб такі дыялог ужо цяпер прыносіў плён. У тым ліку і на раённым узроўні. Прыватныя структуры, маўляў, даўно саспелі да ўсебаковай падтрымкі культурных ініцыятыў. Іншая справа, што бібліятэкары з райцэнтраў пакуль не спяшаюцца прадаваць уласныя крэатыўныя ідэі. Якія? Спіс можна доўжыць бясконца. Да прыкладу, выданне ёмістых краязнаўчых мультымедыйных матэрыялаў — не на адну-дзве тэкставыя старонкі з невыразнымі здымкамі, а такіх, якія можна будзе выдаваць за аплату напракат самаму шырокаму колу чытачоў. Хто бачыў бібліятэчныя выданні пра лёс і творчасць Язэпа Драздовіча? У Глыбокім і Шаркаўшчыне — процьма матэрыялу для такога падарункавага альбома. А ў Капылі — пра Цішку Гартнага... У Вялікай Бераставіцы бібліятэкары і па сёння нясмела распавядаюць, што тут, ёсць меркаванне, Кастусь Каліноўскі друкаваў асобныя нумары "Мужыцкай праўды"... Словам, падстаў для неадкладнага завязвання стасункаў са спонсарамі хапае.

Вобласці апярэджваюць

Так, у раёнах абмяжоўваюцца збольшага выданнем брашур з творамі мясцовых самадзейных літаратараў. Прадукт, даруйце, для вельмі абмежаванага і ўнутранага спажывання. Як распавядае Алесь Суша, у абласных бібліятэках пакуль больш прыкладаў сапраўды дзейснага ўзаемадзеяння з партнёрамі. У выніку пабачылі свет "Берасцейскія кнігазборы". Брэсцкая абласная бібліятэка і НББ ініцыявалі разам праекты, звязаныя з ушанаваннем Брэсцкай бібліі, якой спаўняецца 450 гадоў, і яе факсімільным ці электронным выданнем...

Сярод дадатных прыкладаў праектнай актыўнасці раёнаў Алесь Суша назваў метадычнае супрацоўніцтва НББ з Навагрудскай раённай бібліятэкай менавіта ў рэчышчы выдавецкага праектавання. Яно прадугледжвае і прыцягненне інвестыцый ды рэкламную раскрутку прыватных камерцыйных структур. Апошнія ўсё часцей звяртаюць увагу на акцыі культурнага зместу. Інакш кажучы, быць сацыяльна адказным становіцца модным. Попыт "праклёўваецца", а прапаноў пакуль — недаравальна мала…

Яўген РАГІН

На здымку: пад час кніжнага кірмашу ў "БелЭКСПА". Фота Юрыя ІВАНОВА

... і пасля

Далей — справа за маркетолагамі

Імправізаваны кірмаш інвестыцыйных праектаў Нацыянальнай бібліятэкі, які прайшоў у сценах "БелЭКСПА", выклікаў досыць вялікую цікавасць з боку наведвальнікаў. Што і казаць, каля Нацыянальнага стэнда Беларусі нават стварыўся "корак" з ахвотных пазнаёміцца з цікавымі праектамі НББ.

Адразу падумалася, што асноўную аўдыторыю "слухачоў" складуць менавіта тыя, хто зацікаўлены найперш у інвестыцыйных праектах — прадстаўнікі абласных і раённых бібліятэк. Аднак, як аказалася, вылавіць "захавальнікаў друкаванага слова" з рэгіёнаў стала задачай даволі складанай. Нешматлікія прадстаўнікі бібліятэк імгненна разбегліся па выставачных стэндах у пошуку кніжных рэлізаў .

Пры гэтым Кірмаш інвестыцыйных праектаў апрыёры разглядаўся як добрая магчымасць для кіраўнікоў рэгіянальных бібліятэк пазнаёміцца з патэнцыйным спонсарам, няхай сабе і адным, а калі больш канкрэтна — кіраўніком Апякунскага савета Нацыянальнай бібліятэкі, старшынёй Праўлення прадстаўніцтва "XEROX" у Беларусі Аляксандрам Швецам. Апошні пацвердзіў зацікаўленасць у далейшай падтрымцы шэрагу асветніцкіх праектаў, у першую чаргу — скіраваных на вяртанне рарытэтных кніг на радзіму.

Як адзначыў бізнесмен, сумесна з кіраўніцтвам Нацыянальнай бібліятэкі летась быў вызначаны яшчэ адзін прыярытэтны кірунак супольнай працы. На думку Аляксандра Швеца, сёння надзвычай актуальна пазнаёміць максімальную колькасць нашых суайчыннікаў з беларускай кніжнай спадчынай. А таму ў гэтай справе важна не проста перавыдаць рарытэт, але і зрабіць яго якасны пераклад, а таксама падрыхтаваць навуковыя каментарыі. Па словах кіраўніка Апякунскага савета, сёлета плануецца вярнуць такім чынам далёка не адно знакавае для нашага народа выданне.

Думаецца, шэраг праектаў з разлікам на прыцягненне спонсарскіх сродкаў на выданне факсіміле найбольш запатрабаваных кніг маецца і ў рэгіянальных бібліятэках. Балазе славутых землякоў, працы якіх сёння раскіданы па свеце, не так ужо і мала. А таму далейшы працяг падобных кірмашоў інвестыцыйных праектаў бачыцца ў трохі іншай форме — дыялога, пад час якога ўсе зацікаўленыя бакі змогуць дасягнуць паразумення і выгоды.

І ўсё ж, нягледзячы на ўсе формы, галоўны фактар поспеху — актыўнасць ды жывая зацікаўленасць бібліятэкараў і выдаўцоў у рэалізацыі амбітных праектаў. А якая актыўнасць, калі на такім карысным ва ўсіх адносінах мерапрыемстве Нацыянальнай бібліятэкі не прысутнічалі маркетолагі, прынамсі, абласных бібліятэк? Спадзяёмся, што ў апошнія дні працы сёлетняй Кніжнай выстаўкі-кірмашу айчынныя бібліятэкары, няхай сабе і ў рамках іншых праектаў, усё ж змогуць абмяняцца цікавымі ідэямі, а плён іхняй дзейнасці не прымусіць сябе чакаць…

К.А.

На здымках: выступае Аляксандр Швец пад час кірмашу інвестыцыйных праектаў. Фота Юрыя ІВАНОВА

Цягам апошніх некалькіх дзён інтэрнэт-прастора літаральна "ўзарвалася" ад незвычайнага факта: у адным з касцёлаў была адшукана ўнікальная трохметровая карціна пэндзля знакамітага мастака, прафесара жывапісу Яна Кшыштафа Дамеля, дарэчы, аднаго з герояў рубрыкі нашай газеты "Вяртанне імёнаў".

Знайсці ўнікальнае палатно? У Беларусі — не складана!

Палатно захоўвалася ў вёсцы Вішнева Смаргонскага раёна, а знайшоў яго вернік гомельскага касцёла Анатоль Шчучко.

— Вішнева — мая малая радзіма, і я пастаянна наведваў мясцовы касцёл, дзе заўсёды бачыў гэтую карціну, — падзяліўся ён сваімі ўспамінамі з карэспандэнтам "К". — Палатно знаходзілася ў далёкім куце, цалкам пацямнелае, ніхто ўжо не ведаў, адкуль яно тут узялося. Але, вывучаючы архіўныя дакументы, я даведаўся пра сапраўдную яго гісторыю. Аказалася, палатно, якое мае назву "Святы Язэп з Дзіцяткам Ісусам", напісаў у 1811 годзе менавіта Ян Дамель.

Як даведаўся Анатоль Шчучко, у касцёле на пачатку XIX стагоддзя знаходзілася яшчэ адна карціна знакамітага мастака: выява святога Тадэвуша. Але у Першую сусветную вайну гэтая карціна загінула разам з драўляным храмам, пабудаваным побач з касцёлам.

Адшуканы абраз пасля Першай сусветнай доўгі час заставаўся ў будынку колішняга касцёла. А цяпер унікальную карціну Яна Дамеля Анатоль Шчучко адвёз у Гомельскі палацава-паркавы ансамбль на рэстаўрацыю.

Займаецца абразам прафесійны мастак, рэстаўратар музейнай установы Яўгенія Фей.

— На сённяшні дзень мы зрабілі галоўную работу: адчысцілі карціну ад бруду, — паведаміла "К" супрацоўніца музея. — Цяпер будзем выдаляць аўтарскі лак, бо з-за перападу тэмператур і дрэнных умоў захоўвання шматлікіх дэталей на палатне наогул цяпер не відаць. Завяршыць усе рэстаўрацыйныя работы плануем ужо ў маі…

Менавіта тады, напрыканцы вясны, у Гомельскім палацава-паркавым ансамблі плануецца прэзентаваць карціну Яна Дамеля для шырокага кола гледачоў. А ўжо потым унікальнае палатно адправіцца назад у вясковы касцёл і зойме там пачэснае месца над галоўным алтаром.

Унікальнасць гэтай знаходкі, як распавёў Анатоль Шчучко, яшчэ ў тым, што работы Яна Дамеля захоўваюцца, у асноўным, у нацыянальных мастацкіх музеях Літвы і Польшчы. Таму можна прадказаць, што пасля перавозкі адрэстаўраванай карціны ў касцёл у Вішневе гэтае паселішча Гродзешчыны будуць вельмі часта наведваць як айчынныя, так і замежныя турысты…

Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Палескі драматычны тэатр у Пінску

У Палескім драматычным тэатры пасля працяглага перапынку з'явіўся новы дырэктар — Аляксандр Мікалаевіч Лукашэнка, вядомы па працы ў Пінскім гарвыканкаме. І гэтая навіна стала падставай для нашага больш пільнага позірку ў бок тэатральнага Палесся ды, шырэй, жыцця несталічных тэатраў. І нават не абласных. Тым больш, што і размова можа ісці зусім не "беспрадметная": адразу пасля навагодніх святаў малады рэжысёр тэатра Павел Марыніч, які ў свой час выказваў на старонках "К" меркаванні наконт Другой Нацыянальнай тэатральнай прэміі, даслаў нам відэазапісы некалькіх сваіх спектакляў. Сярод іх — дзве нядаўнія нацыянальныя прэм'еры: летась у чэрвені тэатр паставіў "Раскіданае гняздо" Я.Купалы, у апошнія дні кастрычніка — "Чорную панну Нясвіжа" А.Дударава. Цяпер там будзе аднаўляцца пасля гэўнага перапынку дыпломная рэжысёрская работа Паўла Марыніча — вострасацыяльная драма "Я хачу дамоў" Л.Разумоўскай, разлічаная найперш на маладзёжную аўдыторыю. І хаця ніякі відэазапіс не дае поўнага ўяўлення пра жывое тэатральнае мастацтва, казаць ёсць пра што: і пра згаданыя спектаклі, і пра тыя праблемы, што стаяць перад тэатрам, і пра магчымасці "маленькіх" тэатраў у невялікіх (хоць Пінск і не такі ўжо "невялікі"!) гарадах.

Як без "прома" — невядома...

Як знайсці шляхі для "выхадаў у свет" і "погляду збоку" невялікаму тэатру?

Візітоўка-2012

"Візітоўкай" Палескага тэатра спрадвеку прызнана "Пінская шляхта". Не так даўно перад будынкам тэатра з'явіліся нават скульптурныя выявы герояў гэтай п'есы В.Дуніна-Марцінкевіча. Але ж "візітоўкай" 2012-га сталася "Раскіданае гняздо" Я.Купалы. Гэта разумеюць і ў самім тэатры: невыпадова гэты спектакль вылучаўся на Нацыянальную прэмію (але не прайшоў адбор, таму ў сталіцы не паказваўся), а рэжысура Паўла Марыніча была прызнана тэатрам лепшай працай года. І ёсць за што!

П'еса Я.Купалы была кардынальна перапрацавана, пяць дзей укладзены ў дзве. Данілка, які майструе скрыпачку, "ператварыўся" ў значна пасталеўшую Аленку: ну не хапае ў трупе хлопцаў, няма і артыстак травесці, таму некаторыя хлапчуковыя ролі даводзіцца "перапісваць" (так атрымалася, дарэчы, і з п'есай Л.Разумоўскай, дзе двое падлеткаў сталі дзяўчынкамі). Але ўсё гэта — толькі знешнія змены. Галоўнае — прынцыпова іншым для гэтай п'есы стала ўласна відовішча. Многія падзеі, вынесеныя аўтарам "за сцэну" і пададзеныя праз аповед іншых персанажаў, былі візуалізаваны. Спектакль, які традыцыйна ўспрымаецца адно як бясконцыя размовы, атрымаў яркія пластычныя ўкрапванні (ці моманты паралельнага дзеяння), прысвечаныя псіхалагічнаму стану герояў. Тут і гісторыя кахання Зоські (надзвычай адораная і перспектыўная Юлія Брылёва) да Паніча, вырашаная размеркаванай у часе танцавальнай сюітай, і разгорнутыя "тлумачэнні" (не словамі, а рухамі) таго, якія душэўныя мукі падштурхнулі Лявона да самагубства, Зоську — да яго няўдалай спробы. Гэта робіць спектакль больш відовішчнай дзеяй, а назіраннем за "гаворачымі галовамі".

Але і гэта не самае важнае. Яшчэ больш значнай адметнасцю спектакля становіцца "перачытанне" Я.Купалы скрозь прызму не адно рэалізму, але і сімвалізму, уласціваму творчасці паэта, а таксама — папраўдзе "выбуховага" экспрэсіянізму (апошнюю рысу ў купалаўскіх тэкстах звычайна не заўважаюць, у лепшым выпадку ператвараючы ў "плакатную" публіцыстычнасць). Цэнтральным становіцца пераасэнсаваны вобраз… гогалеўскай "птушкі-тройкі", дзе замест імклівых коней, што нібыта ляцяць у паветры, — запрэжаныя сяляне, а паганяты — Паніч, які становіцца абагульненым сімвалам няволі. Вядома, асобныя прыёмы "падгледзены" рэжысёрам у замежных калег, штосьці можна лічыць "паралельнымі знаходкамі". Але адсутнасць "кінутых" на паўдарозе ідэй і тое, як "да месца", з добрым густам, асэнсаваннем і далейшым развіццём выкарыстана кожная дэталь, сведчыць пра высокапрафесійны падыход і робіць спектакль зусім не шараговай з'явай. Так што пінчанам у гэтым сэнсе можна шчыра пазайздросціць — і паспачуваць сталічным тэатралам, у якіх менш магчымасцей убачыць пастаноўку.

Адзначым і на дзіва стыльнае, гарманічнае суіснаванне ў "Раскіданым гняздзе" работ мастака Алены Гаўрыловіч і вядомага беларускага кампазітара Алега Хадоскі. "Разыначкай" сцэнаграфіі і сцэнічных строяў успрымаецца зварот да такога прыёму народнага ткацтва і вышыўкі, як сеціва — чаргаванне пасмаў нітак ці тонкіх палосак тканіны з "дзіркамі"-праёмамі. У вобразнай палітры спектакля такія спляценні-скрыжаванні ўзбагачаюцца шэрагам асацыяцый: ад фальклорных павеваў да турэмных кратаў і "палаватага" жыцця. Праз элементы "жаночага рукадзелля" акцэнтуецца ў спектаклі і тэма жаночай долі, і адчуванне самой Беларусі як "матчынай старонкі".

Музыка ж увогуле надае дзеі агульначалавечы разгорт. Звыклы "плач цымбалаў" хіба папярэджвае дзеянне. Далей жа невялікія стылізаваныя моманты зрэдку разраджаюць насычанае сімфанічнае палатно са сцішанымі харавымі астраўкамі, прасякнутымі ўзвышанай харальнасцю. Высакароднасць музыкі, яе "далучанасць" да еўрапейскай музычнай прасторы значна пашыраюць саму аўру спектакля, быццам пасоўваюць межы сцэны (а яна ў Палескім тэатры папраўдзе маленечкая, разгарнуцца няма дзе).

Імкненне да асаблівага "амузычвання" спектакляў увогуле можа лічыцца асаблівасцю творчага почырку Паўла Марыніча. Хтосьці, праўда, можа паставіць гэта рэжысёру ў віну: маўляў, несучасна, спектакль можа абысціся двума-трыма камп'ютарнымі "матыўчыкамі" — для стварэння фону. Але пастаноўшчык упарта працягвае традыцыі жанру меладрамы ў яе першасным сэнсе — дэкламацыі на фоне музыкі. Гэта, да ўсяго, дапамагае яму "прыкрываць" некаторыя акцёрскія недахопы (а яны ёсць; музыка "дагаворвае" за герояў іх пачуцці, стварае адпаведную эмацыйную атмасферу) і растаўляць кульмінацыі. Нават калі ён не звяртаецца да прафесійных кампазітараў, а падбірае музыку самастойна, дык атрымліваецца настолькі натуральна, быццам гэтым займаўся спецыяліст: усё выкарыстана "да месца".

Эфекты і соцыум

Далёка не ўсё бясспрэчна ў "Чорнай панны Нясвіжа": і зварот да рускамоўнай версіі, і моманты побытавага "асучаснівання" даўніны. Але і тут заўважна жаданне рэжысёра максімальна "расквеціць" дзеянне — у тым ліку, праз эфект "тэатра ў тэатры". Далучэнне да крыху адрэдагаванага тэксту А.Дударава гістарычных даведак, агучаных "італьянскімі артыстамі", не толькі надае спектаклю асветніцкі характар, але і вымушае аддзяляць міфалагізацыю ад гістарычных фактаў.

Палескі тэатр застаецца адзіным у рэспубліцы, дзе была пастаўлена п'еса Л.Разумоўскай "Дадому!..", прысвечаная не толькі не "падслашчанай", а яшчэ і абвостранай трагедыі кінутых дзяцей. Здавалася б, навошта нам дакрананне да праблем, больш уласцівых расійскім мегаполісам? Наколькі сёння можа быць цікава "асучасненае" (і памаладзелае) горкаўскае "дно", антыподам да якога бачуцца духоўныя вяршыні? Але праз безвыходнасць чужой бяды, прапушчанай праз сваё сэрца, хутчэй знаходзіцца ўзаемаразуменне бацькоў і дзяцей. Прыцягвае спектакль і "цяжкіх падлеткаў", бо прыадчыняе ім "бязмежныя магчымасці" поўнай свабоды ад дарослых.

Штурм замест прастояў

Але ж ці значыць гэта, што ў самога тэатра — "няма праблем"? Ні ў якім разе! Менавіта іх давядзецца вырашаць новаму кіраўніцтву, на якое ўскладаюцца вялікія надзеі. У пінскім тэатры, як і ў іншых трупах з раёнаў, — вечны дэфіцыт артыстаў. Вось і зараз: тэрмінова робяцца ўводы, бо з тэатра сышоў яшчэ адзін вядучы выканаўца, а пры трупе ў паўтара дзясятка чалавек на падвойныя склады ды "замены" разлічваць немагчыма. Але ж у тэатра ёсць і перавагі! Калі на іншых сцэнах маладым артыстам даводзіцца па некалькі гадоў заставацца ў масоўцы ды ў лепшым выпадку "скакаць зайчыкамі", дык у Пінску яны з першых дзён атрымліваюць цэнтральныя ролі. Тое ж самае — з рэжысёрамі: адразу "творчы штурм" замест ныцця з прычыны "прастояў" і немагчымасці рэалізаваць свае памкненні. Маленькія ж памеры сцэны — цудоўны плацдарм для эксперыментаў!

Палескаму тэатру, як і яго калегам, бракуе хоць якіх-небудзь "выхадаў у свет", за межы свайго рэгіёна. А гэта магло б стаць значным стымулам: і для таго, каб "не сыходзілі", і для ўласна творчых пошукаў. Вось толькі запрашэнні самі з неба не звяляцца — патрэбна вялікая папярэдняя праца: не толькі пастановачна-акцёрская, што само сабой зразумела, але і прадзюсарская. Тэатру, па-першае, неабходны сайт, які будзе рэгулярна абнаўляцца, бо пакуль ёсць толькі старонка ў сацыяльнай сетцы. Неабходна прадугледзець запісы спектакляў (пакуль гэта калі хто ў Пінску і робіць, дык для сябе асабіста, на ўласныя сродкі): яны патрэбны і ў якасці "промаматэрыялаў", і з мэтай "погляду збоку" — саміх жа артыстаў. Ёсць сэнс больш мэтанакіравана падысці і да фарміравання рэпертуару. У ім абавязкова павінна з'явіцца штосьці адметнае, звязанае з мясцовай гісторыяй, традыцыямі — і, разам з тым, цікавае не толькі "тутэйшым", але і замежнікам (хто ў нас не марыць пра выезды ў замежжа!). Гэта можа быць, да прыкладу, духоўная ці нават біблейская тэматыка, але ў найноўшай, а не традыцыйнай эстэтыцы: Пінск у свой час быў адным з цэнтраў пратэстантызму ў Беларусі. А ці мала яўрэяў тут жыло? Чаму б не выкарыстаць і гэтую "зачэпку"? Шмат магчымасцей адкрывае і сама назва тэатра — Палескі. Бо Палессе ахоплівае сёння тэрыторыі не толькі Беларусі, але і Польшчы, Украіны, Расіі. Дый само геаграфічнае месцазнаходжанне тэатра дыктуе яму магчымае пашырэнне паўднёва-заходняга вектару стасункаў. А наколькі карысным быў бы для тэатра зварот да запрошаных рэжысёраў! І абавязкова — запрашэнне на прэм'еру крытыкаў.

Так што перспектывы — ёсць. Галоўнае — зразумець, што маленькія тэатры не павінны быць "маленькай" (ва ўсіх сэнсах) копіяй "вялікіх" сталічных. Тут як ні намагайся, нічога лепшага за бляклую падробку не атрымаецца. Іх шлях — у максімальным выкарыстанні сваіх мясцовых асаблівасцей, у ператварэнні кожнага "мінуса" ў патэнцыйны "плюс". І ў тым — залог індывідуальнасці ды цікавасці для іншых. Ну а высокія мастацкія якасці — гэта ўжо, бясспрэчна, само сабой…

Надзея БУНЦЭВІЧ

На здымках: сцэны са спектакляў "Раскіданае гняздо" і "Чорная панна Нясвіжа".

Адкрыццё... сучаснікаў

Постфактум да фестывалю "Заслаўе-2013"

"Стырнавы" Нацыянальнага канцэртнага аркестра маэстра Міхаіл Фінберг вось ужо які год імкнецца выправіць сітуацыю. У геаграфіі фестываляў Нацыянальнага канцэртнага аркестра (а толькі сёлета іх будзе 17!) старадаўняе Заслаўе мае адмысловае месца. У старажытным горадзе гучыць не беларуская музычная спадчына "сівой даўніны", але творы, фактычна, нашых сучаснікаў — тых кампазітараў, росквіт якіх адбыўся ўжо ў паваенны час. Зрабіўшы экскурс у гэты культурны пласт, "крэатыўнае ядро" аркестра хутка прыйшло да высновы, што адкрываць ды адраджаць яго гэтак сама складана, як і вяртаць да жыцця тыя айчынныя творы, якія цудам адшукаліся ў нетрах замежных архіваў.

— Так, мы робім усё, каб захаваць музыку сучасных беларускіх кампазітараў, — адзначыў за хвіліну да пачатку імпрэзы маэстра Фінберг. — І робім гэта нават не столькі "для гісторыі", колькі, перадусім, з іншай, вельмі простай прычыны: яны пісалі вельмі добрую музыку!..

Сапраўды, аркестр паспяхова ў гэтым пераконвае! Гэтым разам у сюжэтах навін усіх вядучых тэлеканалаў краіны прагучала прозвішча знакамітага кампазітара Анатоля Багатырова, 100-годдзе з дня нараджэння якога мы сёлета адзначаем. Ці кожны выпускнік музычнай школы пра яго ведае?

Беларускай літаратурнай класіцы моцна пашанцавала ў параўнанні з музычнай: яе вывучаюць на ўроках. Хтосьці проста "праходзіць", але некаторыя і спыняюцца — надоўга ці нават назаўсёды. А вось набыткі акадэмічнай кампазітарскай школы застаюцца збольшага менавіта ў "пасіўным" выглядзе, па-за межамі канцэртных залаў ды адукацыйнага працэсу.

Маэстра Міхаіл Фінберг.

Гучалі творы як самога майстра, так і ягоных, не менш знакамітых, вучняў: Яўгена Глебава, Генрыха Вагнера, Эдзі Тырманд... Музыколаг і нязменная вядучая камерных праграм фестываляў аркестра, доктар навук Вольга Дадзіёмава — не толькі дбайны даследчык музычнай спадчыны, але і надзвычай удалы яе папулярызатар. І ейны выкшталцоны канферанс здатны зацікавіць набыткамі кампазітарскай школы нават тых, хто класіку "па жыцці" ніколі не слухае — не кажучы ўжо пра беларускую...

Пісаць пра тое, што камерныя калектывы аркестра бездакорна справіліся са сваёй задачай, будзе нават лішнім. Усім вядома: Нацыянальны канцэртны заўсёды і ва ўсіх сваіх праявах вызначаецца перфекцыянізмам. Традыцыяй ужо стала і тое, што на кожнай з фестывальных праграм гучаць прэм'еры, прычым творы часам зведваюць даволі смелую ды працаёмкую інтэрпрэтацыю, прымушаючы ўвасабляць закладзеную ў іх музычную ідэю з дапамогай зусім іншых інструментаў, чым тыя, што прадугледжваў сам аўтар.

Канцэрт скончыўся, апладысменты гучалі доўга, але... пытанні засталіся. Ці здолее пачуць гэтыя творы кожны ахвотны? У запісе альбо — што нават лепш — у канцэртнай зале? Міхаіл Якаўлевіч у такіх выпадках адзначае: падобныя пытанні — не да яго. І сапраўды, недарэмна булгакаўскі прафесар Праабражэнскі называў сябе "прыхільнікам падзелу працы". Дый нават лішне казаць, што кіраўнік аркестра выконвае сваю функцыю папулярызацыі спадчыны на ўсе 500%.

— Звычайна Міхаіл Якаўлевіч тэлефануе мне прыкладна на пачатку восьмай — ужо са свайго офіса, — распавяла Вольга Дадзіёмава. — З'явілася новая цікавая ідэя, новы паварот у канцэпцыі фестывалю, які трэба тэрмінова абмеркаваць... Увогуле, "драматургія" кожнай такой імпрэзы выбудоўваецца надзвычай дакліва, і гэты творчы працэс можа доўжыцца ледзь не бясконца.

— На жаль, больш гэтыя канцэрты нідзе не ладзяцца, не гучаць па радыё. Але... Мы робім тое, што можам, — кажа сам Міхаіл Якаўлевіч.

Па словах Вольгі Дадзіёмавай, менавіта радыё знаёміла слухачоў яе пакалення з творамі беларускіх кампазітараў. І таму гэты рэсурс па-ранейшаму надзвычай важны — хаця ўявіць творы таго ж Багатырова ў плэй-лісце нейкай FM-станцыі было б папраўдзе фантастыкай, а моладзь аддае перавагу менавіта ім, а не радыёкропкам.

Зрэшты, нямала прадстаўнікоў будучага пакалення меламанаў усё ж да класікі неабыякавыя. Пра гэта сведчыць вялізны працэнт ахопу музычнымі школамі, што назіраецца па ўсёй краіне. І такі інструмент папулярызацыі нацыянальнай кампазітарскай спадчыны падаецца асабліва эфектыўным. "Ноу-хау" тут, зноў жа, належыць маэстра Фінбергу. Вось ужо ў які раз у рамках фестывалю ладзіцца конкурс для навучэнцаў музычных школ. Галоўная ўмова ўдзелу — выкананне твораў беларускіх аўтараў.

— Конкурс прайшоў надзвычай цікава і пакінуў у мяне выключна станоўчыя ўражанні, — распавёў Міхаіл Якаўлевіч. — Сёлета ў цэнтры нашай увагі знаходзіліся струнныя інструменты, наступным разам будуць ужо духавыя... Сярод удзельнікаў былі нават падрыхтоўчыя класы! Самае галоўнае, што дзеткі ад пачатку засвойваюць творы нашых цудоўных кампазітараў. Вядома, у гэтым вялікая заслуга педагогаў музычных школ, якія праявілі сур'ёзны ды адказны падыход...

...Заслаўскі фэст адметны яшчэ і тым, што менавіта ён адкрывае сёлетні каляндар разнастайных падобных імпрэз аркестра. Іх лік год ад года толькі множыцца. Гэтым разам, упершыню, фестываль пройдзе ў Любані. І паколькі "ніва багатая, а работнікаў мала", застаецца хіба пажадаць маэстра і ягонаму калектыву ладнай колькасці шчырых паплечнікаў і аднадумцаў. А яшчэ лепш — стварэння вакол фестываляў цэлай інфраструктуры, здатнай павялічыць іх адукацыйны (а ў перспектыве, можа, і камерцыйны?) патэнцыял…

Ілья СВІРЫН,
наш спецыяльны карэспандэнт

Пад час фестывалю ў Заслаўі.

Тым часам

Паводле традыцыі, тры дні ў пачатку лютага праходзяць у сталіцы пад знакам музычнага праекта "Мінскі джаз", галоўнай "дзеючай асобай" якога з'яўляецца Біг-бэнд Нацыянальнага акадэмічнага канцэртнага аркестра Беларусі пад кіраўніцтвам народнага артыста краіны, прафесара Міхаіла Фінберга.

Наш "Мінскі джаз" і яго "мены"

Сёлета такі фестываль быў ужо 24-м. Як заўсёды, ён праходзіў пад эгідай Міністэрства культуры Беларусі, асноўная ж арганізацыйная падтрымка зыходзіла ад Мінгарвыканкама. Шмат пытанняў вырашаў і сам аркестр — пры падтрымцы фундатараў. І свята атрымалася яскравым! Пра гэта падрабязней — у адным з наступных нумароў .

Пакуль жа паведамім, што лепшымі джазменамі года сталі сёлета двое саксафаністаў: Раман Арцем'еў (на фота справа), які ўжо цягам дзесяцігоддзя грае ў нашым аркестры, і Сяргей Чэбан з 19-гадовым стажам у "фінбергаўцаў".

Пластыка ў майстар-класе

Л.Давідзенка. Без назвы.

У Музеі сучаснага выяўленчага мастацтва прайшла выстаўка пад назвай "Сумоўе драўлянай скульптуры", прысвечаная памяці выдатнага скульптара Леаніда Давідзенкі (1941 — 2003 гг.). Мастацкая творчасць была толькі адной з іпастасяў гэтай шматграннай асобы. Многа зрабіў Леанід Рыгоравіч як выкладчык, працуючы ў гімназіі-каледжы мастацтваў імя І.В. Ахрэмчыка — "кузні" абітурыентаў для Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў. Нямала ягоных вучняў потым вучылася ў Акадэміі і сёння плённа працуе на ніве нацыянальнай культуры.

Экспазіцыя дае ўяўленне пра творчае кола, да фарміравання якога спрычыніўся Леанід Давідзенка і якое, у сваю чаргу, уплывала на яго як на асобу і творцу. Тут — работы самога майстра, а таксама ягоных калег і вучняў: А.Фінскага, У.Слабодчыкава, П.Лявонава, А.Шапо, С.Ермаловіча, А.Навасёлава, А.Мядзведзева, М.Шняка, А.Сакалова, Н.Стрыжнёвай, І.Арцімовіча. Усе аўтары прадстаўлены работамі, выкананымі ў дрэве. Справа ў тым, што менавіта гэты матэрыял Леанід Давідзенка вельмі шанаваў, вылучаў сярод іншых. Нават у скульптурах, адлітых у метале, адчуваецца адмысловая драўляная пластыка. Згадайма хоць бы самы вядомы шырокай грамадзе манументальны твор Давідзенкі — скульптура "Купалле" на сталічным праспекце Пераможцаў.

Магчыма, выстаўка ўяўляе асаблівую цікавасць для народных майстроў — разьбяроў па дрэве. Так склалася, што стылістыка гэтага віду нашага самадзейнага мастацтва грунтуецца на перайманні прафесійнай рэалістычнай скульптуры. Між тым, дрэва — гэта ўнікальны матэрыял, з якога можна рабіць што заўгодна, у тым ліку абстрагаваную і цалкам абстрактную пластыку. Для народных майстроў, самадзейных мастакоў, для каго дрэва — фактычна адзіны даступны матэрыял, выстаўка "Сумоўе драўлянай скульптуры" сталася сапраўдным майстар-класам…

Пётра ВАСІЛЕЎСКІ



І.Арцімовіч. "Адраджэнне".

"Роля" капрадукцыі

Нацыянальная кінастудыя "Беларусьфільм" разам з расійскімі (у тым ліку славутым "Ленфильмом"), фінскімі, нямецкімі партнёрамі прыняла ўдзел у стварэнні карціны Канстанціна Лапушанскага "Роля". На мінулым тыдні новы кінатвор расійскага рэжысёра, прызёра дзясяткаў міжнародных кінафестываляў, вучня Андрэя Таркоўскага, быў прадэманстраваны прадстаўнікам прэсы.

Адны з самых вядомых стужак Канстанціна Лапушанскага — "Лісты мёртвага чалавека" і "Гадкія лебедзі", створаныя пры ўдзеле сцэнарыста і пісьменніка-фантаста Вячаслава Рыбакова ды славутага Барыса Стругацкага. Філасофская антыўтопія — той жанр, што звязваецца з імем расійскага музыканта, мастака і рэжысёра. Яго работы — прыклад таго самага аўтарскага кінематографа, які стаіць на пазіцыях глыбокага роздуму, даследавання душы чалавека, і жанр тут часам не адыгрывае істотнай ролі.

Сюжэт "Ролі" можна вызначыць некалькімі сказамі. Выбітны акцёр Мікалай Яўлахаў, што жыве ў эміграцыі ў Фінляндыі, прагне сыграць у сваім жыцці самую важную ролю — рэальна існуючага чалавека — чырвонага камандзіра Ігната Плотнікава. Пад час уцёкаў з савецкай Расіі акцёр сутыкнуўся з камандзірам на станцыі Рытва і, убачыўшы, што яны з ім — двайнікі, задумаўся над прадастаўленай яму магчымасцю. Што можа быць вяршыняй яго акцёрскага майстэрства, як не "роля" Плотнікава — захапляльная звышзадача ўвасобіць свайго героя на "сцэне" рэальнага жыцця? Дзеля яе выканання акцёр гатовы перабрацца (і перабіраецца) ў савецкую Расію.

Але, вядома, соль стужкі не толькі і не столькі ў сюжэце. Перад намі — твор цалкам мадэрнісцкі, які існуе па сваіх законах. "Роля" — кіно пра перамяшчэнне чалавека не толькі ў прасторы, але ў часе. Пра зрушэнне рэальнасцей — выдуманай і сапраўднай. Пра "ісціну маскі", як казаў Аскар Уайльд. Пра рэальнасць мастацтва і ўмоўнасць жыцця… Пра парадоксы гісторыі…

Фільм зроблены ў чорна-белым фармаце, на кінаплёнцы 35 мм, эстэтыкай выявы нагадвае некалі бачаны ды забыты сон. Зіма, чыгуначныя станцыі, дым паравозаў, мітусня завеі, няўцямныя натоўпы людзей… — ключавыя сцэны адбываюцца менавіта на чыгуначных прыпынках, у цягніку, у змрочных пакоях. Варта адзначыць майстэрства беларускіх мастакоў-пастаноўшчыкаў Алены Жукавай і Андрэя Тоўсціка ды расійскага аператара Дзмітрыя Маса, якім удалося стварыць аскетычную і, разам з тым, "насычаную" прастору дзеяння, што можна ахарактарызаваць, як "дзесьці паміж мрояй і рэальнасцю", умоўна пазначанай каардынатамі Расіі 1920-х.

З акцёрскіх работ, як і заўжды, бездакорная ігра Леаніда Мазгавога. Свежым і запамінальным тварам у стужцы стала Настасся Шавялёва. Выканаўцы галоўнай ролі акцёра Яўлахава і чырвонаармейца Плотнікава — Максіму Суханаву — дасталася задача не з простых, але ж ён з ёй спраўляецца. На жаль, беларускія акцёры задзейнічаны ў стужцы мінімальна.

Хочацца звярнуць увагу, што асаблівая магія "Ролі" — і ў культуры выявы, якая адсылае да лепшых кінатвораў "Ленфильма".

Кадр з фільма "Роля".

Як паведаміў на прэзентацыі стужкі начальнік аддзела рэалізацыі і рэкламы кінастудыі "Беларусьфільм" Міхаіл Кацюшэнка, фільм Канстанціна Лапушанскага плануецца заявіць на прэстыжныя міжнародныя кінафестывалі. "Пабачым "Ролю" і на Мінскім міжнародным кінафестывалі "Лістапад", — адзначыў ён. І ў гэтых выпадках стужка будзе дэманстравацца, па магчымасці, на плёнцы, заверыў Кацюшэнка.

У рэпертуары беларускіх кінатэатраў новая карціна Канстанціна Лапушанскага з'явіцца ў сярэдзіне бягучага года. Прэм'ера стужкі знанага рэжысёра — добры пачын поўнаметражных навінак Нацыянальнай кінастудыі ў 2013-м, але, спадзяёмся, што ў гэтым пераліку мы ўбачым і творы беларускіх майстроў-рэжысёраў.

Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ

З 8 лютага ў краіне пачынаецца тэставае лічбавае вяшчанне тэлеканала "Беларусь 3". Як абяцаюць яго стваральнікі з Нацыянальнай тэлерадыёкампаніі, на мэце новай структуры — забеспячэнне асвятлення дзяржаўнай інфармацыйнай палітыкі ў галіне культурнага жыцця краіны, а яе галоўная задача — шчырая размова на тэмы культуры ў шырокім сэнсе. Сярод перадач доўгачаканага тэлеканала вялікую долю займае дакументалістыка, а ў ёй каля 80% — стужкі і праграмы вытворчасці РУП "Беларускі відэацэнтр". Упэўнены, што і навінкі ад кінавытворцы, пра якія распавядзём сёння, таксама трапяць у эфір "Беларусь 3".

Наперадзе — ігравыя

"Белвідэацэнтр": кінапланы на 2013-ы

Поспех стужак "Белвідэацэнтра" тлумачыцца вельмі проста: іх жанравы і тэматычны спектр вельмі шырокі — ад навукова-папулярных карцін энцыклапедычнага накірунку да аўтарскай дакументалістыкі ды кароткаметражнага ігравога кіно. З вытворчага боку спрацоўвае гнуткая кадравая сістэма, пры якой для кожнага праекта ствараецца адмысловая каманда аднадумцаў, дапамагае задзейнічаць лепшых спецыялістаў сваёй справы.

Напрыклад такі, як новы праект "Гісторыя беларускай кухні". Гэты чатырохсерыйны фільм разлічаны на самую шырокую аўдыторыю. Праект падзелены на некалькі частак, кожная з якіх прысвечана асобнаму раздзелу гастраноміі: "Бульба", "Супы і сытныя стравы", "Напоі. Піва". Ужо знятыя "Мясныя прысмакі" за аўтарствам сцэнарыста Таццяны Шахавец і рэжысёра Аляксея Раковіча маюць мала агульнага з папулярнымі тэлевізійнымі кулінарнымі шоу. Гэта, хутчэй, мастацкі фільм з цікавым прыгодніцкім сюжэтам, дзеючымі асобамі, відовішчнымі сцэнамі — усім, што адпавядае стандартам і ўзроўню мастацкага кіно.

Тое ж самае можна сказаць і наконт іншай навінкі "Белвідэацэнтра" — карціны Аляксандра Аляксеева пра Іосіфа Лангбарда. Здымачная група наведала Санкт-Пецярбург і адшукала нашчадкаў знакамітага архітэктара, ад якіх атрымала ўнікальную інфармацыю. Хранікальныя кадры і здымкі твораў Лангбарда былі дапоўнены рэдкімі дакументамі з асабістага архіва архітэктара, што захоўваецца ў Музеі гісторыі паўночнай расійскай сталіцы. У карціне ўдала выкарыстана арыгінальная камп'ютарная графіка, якая адразу адрозніваe карціну ад звычайных тэлевізійных перадач.

Сапраўды, аўтары БВЦ шырока выкарыстоўваюць найноўшыя камп'ютарныя тэхналогіі і прыёмы "вялікага" кіно кшталту ігравой рэканструкцыі. Гэта можна сказаць і пра стужку Веры Савінай ды Зоі Катовіч "Марк Шагал. Нерэальная рэальнасць" і пра дылогію Алены Антанішынай і Настассі Мірашнічэнка, прысвечаную Нясвіжу ды яго знакамітым насельнікам. Пра гэтыя стужкі "К" пісала ў папярэдніх нумарах, як і аб дакументальных кінаэксперыментах "Цяпло" Віктара Аслюка і "Дзень трубача" Мікіты Пінігіна і Сяргея Макарава, што прадстаўляюць у прадукцыі БВЦ аўтарскі напрамак. Зрэшты, трэба нагадаць і пра ўжо знакамітыя "Туфлікі" — кароткаметражны міжнародны праект, у поспеху якога вельмі вялікая доля спецыялістаў "Беларускага відэацэнтра". Сёлета арганізацыя прыме ўдзел у стварэнні наступнай часткі праекта, якая будзе называцца "Брут" і разам з "Туфлікамі" складзе кінаальманах аб ахвярах Халакосту і Другой сусветнай вайны. "Беларускі відэацэнтр" мае добры вопыт у галіне кінакааперацыі і ўпэўнена пачувае сябе сярод канкурэнтаў", — кажа кіраўнік БВЦ, прадзюсар Юрый Ігруша.

Кадры з фільма "Гісторыя беларускай кухні".

Дарэчы, гэты праект аб'яўлены адным з пераможцаў Другога Адкрытага рэспубліканскага конкурсу кінапраектаў, вынікі якога былі падведзены днямі. Яшчэ адну ігравую карціну — "Рускі" па апавяданні Максіма Гарэцкага — будзе здымаць на БВЦ адзін з самых плённых нашых кінематаграфістаў Віктар Аслюк. Дзяржава вырашыла падтрымаць дакументальныя стужкі "Беларускага відэацэнтра" пра Міхала Клеафаса Агінскага, Аляксандра Мядзведзя, гістарычныя падзеі Беларусі.

Антон СІДАРЭНКА

Крыху статыстыкі

Са спектрам стужак БВЦ за мінулы год змаглі азнаёміцца не толькі гледачы айчынных тэлеканалаў або наведвальнікі ўстаноў сферы культуры, якім фільмы паказваюць пад час экскурсій, але і госці ды ўдзельнікі 122 міжнародных кінафестываляў, у тым ліку Канскага. Летась "Беларускі відэацэнтр" вырабіў 13,9 тысячы DVD з фільмамі ўласнай вытворчасці, якія рэалізаваны праз 70 кропак продажу, а 260 стужак былі паказаны ў кінатэатрах. Высокія рэйтынгі работы атрымалі не толькі на трох нацыянальных тэлеканалах, але і ў сістэме інтэрактыўнага лічбавага тэлебачання "Zala". Абаненты сэрвісу "Відэа па запыце", дзе размешчаны 235 стужак БВЦ, праглядалі іх амаль 14 тысяч разоў.

Сустрэча ў майстэрні

У дні 70-годдзя перамогі ў Сталінградскай бітве майстэрню вядомага беларускага мастака, ураджэнца Украіны, ветэрана Вялікай Айчыннай вайны Тараса Паражняка наведалі прадстаўнікі ўкраінскай дыяспары ў Беларусі і пастаянны паўнамоцны прадстаўнік Украіны пры кардынацыйных інстытутах СНД Іван Бунечка.

Яны павіншавалі Тараса Мікалаевіча, які ваяваў у Сталінградзе і быў там паранены, са слаўнай гадавінай. Іван Бунечка ўручыў мастаку ад імя Украінскага прадстаўніцтва пры СНД віншавальную грамату і шэраг сувеніраў. Потым адбылася сяброўская гутарка.

Тарас Паражняк прыгадваў сваю ваенную маладосць, эпізоды славутай бітвы, падрабязна распавёў пра бой, у якім ён страціў руку. Бяда не зламала гэтага мужнага чалавека. Пасля вайны ён атрымаў у Маскве вышэйшую мастацкую адукацыю, потым выкладаў у Львоўскім інстытуце прыкладнога і дэкаратыўнага мастацтва і Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, дагэтуль плённа працуе як кераміст.

Іван Бунечка ўручае віншавальную грамату Тарасу Паражняку.

Тарас Мікалаевіч расказаў гасцям пра свае творчыя планы. У наступным годзе яму спаўняецца 90. Ягоны асабісты юбілей супадае з 70-й гадавінай вызвалення Беларусі ад нямецкіх акупантаў. Мастак рыхтуе персанальную выстаўку і манументальных памераў керамічны твор для новай экспазіцыі Беларускага дзяржаўнага музея гісторыі Вялікай Айчыннай вайны.

П.В.

Эскіз вазы, якая мае стаць экспанатам выстаўкі мастака ва Украіне.

Он-лайн-канферэнцыя: да выніковай калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь

Чарговую он-лайн-канферэнцыю мы вырашылі прысвяціць самым набалелым аспектам рэгіянальнай культуры. Удзельнікам віртуальнай гутаркі рэдакцыя прапанавала адзінае пытанне: "Якую нявырашаную праблему вы вынеслі б на парадак дня выніковай калегіі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь?". Пасяджэнне калегіі адбудзецца 12 лютага ў Нацыянальнай бібліятэцы краіны. Натуральна, не кожны яе ўдзельнік займее шанц выказацца з высокай трыбуны. "К" у гэтым плане мае, натуральна, больш магчымасцей.

І гаворка сёння пойдзе, безумоўна, не толькі аб праблемных момантах развіцця рэгіянальнай культуры, але і пра магчымыя, дзе — пакуль віртуальныя, а дзе — і досыць канкрэтныя, шляхі скасавання тых або іншых хібаў, якія замінаюць у працы.

Да ўдзелу ў он-лайн-канферэнцыі мы запрасілі кіраўнікоў абласных упраўленняў ды начальнікаў раённых аддзелаў культуры, сельскіх культработнікаў, а таксама сталых спонсараў буйных культурных мерапрыемстваў, што ладзяцца ў рэгіёнах. Нашы субяседнікі — начальнік упраўлення культуры Гродзенскага аблвыканкама Аляксандр ВЯРСОЦКІ, старшыня Глускага райвыканкама Юрый ДЫМША, першы намеснік начальніка ўпраўлення культуры Брэсцкага аблвыканкама Тамара ПАЎЛЮКОВІЧ, начальнік эканамічнага аддзела ўпраўлення культуры Гомельскага аблвыканкама Алена ПАЎЛАВА, намеснік дырэктара Беларускага металургічнага завода ў Жлобіне Віктар КАСЦЯЙКОЎ, намеснік старшыні Петрыкаўскага райвыканкама Віталь ПІЛЕР, начальнікі аддзелаў культуры райвыканкамаў: Браслаўскага — Галіна КАРАТКОВА, Крупскага — Таццяна МЕЛЬНІК, Брагінскага — Ліна ПЯТНІЦКАЯ, Ушацкага — Сяргей ГАРБАЧОЎ, а таксама загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Бярозаўскай ЦРБ Ала ДРАГАН і дырэктар Плябанаўскага сельскага дома культуры Ваўкавыскага раёна Аляксандр БАБІН.

Пасапернічаць з прыватнікам,

Рэдакцыя:

— Мы так разумеем, колькі ўдзельнікаў канферэнцыі, столькі, напэўна, і праблем? З якой пачнём?

Аляксандр Вярсоцкі:

— З таго, што не толькі культуры Гродзеншчыны, відаць, патрэбны новы штатны расклад. Безумоўна, праблема гэтая ўзнімалася на старонках "К" неаднойчы, тым не менш, у бліжэйшы час, як мне вядома, вырашацца яна не будзе. Так, рэдакцыя сённяшняга штатнага раскладу, які безнадзейна састарэў, прадугледжвае ўвядзенне новых адзінак на ўзроўні мясцовай улады. Але рабіць гэта трэба па ўзгадненні з фінансавымі аддзеламі, і кожны начальнік аддзела культуры цудоўна ведае, наколькі гэтая працэдура няпростая і няхуткая.

Рэдакцыя:

— Пытанне, сапраўды, б'е ўсе рэкорды паўтаральнасці на нашых "гарачых лініях" і он-лайн-канферэнцыях!.. Колькасць якіх спецыялістаў вы павялічылі б на раёнах?

Аляксандр Вярсоцкі:

— Сельскіх акампаніятараў. З музычнымі інструментамі праблем у нас няма, і на гэты год у вобласці выдаткавана на іх набыццё восем мільярдаў рублёў. Акампаніятар жа на поўнай стаўцы — з'ява, мякка кажучы, не вельмі распаўсюджаная…

Рэдакцыя:

— Адна з невырашальных на сёння праблем — нізкія заробкі работнікаў культуры, асабліва — бібліятэкараў. На два мільёны ў месяц пражыць зараз цяжка. Хто выкажацца на гэты конт?

Ала Драган:

— Усё правільна! І вось што непакоіць: пра недастатковыя заробкі настаўнікаў ды ўрачоў пытанне сёння мусіруецца бясконца і паўсюль. А хто слова закіне пра таго ж бібліятэкара? Загадчык аддзела райбібліятэкі з немалым працоўным стажам, які курыруе, да прыкладу, амаль сорак сельскіх філіялаў, атрымлівае ў месяц (з усімі магчымымі даплатамі!) менш за сельскага бібліятэкара першай катэгорыі!..

Рэдакцыя:

— Логікі тут, сапраўды, няма ніякай... Што непакоіць яшчэ?

Тамара Паўлюковіч:

— Можна было б згадаць праблему камунальных плацяжоў. Да 60 працэнтаў нашых пазабюджэтных сродкаў ідзе не на ўмацаванне рэгіянальнай культуры, а на аплату камуналкі, транспарту, сувязі... Каб гэтыя грошы заставаліся ў аддзелах, зацікаўленасці ў творчым развіцці было б, напэўна, больш... Але, як паказалі апошнія рабочыя нарады з прадстаўнікамі рэгіёнаў, больш хваляванняў на сёння ўзнікае на конт рэалізацыі нядаўна прынятага Закону Рэспублікі Беларусь "Аб дзяржаўных закупках тавараў (работ, паслуг)". Мы ўступаем у абсалютна новыя ўмовы папаўнення бібліятэчных кніжных фондаў, набыцця фільмапрадукцыі ды іншых паслуг. Выбар пастаўшчыка з дапамогай электронных таргоў — справа абсалютна новая і не вельмі простая. Прынамсі, цяпер, калі і месяца не прайшло з прыняцця згаданага закону. І ў сувязі з гэтым літаральна ў кожным раённым аддзеле культуры ёсць на дадзены конт пытанні.

> "Летась за кошт аказання платных паслуг мы зарабілі больш чым 170 мільёнаў рублёў. Натуральна, немалая іх частка пайшла на кампенсацыю камунальных паслуг. А хацелася б, каб сродкі заставаліся на аддзелаўскім рахунку".

Рэдакцыя:

— Міністэрства культуры, наколькі мы ведаем, збіраецца ў самы бліжэйшы час ліквідаваць гэты прабел і правесці навучальныя семінары для рэгіянальных работнікаў культуры...

Ліна Пятніцкая:

— У мяне таксама душа баліць за лёс нашых пазабюджэтных грошай. Летась за кошт аказання платных паслуг мы зарабілі больш чым 170 мільёнаў рублёў. Натуральна, немалая іх частка пайшла на кампенсацыю камунальных паслуг. А хацелася б, каб сродкі заставаліся на аддзелаўскім рахунку. Падаецца, ёсць у гэтым вялікі сэнс. Па-першае, мы былі б больш самастойнымі ў фінансавым плане і здолелі б больш эфектыўна стымуляваць творчую актыўнасць нашых работнікаў культуры. Падругое, для набыцця пэўных тавараў, да прыкладу — музычнай ці гукаўзмацняльнай апаратуры, іншым разам патрабуюцца сродкі для апаратыўнай аплаты, а такую апаратыўнасць казначэйства ніяк не гарантуе. Адзінае выйсце — пазабюджэтныя грошы. Але камуналка "з'ядае" іх…

Рэдакцыя:

— Не хацелася б весці гаворку пра нейкі рэйтынг праблем, але вышэйназваны прыклад — таксама адзін з найбольш паўтаральных. Не менш пытанняў выклікае і аптымізацыя сельскіх устаноў культуры. Як, дарэчы, яна ідзе ў рэгіёнах? — пытанне на сёння таксама ці не самае балючае для нашых аддзелаў культуры. З якімі цяжкасцямі ўжо давялося сутыкнуцца?

Галіна Караткова:

— Цяжкасці гэтыя звязаны не з матэрыяльным, а з маральным бокам. Калі ў вёсцы закрываюць школу, краму, пошту, пытанне аб захаванні ўстановы культуры, самі разумееце, проста не ўзнімаецца. Але на парадак дня выносіцца іншая праблема: як працаўладкаваць неблагога спецыяліста, што вызваліўся. Вось і ламаем галаву...

Віталь Пілер:

— Цалкам згодны: адно з галоўных на сёння пытанняў звязана з аптымізацыяй. Усяго ў раёне — 60 аб'ектаў культуры. Не ўсе з іх, на вялікі жаль, карыстаюцца вялікім попытам сярод насельніцтва. Магчымае выйсце — у развіцці мабільных устаноў культуры і закрыцці некаторых устаноў на сяле. Але да гэтай праблемы трэба падыходзіць узважана і асцярожна.

Рэдакцыя:

— На адной з нашых он-лайн-канферэнцый начальнік аддзела культуры Хоцімскага райвыканкама Мікалай Хучаў выказаў на конт аптымізацыі цудоўную думку: быў бы ў вёсцы народны ці ўзорны калектыў, ніхто клуб не скасоўваў бы. Меркаванне ў нейкай ступені крыху ідэалістычнае, але сэнс у ім досыць глыбокі…

Галіна Караткова:

— Усё правільна. Аднак вы не будзеце абвяргаць відавочнае: як стварыць якасны творчы калектыў у паселішчы, адкуль практычна ўся моладзь з'ехала ў гарады? А народнаму ансамблю яшчэ і калектыў-спадарожнік патрэбны. Дзе ж тых дзяцей браць? Адназначна адно: сёння ў вёску, дзе няма ўжо ні школы, ні пошты, дзяржаўныя грошы ўкладваць бессэнсоўна…

> "І вось што непакоіць: пра недастатковыя заробкі настаўнікаў ды ўрачоў пытанне сёння мусіруецца бясконца і паўсюль. А хто слова закіне пра таго ж бібліятэкара? Загадчык аддзела райбібліятэкі з немалым працоўным стажам, які курыруе, да прыкладу, амаль сорак сельскіх філіялаў, атрымлівае ў месяц (з усімі магчымымі даплатамі!) менш за сельскага бібліятэкара першай катэгорыі!.."

Рэдакцыя:

— І ці ёсць тут панацэя?

Галіна Караткова:

— У нашай сітуацыі яна — у актыўным выкарыстанні мабільных устаноў культуры: аўтаклуба і аўтабібліятэкі. І ў тым, што яны працуюць якасна, пераконваюць станоўчыя водгукі з месцаў ды высокая запатрабаванасць такога абслугоўвання.

Алена Паўлава:

— Па Гомельшчыне ў выніку аптымізацыі закрылі апошнім часам 32 клубныя ўстановы. Сітуацыя, як бачна, характэрная не толькі для нашай вобласці. І з гэтай нагоды я хацела б агучыць вось якое набалелае пытанне. У Дзяржаўнай праграме "Культура Беларусі" пазначаны і якасныя паказчыкі работы галіны: маю на ўвазе колькасць гледачоў, наведвальнікаў нашых устаноў. Лішне казаць, што выкананне гэтых паказчыкаў строга адсочваецца на самым высокім узроўні. Між тым, яны пастаянна нарошчваюцца. І пры сённяшняй аптымізацыі, пры значным скарачэнні клубаў ды бібліятэк захаваць колішні ўзровень ахопу жыхароў культурным абслугоўваннем вельмі цяжка.

Рэдакцыя:

— Што прапаноўваеце?

Алена Паўлава:

— Пры аптымізацыі сеткі непажадана павялічваць колькасць клубных фарміраванняў.

Ала Драган:

— Мы, да прыкладу, таксама за аптымізацыю ўзважаную і з усіх бакоў прадуманую!

Рэдакцыя:

— А якая праблема, на погляд начальніка аддзела культуры Ушацкага райвыканкама Сяргея Гарбачова, найбольш хвалюе музейшчыкаў? Задаём гэтае пытанне таму, што на тэрыторыі раёна знаходзіцца шмат адметных устаноў: Музей народнай славы імя Уладзіміра Лабанка, Сядзіба-музей Васіля Быкава і хата-музей Петруся Броўкі…

Сяргей Гарбачоў:

— Сярод іншага, на мой погляд, супрацоўнікаў музеяў перш за ўсё хвалююць пытанні паляпшэння матэрыяльна-тэхнічнай базы і ўкамплектавання найноўшай камп'ютарнай тэхнікай. У нас гэтыя праблемы летась удалося вырашыць: набылі неабходныя Музею народнай славы вітрыны, а таксама — новы камп'ютар ды ўстанавілі надзвычай патрэбную супрацоўнікам праграму "Музей-5" для вядзення ўліку музейных прадметаў. Так што з аргтэхнікай праблем асаблівых цяпер не маем.

Юрый Дымша:

— І мяне як кіраўніка раёна турбуе найперш матэрыяльна-тэхнічная база нашай раённай культуры. І не ў аграгарадках, дзе клубы ды бібліятэкі выглядаюць добра і гэтак жа працуюць, а ў раённым цэнтры. Маю на ўвазе тое, што гарпасёлку неадкладна патрэбны новы Дом культуры…

Рэдакцыя:

— Пра дадзеную патрэбу "К" пісала яшчэ ў 2009 годзе. За гэты час вы здолелі былую краму пераўтварыць у шыкоўны музей з карціннай галерэяй, дзе месца знайшлося і для бібліятэкі. На ДК фінансавання не хапіла.

Юрый Дымша:

— Так. Кадры ў культуры — ініцыятыўныя, маладыя. Задумак — шмат, многія з іх ужо рэалізаваны... Адзіная праблема — узвядзенне Дома культуры ў раённым цэнтры. Інакш кажучы, патрэбна падтрымка кіраўніцтва Магілёўскай вобласці.

Ліна Пятніцкая:

— У працяг пераліку нашых праблем хачу дадаць вось яшчэ што. Ці не занадта шмат часу начальнік аддзела культуры аддае будаўнічым клопатам? Не першы год займаю гэтую пасаду і цудоўна разумею важнасць якаснай здачы новых аб'ектаў культуры. Але вельмі шмат часу ідзе на клопаты зусім не творчага характару. Ці ж на гэта мы вучыліся? Чаму працэс не адсочваюць цалкам заказчыкі работ — упраўленне капітальнага будаўніцтва райвыканкама ці іншыя профільныя арганізацыі?

Рэдакцыя:

— Але ж дзейнасць гаспадарчай групы аддзела культуры вы проста абавязаны кантраляваць!..

Ліна Пятніцкая:

— А з гэтым якраз праблем ніякіх няма. Гаспадарчая група займаецца, як вы ведаеце, толькі дробным, бягучым рамонтам. І робіць гэта цудоўна: на замене дзвярэй, вокнаў і падлог у сельскіх установах культуры летась было асвоена больш за 140 мільёнаў рублёў!..

калі да нас ідуць "не вельмі"

Як узвесці новы Дом культуры і знайсці інвестара для музея?

Віталь Пілер:

— Яшчэ адно пытанне, якое надзвычай хвалюе, — кадравы патэнцыял Петрыкаўшчыны. На жаль, маладыя людзі не надта жадаюць працаваць у сферы культуры, і, зазвычай, сыходзяць пасля абавязковай адпрацоўкі. Першая праблема ў гэтым плане — заробкі. Іх трэба павышаць, магчыма, з дапамогай той жа аптымізацыі сеткі ўстаноў культуры і пераразмеркавання ставак, якія вызваляцца, супрацоўнікам іншых клубаў і бібліятэк.

Ала Драган:

— Кадравае пытанне і нас хвалюе. Маладыя спецыялісты не затрымліваюцца ў бібліятэках з-за нізкіх заробкаў. Пра раскрыццё творчага патэнцыялу нават і гаворкі не вядуць…

Рэдакцыя:

— Навошта ж тады на бібліятэчныя факультэты паступалі? Тэма маладых спецыялістаў, як і тэма аптымізацыі рэгіянальнай культуры, турбуе і "К". Пісалі пра гэта і будзем пісаць. А зараз — іншы блок не менш важкіх праблем. Ці ёсць, да прыкладу, вузкія месцы ў дзяржаўна-прыватным партнёрстве?

Аляксандр Бабін:

— Пытанне пастаўлю крыху інакш. На мой погляд, сёння важна актуалізаваць канкурэнцыю паміж дамамі культуры і прыватнымі арганізацыямі, якія прадастаўляюць творчыя паслугі насельніцтву. Як правіла, такія прадпрымальнікі маюць у складзе сваёй брыгады па тры-чатыры чалавекі і могуць паказаць і відовішчнае фаер-шоу, і арыгінальны канцэрт. І зарабляюць яны вельмі добра. Памятаю, у Ваўкавыск запрасілі з Мінска спецыялістаў па фаер-шоу. Яны за паўгадзіны выступлення атрымалі 8,5 мільёна рублёў. Так што такі бізнес — вельмі прыбытковы. Таму сёння вельмі важна вызначыць прыярытэты: альбо дамы культуры робяць стаўку на камерцыйную дзейнасць, зарабляюць і багацеюць, альбо арыентуюцца на прадастаўленне сацыякультурных паслуг ды атрымліваюць датацыі з бюджэту.

Рэдакцыя:

— Але ці змогуць культработнікі эфектыўна канкурыраваць з прыватнікамі? Апошнія ж маюць самае сучаснае тэхнічнае абсталяванне, пра якое ў сельскім клубе ці нават у ГДК толькі мараць…

Аляксандр Бабін:

— А я лічу, што мы можам канкурыраваць нароўні і нават без асаблівых праблем пераўзыходзіць тыя мабільныя прыватныя брыгады. Але для гэтага, на мой погляд, варта зменшыць нагрузку па ўсіх магчымых выплатах на дамы культуры. Сёння ўжо было сказана, што асноўная колькасць заробленых на платных паслугах грошай ідзе на аплату камунальных плацяжоў. І прагучала прапанова, як гэтыя грошы можна было б выкарыстаць з большым эфектам для дзяржавы: прэміраваць супрацоўнікаў, закупляць новую апаратуру, запрашаць ды-джэя з абласнога цэнтра…

Рэдакцыя:

— Паставім пытанне інакш: ці могуць, на ваш погляд, культработнікі супрацоўнічаць з прыватнікамі, ствараючы, так бы мовіць, культурныя сумесныя прадпрыемствы для аказання тых або іншых відаў паслуг?

Аляксандр Бабін:

— Безумоўна. І ў некаторых раёнах, наколькі ведаю, гэта ўжо робяць праз афармленне дагавора. Пытанне тут толькі ў тым, што звычайна ў прыватныя брыгады ўваходзяць спецыялісты, якія калісьці загартаваліся на ніве аказання культурных паслуг у дзяржаўных установах, але сышлі адтуль з-за нізкіх заробкаў. Мы, фактычна, самі ствараем сабе канкурэнтаў… І калі зможам нароўні з імі ладзіць культурныя імпрэзы, толькі тады прыватнікі зацікавяцца сумесным супрацоўніцтвам. А пакуль маем тое, што маем: да іх — ідуць, а да нас — не вельмі. Таму нам трэба працаваць над павышэннем якасці сваіх паслуг.

Рэдакцыя:

— Чарговы доказ таго, што над якасцю нашых мерапрыемстваў яшчэ працаваць ды працаваць… Што скажуць з гэтай нагоды спонсары? Якім павінна быць культурнае мерапрыемства, каб яго не цураліся гледачы ды падтрымалі інвестары?

Віктар Касцяйкоў:

— Цікавым, відовішчным, падзейным і, што немалаважна, — сацыяльна значным.

Рэдакцыя:

— Увогуле, ці стала актуальнай праектная дзейнасць менавіта ў сферы рэгіянальнай культуры?

Віталь Пілер:

— І ў Петрыкаўскім раёне, і ў іншых раёнах Беларусі ёсць шмат цікавага ў гістарычным ды культурным аспектах. Таму распрацоўка падобных культурных праектаў спрыяе больш шчыльным кантактам з мясцовым бізнесам, прыцягвае фінансавыя сродкі на рэалізацыю тых ідэй культработнікаў, на "даводку" якіх не заўседы хапае бюджэтнага фінансавання.

Рэдакцыя:

— Жлобін літаральна ўчора браў удзел у абласной спартакіядзе сярод кіруючых работнікаў. Як казаў начальнік аддзела культуры мясцовага райвыканкама Віктар Бажан, гонар раёна адстаялі. БМЗ спансіраваў гэтае мерапрыемства?

Віктар Касцяйкоў:

— Прызоў, сапраўды, прывезлі нямала. А праводзілася спартакіяда за кошт абласнога бюджэту… А вось адзін з апошніх спонсарскіх культурных праектаў БМЗ — фінансавая падтрымка раённага фестывалю песні воінаў-інтэрнацыяналістаў, што ваявалі ў Афганістане. Вось тут, на мой погляд, і спалучыліся ўдала відовішчнасць ды глыбокі духоўны змест мерапрыемства.

> "Сёння важна актуалізаваць канкурэнцыю паміж дамамі культуры і прыватнымі арганізацыямі, якія прадастаўляюць творчыя паслугі насельніцтву. Як правіла, такія прадпрымальнікі маюць у складзе сваёй брыгады па тры-чатыры чалавекі і могуць паказаць і відовішчнае фаер-шоу, і арыгінальны канцэрт. І зарабляюць яны вельмі добра".

Рэдакцыя:

— Віктар Аляксеевіч, якое праблемнае пытанне вы вынеслі б на парадак дня выніковай калегіі Міністэрства культуры?

Віктар Касцяйкоў:

— Калі спонсар падтрымлівае, да прыкладу, спорт ці медыцыну, ён мае гарантаваную падатковую палёгку. А вось у дачыненні да фінансавання культуры яна пакуль не такая важкая. Гэтае пытанне, на мой погляд, і патрабуе неадкладнага разгляду на самым высокім міжміністэрскім узроўні.

> "Калі спонсар падтрымлівае, да прыкладу, спорт ці медыцыну, ён мае гарантаваную падатковую палёгку. А вось у дачыненні да фінансавання культуры яна пакуль не такая важкая. Гэтае пытанне, на мой погляд, і патрабуе неадкладнага разгляду на міжміністэрскім узроўні".

Рэдакцыя:

— Указ Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 14 красавіка 2011 года № 145 "Аб некаторых пытаннях падаткаабкладання ў сферах культуры і інфармацыі" выкарыстоўваецца яшчэ не так актыўна. Але вернемся да праектаў. Досвед праектнай дзейнасці на Петрыкаўшчыне даволі неблагі. Ды і начальнік мясцовага аддзела культуры Алена Прадко сваіх супрацоўнікаў да гэтага падштурхоўвае: аб'явіла конкурс праектаў сярод структурных падраздзяленняў — РАМЦ, ГДК, ЦРБ… Але чаму ж праекты петрыкоўцаў пакуль не зацікавілі інвестараў?

Віталь Пілер:

— Сапраўды, наш аддзел культуры прапаноўваў праект па аднаўленні будынка колішняй вінакурні ў вёсцы Лучыцы і стварэнні на яе базе аграэкатурыстычнага комплексу. Летась культработнікі прадставілі на мясцовым інвестфоруме праект стварэння на базе Музея Дзеда Талаша ваенна-гістарычнага падворка. Словам, важкіх ідэй хапае. А тое, што не ўдаецца пакуль прыцягнуць пад іх рэалізацыю спонсараў, — лічу, не надта вялікая бяда, бо мы толькі распачынаем гэтую дзейнасць: яна для нас, пагадзіцеся, яшчэ новая.

Рэдакцыя:

— А як канкрэтна раскручваецца?

Віталь Пілер:

— Піярым, зноў жа, свае праекты на інвестфорумах, размясцілі праектныя заяўкі на сайтах рай- і аблвыканкамаў… Паступова, лічу, працэс супрацоўніцтва з прыватным бізнесам у рэалізацыі культурных праектаў будзе наладжаны. Ва ўсялякім выпадку, абяцаю, што кіраўніцтва Петрыкаўскага райвыканкама абавязкова будзе спрыяць гэтай дзейнасці і ствараць для інвестараў усе неабходныя ўмовы.

Ала Драган:

— Сярод балючых праблем я акцэнтавала б яшчэ раз агучаную Аляксандрам Вярсоцкім у рамках дадзенай он-лайн-канферэнцыі неадкладную патрэбу ў новым штатным раскладзе… Але "К" ужо безліч разоў пра гэта пісала, а сітуацыя так і не зрушылася з мёртвай кропкі…

Рэдакцыя:

— Ці ўключана знакамітая Сядзіба-музей Васіля Быкава ў раённыя ды рэспубліканскія турыстычныя маршруты?

Сяргей Гарбачоў:

— Безумоўна. У нас ёсць два падобныя маршруты, якія праходзяць па месцах баявой славы, а таксама па іншых знакамітых кутках Ушаччыны, і на абодвух экскурсанты Быкі не прамінаюць. Дарэчы, сёлета мы плануем правесці добраўпарадкаванне музейнай тэрыторыі ў вёсцы. І гэта будзе толькі пачаткам мерапрыемстваў, што маем правесці ў раёне да 90-годдзя з дня нараджэння класіка беларускай літаратуры, якое будзем адзначаць у 2014-м.

Таццяна Мельнік:

— А вось яшчэ праблема з ліку невырашальных, пра якую "Культура" таксама неаднаразова згадвала: пастанова Савета Міністраў № 582 не дазваляе знаходзіцца падлеткам ва ўзросце да 18 гадоў на культурна-масавых мерапрыемствах пасля 10-й гадзіны вечара. І гэта вельмі перашкаджае нашай працы, асабліва — у сельскай мясцовасці. Таму дазвольце закрануць сітуацыю яшчэ раз…

Рэдакцыя:

— І мы цудоўна разумеем вашу занепакоенасць…

Таццяна Мельнік:

— Падлеткі ўлетку зазвычай толькі і пачынаюць збірацца на дыскатэкі а 10-й гадзіне вечара. А мы фактычна ім у гэтым адмаўляем, нягледзячы на тое, што, у адпаведнасці з Адміністрацыйным кодэксам Беларусі, непаўналетнім дазваляецца знаходзіцца на вуліцы і пазней за абазначаны час.

Рэдакцыя:

— Аднак у Беларусі ўведзена каменданцкая гадзіна пастановай Саўміна № 772, згодна з якой асобам, што не дасягнулі 16 гадоў, пасля 11-й гадзіны вечара на вуліцы знаходзіцца забараняецца. Іншая справа, што юнакам, якім больш за 16 гадоў, можна было б дазволіць наведванне дыскатэк.

Таццяна Мельнік:

— Так. Бо, гэтым мы, так лічу не я адна, адштурхоўваем дзяцей ад нашых устаноў, дзе яны маглі б культурна і з карысцю бавіць вольны час. А мы адпраўляем іх на вуліцу! Начны клуб у Мінску — гэта, пагадзіцеся, адно, а Дом культуры на сяле — зусім іншае.

Рэдакцыя:

— Агучаная вамі праблема ўзнімалася ўдзельнікамі нашай он-лайн-канферэнцыі неаднойчы. У прыватнасці, на гэтае пытанне звяртаў увагу і дырэктар Плябанаўскага СДК Аляксандр Бабін… Таццяна Іванаўна, а што цяпер адбываецца з рэканструкцыяй аднаго з гарадскіх будынкаў пад Крупскую ЦРБ? Пра рамонтную эпапею з гэтым аб'ектам культуры, як і пра аварыйны стан Глускага ДК, "К" пісала ўжо неаднойчы…

Таццяна Мельнік:

— Летась пад гэтыя мэты мы асвоілі 900 мільёнаў рублёў. А сёлета з абласнога бюджэту пад рамонтныя работы на згаданым аб'екце выдаткавана 2 мільярды рублёў. Так што, як бачыце, рамонтная эпапея з новым будынкам Крупскай ЦРБ блізіцца да лагічнага завяршэння…

Ад рэдакцыі. *Мы вельмі ўдзячныя субяседнікам па сённяшняй он-лайн-канферэнцыі. Яна, шчырая і адкрытая, яшчэ раз пераканала: праблемы рэгіянальнай культуры "абраслі барадой". Справядліва заўважыла загадчык аддзела бібліятэчнага маркетынгу Бярозаўскай ЦРБ Ала Драган: "Газета ўжо безліч разоў пра гэта пісала, а сітуацыя так і не зрушылася з мёртвай кропкі". Рэдакцыя, натуральна, не прэтэндуе на ролю "цырульніка", але мае намер "узорваць" праблемнае поле і надалей — з прыцягненнем усіх магчымых міжведамасных сіл.*

Адзін з варыянтаў такога фармату: правядзенне "круглых сталоў" не толькі з прадстаўнікамі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, але і міністэрстваў працы і сацыяльнай абароны, фінансаў, унутраных спраў. Пра неабходнасць арганізацыі такіх прадстаўнічых "круглых сталоў" нам казалі і пад час "выязных рэдакцый" на Гомельшчыне і Брэстчыне. І мы ў хуткім часе рэалізуем слушную прапанову. Мо тады і стане зразумела, якімі шляхамі работнікі культуры Беларусі прыдуць да прыстойных заробкаў, аптымальных штатных раскладаў, бяспечных начных дыскатэк, а спонсары палічаць за гонар укладваць грошы ў нацыянальную культуру, багатую традыцыямі, гісторыяй і адметнымі набыткамі? Прынамсі, вельмі хацелася б на гэта спадзявацца…

Матэрыялы падрыхтавалі
Яўген РАГІН
і Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

РЭГІЁНЫ: МАЙСТАР-КЛАС КРЭАТЫВУ

Падставай для напісання гэтага матэрыялу стала мая журналісцкая недакладнасць. Патэлефанавала намеснік начальніка ўпраўлення культуры Мінскага аблвыканкама Святлана Баранок і сказала, што не можа пагадзіцца з двума радкамі майго артыкула пра развіццё праектных тэхналогій у Докшыцкім раёне. А радкі наступныя: "У Докшыцкай ДШМ з мінулага года дзейнічае праект "Школа ранняга развіцця", аналагаў якому ў рэспубліцы няма". Аказваецца — ёсць: у Салігорскай ДШМ аналагічны праект дзейнічае з 2003 года. Прашу прабачэння. І справа тут не толькі ў тым, што работнікі культуры Докшыцкага раёна не вельмі дакладна ведаюць, што робяць калегі з Салігоршчыны. Галоўнае, што перадавы вопыт на ўзроўні рэспублікі абагульняецца без належнай актыўнасці. Паспрабуем ліквідаваць гэты інфармацыйны прабел. І не толькі на прыкладзе Салігорска.

Заняткі пачаткоўцаў у Салігорскай ДШМ.

Сальфеджыя пазабюджэту

Салігоршчына:
штатны эксклюзіў

Дырэктар Салігорскай ДШМ Алег Шчэрбаў назваў падрыхтоўчыя курсы для дзяцей Цэнтрам эстэтычнага выхавання. Узначальвае яго магістр педагагічных навук Святлана Пятровіч. У Цэнтр набіраюць дзяцей пяцігадовага ўзросту. Два разы на тыдзень цягам двух гадоў яны развіваюць здольнасці, асвойваюць майстэрства калектыўных спеваў, харэаграфіі, акцёрства, правілы добрых паводзін… У выніку ДШМ набывае якасны набор, які здабывае веды без наступнага адсеву.

Але крэатыў праекта не толькі ў гэтым. Навучальныя паслугі Цэнтра, як тлумачыць Алег Шчэрбаў, каштуюць бацькам 80 тысяч рублёў у месяц (удвая больш, чым у Докшыцах). Дзякуючы гэтым пазабюджэтным сродкам кіраўніцтва ўстановы змагло ўвесці ў штат яшчэ шэсць рабочых месцаў для дадатковых настаўнікаў. Знайшліся грошы і для аплаты працы касцюмера. Больш за тое: у дырэктара ДШМ з'явіўся намеснік па пазабюджэтнай дзейнасці. Каментарыі — лішнія.

"Вожыкі…" са Светлагорска.

Гродзеншчына:
і баян, і камп'ютар

Чарговы адрас цікавага досведу: аграгарадок "Абухава" Гродзенскага раёна. Мы калісьці пісалі, што з музычнымі інструментамі ў мясцовай ДШМ праблем няма. Дырэктар установы Яўген Яськоў паведамляе, што і за мінулы год было набыта 15 скрыпак, 6 гітар, баян, акардэон, цымбалы… Нават старыя інструменты пастаянна падтрымліваюцца ў належным стане. Начальнік аддзела культуры Ігар Лябецкі рэгулярна выдаткоўвае грошы на іх рамонт ды настройку. Сёлета на абнаўленне інструментарыя для дзевяці ДШМ раёна запланавана выкарыстаць аж 500 мільёнаў рублёў.

Грошы выдаткоўваюцца і на камп'ютарную тэхніку. У Абухаўскай дзіцячай школе мастацтваў два камп'ютары ўжо ёсць, трэці — на падыходзе. Усё гэта дае магчымасць наладзіць мультымедыйнае навучанне музычна-тэарэтычным дысцыплінам. Інакш кажучы, сальфеджыа і музычную літаратуру дзеці засвойваюць у аграгарадку з дапамогай сучасных інфармацыйных тэхналогій.

Светлагоршчына:
"вожыкі" выходзяць з туману

"Вожыкі ў тумане" — эксперыментальная студыя, якая дзейнічае пры тэатральным аддзяленні Светлагорскай школы мастацтваў. Эксперыменты прывялі да таго, што Светлагорск пачаў арганізоўваць раз на два гады фестываль дзіцячай творчасці сярод ДШМ Гомельшчыны. Летась адбыўся ўжо чацвёрты такі фэст. У ім бяруць удзел і юныя тэатралы з Мінска, Магілёва, Лепеля, з расійскіх навучальных устаноў культуры. Словам, Светлагорская ДШМ, якой у верасні спаўняецца 50 гадоў, ужо мае свой сталы абласны брэнд.

Дарэчы, як сцвярджае Святлана Вярэніч, такі фестываль не мае аналагаў у рэспубліцы… Мо я зноў памыляюся? Калі так — тэлефануйце, пішыце, абвяргайце!..

Яўген РАГІН

Выхаванцы ДШМ аграгарадка "Абухава".

Бяспека жыцця

Асцярожна: галалёд!

Капрызная нябесная канцылярыя не спяшаецца радаваць: то сыпле снегам, то "плача" дажджом, то зноў падмарозіць. А, як вядома, пры адмоўнай тэмпературы вада застывае ў выглядзе ледзяной скарынкі на любой паверхні: на ходніках, дарогах, дратах, карнізах дамоў і гэтак далей. Для пешаходаў адразу ўзнікае праблема: як прайсці па дарозе і не паслізнуцца на ледзяной паверхні.

Штогод толькі ў Мінску пад час галалёду траўміруецца больш за пяць тысяч чалавек. Да гэтых лічбаў можна смела дадаць вялікую колькасць людзей, якія атрымліваюць нязначныя пашкоджанні пры падзеннях і не звяртаюцца па дапамогу ў медыцынскія ўстановы. Тыповымі траўмамі пры падзенні з'яўляюцца ўдары, вывіхі, пераломы, сатрасенне мозгу. А сумны вынік заключаецца ў неабходнасці працяглага лячэння, а часам чалавек становіцца інвалідам.

Пазбегнуць падобных непрыемнасцяў цалкам магчыма. Перш за ўсё, уважліва глядзіце сабе пад ногі, старайцеся абыходзіць небяспечныя месцы і будзьце вельмі асцярожнымі. Калі ледзяную "лужыну" немагчыма абысці, то трэба перасоўвацца па небяспечным участку, імітуючы рух пры хадзьбе на лыжах: невялікім слізготным крокам. Рухацца трэба на злёгку сагнутых нагах: гэта надасць большую ўстойлівасць. Не спяшайцеся, а тым больш — не бяжыце. Старайцеся абыходзіць месцы з нахіленай паверхняй. Не займайце рукі далікатнай або цяжкай ношай. Асаблівую асцярожнасць належыць праяўляць пры хадзе па слізкай паверхні ноччу, пад час снегападу, дажджу, у ветранае надвор'е.

На жаль, пазбегнуць падзенняў атрымліваецца не заўсёды, таму, як гэта ні дзіўна гучыць, вучыцеся падаць. Калі вы паслізнуліся — прысядзьце, каб знізіць вышыню падзення, згрупіруйцеся, бо ў момант падзення трэба сціснуцца, напружыць мускулы, а, крануўшыся зямлі, абавязкова перакаціцца.

Пасля падзення не спяшайцеся падняцца, спачатку агледзьце сябе, ці няма траўмаў, папрасіце падарожных дапамагчы вам. Калі побач не аказалася людзей, павярніцеся на жывот, устаньце на карачкі, прысядзьце і толькі потым выпрастайцеся. Каб не ўпасці паўторна, паспрабуйце за што-небудзь трымацца: за дрэва, агароджу. Пасля прыняцця вертыкальнага становішча некалькі хвілін пастойце, пераканайцеся, што ў вас няма сур'ёзных траўмаў, агледзьце месца падзення, асцярожна прадоўжыце рух.

Вялікую небяспеку для людзей галалёд уяўляе пры перамяшчэнні па лесвіцах: пры ўваходзе ў метро, у грамадскі транспарт і гэтак далей. У гэтай сітуацыі неабходна трымацца за поручні. У выпадку падзення трэба спыніць рух, упіраючыся рукамі ці нагамі ў прыступкі альбо хапаючы рукамі стойкі парэнчаў.

Таксама сур'ёзную небяспеку ўяўляе пераход праезнай часткі дарогі пад час галалёду. Варта памятаць, што спыніць транспарт на слізкай дарозе надзвычай складана. Улічваючы гэта, неабходна выключыць выпадкі пераходу дарогі перад транспартам, які набліжаецца вельмі хутка.

Таццяна БЫЧАНОК,
спецыяліст групы прапаганды і навучання
Савецкага РАНС г. Мінска

Тыдзень у каментарыях з сацыяльных сетак

У сацыяльных сетках артыкулы папярэдніх нумароў "К" працягваюць абмяркоўвацца, падзяляцца і "абрастаць" новымі "лайкамі". Прапануем вам колькі каментарыяў з нашага акаунта facebook.com/kimpress.by

На матэрыял "Атавізм, прабуксоўка ці ўсё ж такі "клікабельнасць"?" у "К" № 5

Iryna: "Цікава і змястоўна… Чым глыбей у тэме, тым больш пытанняў…"

Chan: "Галоўнае — пакуль ёсць пра што казаць…"

Iryna: "Што да аўтэнтычных гуртоў і дзіцячых калектываў-спадарожнікаў — усё трымаецца на асобе. Калі ёсць чалавек, якому гэта патрэбна (для сябе, а не для заробку, бо зарабіць на гэтым цяжка), тады ёсць калектыў, ёсць дзейнасць.

Пра спевы вясковых бабуль пад фанаграму. Калі яны спяваюць так званыя беларускія народныя песні (пад фанаграму, пад гармонік) — гэта часцей за ўсё гучыць звычайна, увагу не прыцягвае. Калі ж выконваюць "свае" песні (мясцовы традыцыйны фальклор) — і выкананне ў цэлым, і гук становяцца нашмат больш цікавымі. Быў выпадак, калі на адным з восеньскіх кірмашоў у Гомелі з сябрамі папрасілі пару жанчын са Светлагорскага раёна праспяваць нешта сваё. Як яны заспявалі, людзі пачалі каля іх спыняцца, прыслухоўвацца, цікавіцца. Гэтыя жанчыны — у складзе ансамбля народнай песні, які раней быў фальклорным, аднак змяніў свой кірунак (старэйшыя ўдзельніцы пайшлі з жыцця, запатрабаванасць аўтэнтыкі — меншая, чым "беларускіх народных песень").

Да музейных рэчаў. Па сельскіх установах культуры амаль усюды ёсць "куткі традыцыйнай культуры". Калі бачу іх, так і ўзнікае ўражанне, што традыцыю захоўваюць, "заганяючы ў кут". А яна ж можа жыць, яна можа трансфармавацца, яна ж жывая!

Пра сакральнасць фальклору. Ёсць фальклор інтымны (сакральны, не для публікі) і публічны (напрыклад, бяседныя песні, побытавыя танцы). У мысленні бабуль ёсць паняцці, адпаведныя сучасным "сакральнасць", "медытацыя", толькі называюцца яны іншымі словамі, калі ўвогуле называюцца. Бо гэта сфера, у якую "чужы" не дапускаецца.

Пра перайманне. Шчыльна займаючыся фальклорам (выпускніца кафедры этналогіі і фальклору БДУКіМ, кіраўнік маладзёжнага фальклорнага калектыву, метадыст па этнаграфіі і фальклоры), гадоў праз пяць (калі ў актыўнай памяці колькасць песень пераваліла за 100 — 150 і калі стала іх выконваць сезонна) стала крыху разумець асаблівасці традыцыйнага мыслення, памяці. Працэс узгадвання і выканання песень стаў набліжацца, ва ўсялякім выпадку, знешне, да такога, як у жанчын, з якімі сустракаешся ў экспедыцыях.

Уявіць камбайнера, які спявае жніўныя песні, сапраўды немагчыма: зусім іншая сітуацыя. Менавіта таму зараз з традыцыйнага абрадавага фальклору самыя жывыя жанры — калядкі са шчадроўкамі і вясельныя песні, што не страчваюць сваёй актуальнасці".

На матэрыял "Замена лямпачкі як мастацкі кірунак" у "К" № 5

Oleg: "У прынцыпе, і той варыянт, ранейшы, нагадаў добрае, якаснае "мыла"…"

На матэрыял "Дысананс ад песняў" у "К" № 3

Iryna: "На маю думку, у такіх праектах маглі б актыўней карыстацца беларускай мовай, тым больш, што, паводле Палажэння (якое на рускай мове), мэта "Песень…" — "…развитие и популяризация белорусского песенного творчества, самодеятельных коллективов, эстетическое и духовное воспитание молодого поколения, совершенствование национальной культуры", патрабаванне ж — прадстаўляць песні на беларускай мове…"

На матэрыял "Падзяліцца брэндам: рацыянальна або ўтапічна?" у "К" № 3

Воля: "Як мінімум дзіўна… Навагрудскі замак куды цікавейшы за Мірскі, які не вытрымаў аніводнай аблогі. Мірскі замак — кшталту Сілічаў. Няхай яго Мінск і раскручвае!.."

Паважаныя чытачы! Нам цікавае ваша меркаванне па тэмах нумара.
Пішыце на адрас: 220013, г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 77 або kultura@tut.by,
тэлефануйце ў рэдакцыю па нумары 8-017-286-07-97,
абмяркоўвайце тэму на facebook.com/kimpressby і twitter.com/kultura_by!

Маналогі-лекцыі ад менеджара

Тэхналогія продажу,

Ператварыць шараговае мерапрыемства ў Падзею

або Як быць канкурэнтнымі ў рынначных умовах

"К" неаднойчы акцэнтавала ўвагу на неабходнасці развіцця менеджменту ў сферы культуры. Менавіта ад нестандартных хадоў і прыёмаў, акцэнту на цікавых адметнасцях таго або іншага мерапрыемства, ад яркага ўвасаблення брэндавага прадукту і залежыць тое, ці зможа культура развівацца ў рынначных умовах.

Сёння шэраг знакавых ды іміджавых устаноў культуры — такія, як Нацыянальны мастацкі музей ці Замкавы комплекс "Мір", — узаемадзейнічае са спецыялістамі ў сферы менеджменту. Рэгіянальная культура толькі пачынае рабіць першыя крокі ў гэтым кірунку. Пра тое, куды рухацца і што рабіць у першую чаргу, карэспандэнт "К" пагутарыў з дацэнтам кафедры менеджменту сацыяльна-культурнай дзейнасці БДУКіМ Таццянай КАРНАЖЫЦКАЙ.

Ідэя — Падзея

— На мой погляд, існаванне культуры ў рынначных умовах — працэс навучальны. І сённяшняя сітуацыя дазваляе выказаць такую, на першы погляд, даволі "крамольную" думку: культура можа зарабляць. Кажучы словамі Пушкіна, натхненне не прадаецца, але можна рукапіс прадаць.

І гэта цалкам лагічна, бо калі ствараецца арыгінальны культурны, якасны і паспяховы прадукт, дык яго, зразумела, можна і нават трэба прадаваць. Але ж прадаваць трэба навучыцца. На жаль, ідэя "культуры на продаж" у рэгіёнах пакуль не атрымала належнага развіцця. Хаця цікавыя прыклады, натуральна, магу адзначыць. Вось на Магілёўшчыне, у вёсцы Вяззе, зладзілі мерапрыемства пад назвай "Гарбузяны рай". Пад час дзеі адбыўся не толькі канцэрт, але і выстаўка гарбузовай скульптуры, продаж страў з гарбузоў, разнастайныя конкурсы, а напрыканцы вечара зладзілі танцы пад адкрытым небам. Чым не паспяховы прыклад менеджменту ў дзеянні? Менавіта так — праз шматлікасць мерапрыемстваў, заключаных у адной культурнай акцыі, — і можна прыцягнуць увагу гледачоў ды наведвальнікаў, стварыўшы, напрыклад, з шараговага Дня вескі запамінальную падзею…

"Паркан" для сяброў

— Практыка менеджменту ў культуры паспяхова рэалізуецца ва ўсім свеце. І сучаснае культурнае мерапрыемства — гэта не проста звычайны канцэрт, дыскатэка або вечарына. Гэта, паўтаруся, — Падзея. Натуральна, каб мерапрыемства запомнілася, трэба пастарацца: наладзіць камунікацыю з рознымі мэтавымі групамі, стварыць пазітыўны настрой у гледачоў праз уцягванне іх у дзею, што адбываецца на сцэне, для таго, каб людзі не пасіўна, а актыўна ўдзельнічалі ў мерапрыемстве… Галоўнае — зрабіць так, каб глядач (ці, можна нават сказаць, кліент) захацеў прыйсці на мерапрыемства паўторна. І гэта будзе натуральна, а не прымусова толькі пры той умове, калі культработнікі змогуць падарыць наведвальнікам добры настрой.

Памятаеце гісторыю пра Тома Сойера, пра тое, як ён "прымусіў" пафарбаваць паркан усіх сваіх сяброў? Гэты прынцып можна ўзяць на ўзбраенне і культработнікам: зацікавіць сваёй дзейнасцю настолькі, каб людзі ўключыліся ў гульню, у мерапрыемства і, фактычна, самастойна яго зладзілі. Але гэта магчыма толькі тады, калі культработнікі будуць перакананы ў тым, што іх прафесія — самая лепшая ў свеце. А менавіта так яно і ёсць насамрэч. Бо хто яшчэ дорыць людзям столькі радасці?..

"Раскруціць" сябе ды іншых

— Ад мэтавай аўдыторыі лагічна перайсці да такой вядомай у эканоміцы з'явы, як тэорыя попыту і прапановы. Каб сфарміраваць попыт на культурнае мерапрыемства, трэба актыўна выкарыстоўваць усе магчымасці рэкламы, піяру сваіх акцый — як цяперашніх, так і будучых. Але трэба не толькі актыўна задзейнічаць рэкламу, але і думаць над яе зместам, псіхалагічным пасылам, камунікацыйнымі магчымасцямі… Толькі калі людзі будуць "загружаны" такой рэкламай, якая адпавядае іхнім зацікаўленасцям, яны абавязкова прыйдуць на канцэрт, вечар ці дыскатэку.

Без раскруткі "не прагучыць" ніводнае, нават самае цікавае мерапрыемства. Памятаю, колькі гадоў таму сталічныя ўлады запрасілі выступіць у Мінску на Свяце горада Лонданскі сімфанічны аркетстр. І, як заўсёды ў нас бывае, далі разнарадку па ўніверсітэтах: прыйсці на канцэрт гэўнай колькасці чалавек. Студэнты пасля скардзіліся мне, што прысутнічалі на канцэрце аркестра, пра які раней нічога не ведалі і не чулі, таму ім было там не вельмі цікава. Я ж была здзіўлена гэтымі "скаргамі": на канцэрты Лонданскага аркестра ў свеце выстройваюцца чэргі да касаў! А ў нас, як бачыце, усё атрымалася наадварот, бо студэнты не змаглі ацаніць унікальнасць гэтага канцэрта... Таму рэклама культурных мерапрыемстваў павінна быць на вышыні…

Гандальер на Сожы

— Мяркую, адна з найлепшых формаў прэзентацыі мерапрыемства — правядзенне яго ў незвычайных умовах. Напрыклад, пад адкрытым небам. Варта адзначыць, што фармат open-air пачаў у нас актыўна выкарыстоўвацца: згадайма хоць бы вечары ў Мірскім і Нясвіжскім замках. І гэта вельмі добра, бо людзей, як вядома, прыцягвае незвычайнае ды арыгінальнае.

Я ведаю, што ў Германіі ладзяць канцэрты і пастаноўкі ў пячорах, і падобныя акцыі карыстаюцца вялікім попытам. А згадайце спевы, якія выконваюць гандальеры ў Венецыі, а таксама жыхары В'етнама ў сваіх лодках… Таму і ў Беларусі можна прыдумаць нешта падобнае: палескія рыбакі на Прыпяці ці Сожы таксама спяваюць нейкія адмысловыя песні, выпраўляючыся на рыбалку…

Таму, як мне падаецца, музычныя вечары пад адкрытым небам — гэта, насамрэч, толькі пачатак. Можна, напрыклад, зладзіць фаер-шоу на вадзе, як, дарэчы, ужо і робяць у некаторых рэгіёнах нашай краіны, можна прыдумаць і паставіць тэатральную імпрэзу ды многае іншае...

Усе — у сад

— І яшчэ колькі слоў пра незвычайныя месцы. Часта ў холах дамоў культуры можна сустрэць выстаўку малюнкаў ці фотаздымкаў. Усё гэта добра. Але чаму б не зладзіць тую выстаўку за межамі РДК ці СДК: на вуліцы, у кафэ ці нават у цырульні? Гэта, натуральна, прыцягне цікавасць усіх жыхароў мястэчка ці паселішча да гэтай акцыі, зробіць культурнае мерапрыемства больш маштабным і запамінальным...

У адным з гарадоў Ізраіля для прыцягнення турыстаў выстаўляюць арыгіналы карцін вядомых мастакоў. Чаму б не зрабіць гэта ў тым або іншым горадзе Беларусі? У Санкт-Пецярбургу, дарэчы, ужо таксама гэта практыкуюць, праўда, пакуль выстаўляюць копіі карцін, а не арыгіналы. Але аматараў паглядзець на творы жывапісу ўсё адно хапае. Таму культработнікам варта паразважаць над тым, як эстэтызаваць наваколле.

Вось у сталіцы Беларусі зладзілі арт-праект "Zabor". І гэта якраз тое, што трэба. У нас яшчэ шмат магчымасцей у такім кірунку. Варта было б развіваць гарадское графіці, спрабаваць праводзіць разнастайныя вулічныя акцыі. Цікавы ў гэтым плане праект "Спяём гімн Беларусі разам!". Чаму б не прадоўжыць яго ў іншых ракурсах: выканаць разам вядомыя народныя песні ці нешта з рэпертуару "Песняроў"? Альбо можна зладзіць цэлы праект па святах, якія адзначаюцца ў Беларусі. Напрыклад, чаму б не праспяваць сумесна на Раждаство Хрыстова калядныя песні, а ваенныя — у Дзень Перамогі?..

Кабалье ведала, што рабіла

— Праблемы ёсць і з нашымі сувенірамі. У Кітаі ці Індыі гэта цэлая індустрыя, што абапіраецца на нацыянальныя традыцыі. Мы ж толькі пачынаем рухацца ў дадзеным кірунку, бо нам яшчэ трэба зрабіць нацыянальныя сувенірныя брэнды, беларускія адметныя "фішкі". І гэта не толькі магніцікі на халадзільнік, якія ёсць у кожным горадзе і краіне. Трэба выдумляць нешта сваё, не рабіць тое, што зрабіў сусед.

Напрыклад, Манэрат Кабалье стала знакамітай пасля таго, як пачала спяваць малавядомыя ці зусім невядомыя музычныя кампазіцыі. Так і нам трэба зрабіць: прапаноўваць нешта адметнае, нешараговае, але — сваё, магчыма, не надта і вядомае ў іншым свеце. І поспех не прымусіць сябе чакаць. Прыкладам, лацінаамерыканскія танцы таксама калісьці былі вядомыя толькі спецыялістам, а цяпер іх ведаюць ва ўсім свеце. Дык чаму б і нам не паспрабаваць свае сілы на гэтым шляху, не прапагандаваць сваю танцавальную культуру для замежных гасцей? Праўда, спачатку яе трэба вывучыць самім беларусам…

Крэатыўнасць — у крыві

— А ўвогуле, калі казаць пра нашу адметнасць, дык гэта не балоты ці лясы, а тое, што ў нашай краіне, на перакрыжаванні шляхоў з Захаду і Усходу, сфарміраваўся ўнікальны творчы "кангламерат". Узгадаем, да прыкладу, таго ж Уладзіміра Мулявіна і "Песняроў", інтэрнацыянальны хор з медуніверсітэта ды многае іншае. Да таго ж, у нас багатая ўнікальная оперная, выканальніцкая, тэатральная школы, знакамітыя фальклорныя калектывы… Усё гэта варта падаваць як мага цікавей ды пазіцыянаваць Беларусь менавіта праз здабыткі культурнай сферы. І тое цалкам магчыма. Тым больш, наша прырода, тэрыторыя ствараюць унікальныя магчымасці для адораных людзей. А Беларусь — гэта тое месца, якое злучае розныя культурныя традыцыі ў зусім новым, адметным ракурсе. І, як я лічу, у крыві беларусаў генетычна закладзена крэатыўнасць. Таму стварыць нешта новае нам не так і складана…

Эксперымент як свята

— Лічу, навучыць культработнікаў менеджменту магчыма. Але гэта павінна быць не навучанне гэўным алгарытмам: маўляў, трэба рабіць вось так, а не іначай. Гаворка пра іншае: культработнікам варта прывіваць асэнсаванае ўспрыняцце адказнасці за светапогляд людзей. Але самае галоўнае, каб самі спецыялісты, якія працуюць у сферы культуры, радаваліся жыццю, мелі пазітыўны настрой, былі цікавымі ды крэатыўнымі. А таксама — смелымі. Бо, пагадзіцеся, каб быць незвычайнымі, каб быць выдумшчыкамі і першапраходцамі, трэба не баяцца эксперыментаваць і, канешне ж, спрабаваць, спрабаваць, спрабаваць. Гэта і ёсць галоўная тэхналогія менеджменту.

І яшчэ. Менеджмент у сферы культуры павінен мець сваю нацыянальную пазіцыю, сугучную дзяржаўнай ідэалогіі і культурнай палітыцы. Нам ёсць чым падзяліцца са светам, і мы, натуральна, цікавыя замежнікам менавіта адметнасцямі. Пра гэта не трэба забывацца, каб з поспехам усюды дэманстраваць канкурэнтныя магчымасці айчыннай культуры…

Занатаваў Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ

Рэйтынг ідэй з інтэрнэт-прасторы

1. Электронная пошта

Біл Гейтс казаў: "Той, хто ў дасканаласці авалодае электроннай поштай, будзе мільянерам у дваццаць першым стагоддзі". Мы толькі пачынаем жыць у гэтым дзіўным XXI стагоддзі. Хто ведае, можа, так і будзе…

2. Он-лайн-семінар

Он-лайн-семінар (вэб-канферэнцыя, вебінар — ад англійскага "webinar") — разнавіднасць вэб-канферэнцыі, правядзенне он-лайн-сустрэч або прэзентацый праз Інтэрнэт у рэжыме рэальнага часу. Пад час такой канферэнцыі кожны з яе ўдзельнікаў знаходзіцца ля свайго камп'ютара, а сувязь паміж імі падтрымліваецца праз Інтэрнэт пры дапамозе папярэдне загружанага дадатку або праз вэб-сэрвіс. У апошнім выпадку, каб далучыцца да канферэнцыі, трэба проста ўвесці адрас сайта ў акне браўзэра.

Так, нешта накшталт Skype, толькі размова — не са сваякамі. Летась, дарэчы, абласное кіраўніцтва актыўна выкарыстоўвала форму відэаканферэнцый у зале пасяджэнняў. Уяўляеце, відэазванок з Міністэрства — на ваша рабочае месца?!

3. Старонка ўстановы ў Сеціве

І яшчэ адна цытата з Біла Гейтса: "У будучыні на рынку застанецца два віды кампаній: тыя, хто ў Інтэрнэце, і тыя, хто выйшаў з бізнесу".

Усе аддзелы культуры маюць разделы на афіцыйных сайтах мясцовых выканаўчых камітэтаў. Некаторыя ствараюць афіцыйныя сайты, але гэта патрабуе дадатковых фінансавых сродкаў і спецыяльных навыкаў.

Ёсць і яшчэ варыянты. Сацыяльныя сеткі — што гэта? Пытанне падштурхнула мяне зарэгістравацца ў "Аднакласніках" і "Фэйсбуку". Праз нейкі час стала зразумела, што іх можна выкарыстоўваць, без дадатковай аплаты, для рэкламы дзейнасці сваіх устаноў. Больш зручным, на маю думку, з'яўляецца "Фэйсбук".

Піяр пры дапамозе "лайкаў"

Валянціна СУЛАЎКА, галоўны спецыяліст аддзела культуры Бераставіцкага райвыканкама Гродзенскай вобласці

"Інтэрнэт — гэта джунглі, і часам ён нагадвае звалку інфармацыі са смецця. Але часам у ім можна знайсці сапраўдныя перліны". Так напісаў сучасны польскі пісьменнік Януш Вішнеўскі. Чым жа рэальна можа дапамагчы Сеціва кожнай установе культуры?

На сёння яго аўдыторыя складае мільярд карыстальнікаў. Каля 500 мільёнаў чалавек выкарыстоўваюць штомесяц мабільны дадатак Facebook. Кожны дзень у сацыяльнай сетцы карыстальнікі пакідаюць 3,2 мільярда "лайкаў" і каментарыяў, публікуюць 300 мільёнаў фатаграфій. Рэкамендую і нашу старонку!

4. Аўдыягід

У раёне пабудаваны музей, які мае прыгожую назву: "Музей Вавёркі ў Вялікай Бераставіцы". "К" пра яго пісала колькі нумароў таму. Перад намі пастаўлена задача стварыць экспазіцыю музея XXI стагоддзя…

А як жа абысціся без аўдыягіда? Звычайна ён складаецца з некалькіх аўдыяфрагментаў. Яны нумаруюцца і прывязваюцца да схемы (карты) мясцовасці, музея, альбо да нумароў экспанатаў. Калі аўдыягід прапаноўвае складаны і завершаны аповед з фрагментаў, то яго таксама называюць аўдыяэкскурсіяй. Аўдыягіды шырока распаўсюджаны за мяжой, ствараюцца як музеямі, так і незалежнымі распрацоўшчыкамі. Вялікую перспектыву маюць аудыягіды, што выкарыстоўваюць тэхналогіі GPS і RFID, аўтаматычна вызначаюць становішча слухача ці аб'ект, якім ён цікавіцца, і прайграюць неабходны фрагмент.

На маю думку, ідэя — цікавая.

5. Электронная бібліятэка і рыдэры

Усё, што звязана з кнігай і бібліятэкай, цікавіць мяне, прафесійнага бібліятэкара, заўсёды. Усё большае распаўсюджванне электронных носьбітаў інфармацыі, зручнасць яе атрымання — рэаліі часу. Будучыня — за электроннымі кнігамі ды інтэрнэт-рэсурсамі. Справа ў тым, што дзеці і моладзь чытаюць не менш за дарослых, але яны чытаюць лічбавыя кнігі. І трэба навучыцца паважаць іх выбар…

У 2013 годзе ў штаце Тэхас будзе адкрыта першая грамадская лічбавая бібліятэка. Для таго горада гэта не стане заменай бібліятэчнай сістэмы. Улады плануюць эканоміць грошы на выкарыстанні будынкаў. Ужо падлічана, што выдаткі на адкрыццё электроннай бібліятэкі складуць каля 250 тысяч долараў для забеспячэння першых 10 тысяч назваў. Патэнцыял эканоміі ад лічбавых бібліятэк — гэта доўгатэрміновая перспектыва.

Беражыце кнігі, выдадзеныя на паперы!..

На здымку: Валянціна Сулаўка на І Фестывалі польскай культуры і быту "Эйсмантаўскі фэст" у час выстаўкі майстроў Бераставіцкага РДР.

Топ-5 брэндаў Быхаўшчыны

Сёлета ў першую нядзелю верасня Дзень беларускага пісьменства прыме Быхаў. Разам з ганаровай місіяй горад можа прыняць і вялікае мноства турыстаў. Але ці багаты Быхаў на цікавыя гістарычныя аб'екты? Адказаць на гэтае пытанне дапамаглі супрацоўнікі мясцовага краязнаўчага музея, якія склалі свой топ-5 брэндавых аб'ектаў раёна ў кантэксце культуры.

Баркалабава плюс экзоты

1. Быхаўскі замак. Ці не галоўнай архітэктурнай перлінай Быхава з'яўляецца яго старадаўні замак, што існуе з XVI стагоддзя. Ён быў пабудаваны на правым беразе Дняпра і да 1590 года меў драўляна-земляныя ўмацаванні. Напрыканцы XVI стагоддзя кароль Жыгімонт Аўгуст падарыў замак Яну Каралю Хадкевічу, які з тых часоў пачаў называцца "графам на Быхаве, Шклове і Мышы". Гетман Вялікага Княства Літоўскага Хадкевіч у 1590 — 1619 гг. арганізаваў маштабныя работы па ўмацаванні горада: быў пабудаваны новы каменны замак, выкапаны равы, умацаваны сцены. Гэта зрабіла Быхаў адной з наймацнейшых цытадэлей ВКЛ. Пры Льву Сапегу, да якога горад адышоў у 1621 г., замак значна перабудавалі. У склад замкавых умацаванняў увайшлі, акрамя палаца, жылыя і гаспадарчыя каменныя будынкі. На жаль, з часам Быхаўскі замак страціў сваё стратэгічнае значэнне і прыйшоў у заняпад. У 70-х гадах XIX стагоддзя яго выкарыстоўвалі як турму, а затым — як казармы. У цяперашні час захаваліся толькі фрагменты замка, які зараз пачаў аднаўляцца.

Быхаўскі замак. Пачатак XX ст.

2. Палацава-паркавы комплекс былой сядзібы ў вёсцы Грудзінаўка. За 33 кіламетры ад Быхава знаходзіцца вёска Грудзінаўка. Доўгі час мясцовасць з'яўлялася ўласнасцю Хадкевічаў і Сапегаў, а ў 1772 г., пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай, адышла да Расійскай імперыі. Кацярына II падарыла вёску з прыгоннымі сялянамі графу Дзмітрыю Талстому, магілёўскаму губернатару. У справаздачах за 1804 — 1823 гг. гаворыцца, што ў маёнтку Грудзінаўка працуюць выдатны племянны конны завод і мануфактурная фабрыка. Пасля смерці Дзмітрыя Паўлавіча гаспадыняй сядзібы стала яго ўдава Аляксандра Рыгораўна. Пры ёй сядзіба ўражвала сваёй уладкаванасцю. У маёнтку была нават аранжарэя, дзе раслі персікі. На пачатку XX ст. у парку на ўзгорку быў пабудаваны каменны палац — двухпавярховы будынак з паўкруглай верандай, што падтрымліваецца шасцю калонамі, выкананымі ў тасканскім ордэры. У дэкаратыўным афармленні фасадаў выкарыстаны элементы класіцызму.

Царква ў Баркалабаве.

3. Баркалабаўская ікона Божай Маці. Святой апякункай Быхаўскай зямлі лічыцца ікона Баркалабаўскай Божай Маці — адзін з нешматлікіх цудатворных абразоў, якія захаваліся ў арыгінале. Паводле падання, у 1650-х гадах, пад час ваенных дзеянняў на тэрыторыі Вялікага Княства Літоўскага, абраз быў узяты рускім войскам у адным з беларускіх храмаў і знаходзіўся ў князя Пажарскага. Калі войска князя ў 1659 г. падышло да сцен Баркалабаўскага манастыра, абоз, у якім знаходзілася ікона, нерухома стаў, і коні, нягледзячы на намаганні, не маглі крануцца з месца. Было вырашана пакінуць ікону ў манастыры, дзе яна і знаходзілася да 1-й паловы XX ст. У 2010-м ікона была ўрачыста перанесена ў храм Іаана Прадцечы адроджанага Баркалабаўскага жаночага манастыра. Акрамя таго, таксама ў Баркалабава, што ў XVI — XVII стст. з'яўлялася культурным і рэлігійным цэнтрам, быў створаны помнік пісьменства — "Баркалабаўскі летапіс". Ён пачынаецца паведамленнем пра Берасцейскі сойм 1544 г., на якім кароль Жыгімонт I прызначыў пераемнікам на княжацкі трон свайго сына Жыгімонта II Аўгуста.

4. Вышыня Герояў. Перад пачаткам Беларускай наступальнай аперацыі "Баграціён" 556-у стралковаму палку 169-й стралковай дывізіі была пастаўлена баявая задача: на стыку 1-га і 2-га беларускіх франтоў штурмам авалодаць пазіцыяй каля вёскі Лудчыцы і адцягнуць на сябе як мага больш тэхнікі ворага. Жорсткі бой вялі нашы воіны на подступах да Быхава. На досвітку 24 чэрвеня 1944 г. вышыня была ўзята. Тым не менш, на працягу дня воіны палка адбілі звыш 20 жорсткіх фашысцкіх нападаў. Мемарыял Вайсковай Славы быў адкрыты да 40-годдзя вызвалення Быхаўскага раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў у чэрвені 1984-га каля вёскі Лудчыцы.

5. Сінагога ў Быхаве. Гэты аб'ект з'яўляецца помнікам архітэктуры XVII ст. Больш за тое: згаданая сінагога — найбольш ранняя з усіх існуючых на тэрыторыі Беларусі. Дакументальна засведчана існаванне яўрэйскай абшчыны ў Быхаве ў 2-й палове 20-х гадоў XVII ст. Дазвол на пабудову ў Быхаве сінагогі даў уладальнік горада Антоній Сапега. Прычынай, што падштурхнула магната выдаць такі дазвол, была яго вялікая запазычанасць мясцоваму яўрэйскаму купецтву.

Будынак сінагогі ўяўляе амаль квадратную форму, завершаную чатырохсхілавым дахам. Абарончы характар будынку надавалі тоўстыя сцены, размешчаныя высока над зямлёй вокны, бакавая вежа. Пад час Вялікай Айчыннай будынак быў пашкоджаны. У першыя пасляваенныя гады ён выкарыстоўваўся для патрэб арміі, затым ператварыўся ў склад, а сёння знаходзіцца ў занядбаным стане…

УВАГА!

Дабрачынны рахунак на аднаўленне Быхаўскага замка № 364 204 579 4327 ЦБП № 706 філіял № 700 Магілёўскага абласнога ўпраўлення ААТ "ААБ "Беларусбанк". МФА 153.801.536; УНП 700085055. Плацяжы: г. Быхаў, вул. Леніна, д. 54, Аддзел культуры Быхаўскага райвыканкама.

На вуліцы Каліноўскага

Данінай памяці Кастусю Каліноўскаму стала адкрыццё мастацкай выстаўкі "Радзіма вышэй за ўсё" ў сценах Інстытута культуры Беларусі, прысвечанай 175-годдзю з дня нараджэння нацыянальнага дзеяча, а таксама 150-й гадавіне паўстання 1863 — 1864 гадоў. Сімвалічна, што сёння Інстытут размяшчаецца па вуліцы, названай у гонар гэтай славутай асобы.

Варта адзначыць, ушанаванне народных герояў пачалося адразу пасля паўстання. Сведчаннем гэтаму — драўляная капліца Памяці каля дома Францішка Багушэвіча, а таксама жывапіс Міхала Андрыёлі, Альфрэда Ромеля.

Нашы сучаснікі таксама далучыліся да ўшанавання памяці змагароў. У прыватнасці, над вобразам Каліноўскага працавалі народныя мастакі З. Азгур, Л. Шчамялёў, А. Кашкурэвіч, многія іншыя творцы. Шэраг работ гэтых майстроў і прадстаўлены ў рамках выстаўкі ў фае Інстытута культуры. Як адзначылі яе стваральнікі, у мастацкі праект уключаны лепшыя творы за апошнія дзесяцігоддзі, прысвечаныя гэтай тэматыцы.

Супрацоўнік Інстытута культуры Беларусі, доктар філалагічных навук Адам Мальдзіс зазначыў: большасць тых, хто пачынаў новую беларускую літаратуру, былі паслядоўнікамі Каліноўскага. Гэта і Вінцэнт Дунін-Марцінкевіч, і Францішак Багушэвіч, і Арцём Вярыга-Дарэўскі, і Альгерд Абуховіч.

Яшчэ адным сімвалічным аспектам выстаўкі стаў удзел у адкрыцці праекта гурта "Тутэйшая шляхта". Менавіта гэткі статус, па словах А. Мальдзіса, характэрны і для роду К. Каліноўскага, паколькі ў той час назва "Беларусь" яшчэ не была пашырана на нашых землях.

Адметна, што гадавіна будзе адзначацца не толькі ў нашай краіне, але і за яе межамі. Так, імпрэзы з удзелам вучоных-беларусістаў гэтымі днямі праходзяць у Маскве і Санкт-Пецярбургу, у Вільнюсе і Беластоку.

(Закачэнне. Пачатак у №№ 2, 3, 5.)

…Гаворка ідзе аб праекце варшаўскай Філармоніі, які распрацоўваўся практычна адначасова з пабудовай тэатра ў Мінску. Досвед будаўніцтва тэатраў, любоў да музыкі (архітэктар складаў мазуркі і вальсы), захапленне жывапісам (ён уваходзіў у супольнасць "Салон мастакоў") стварылі Казлоўскаму рэпутацыю спецыяліста грамадзянскай архітэктуры для відовішчных мэт.

Сага пра Тэатр

Пра тое, як узводзілі знакаміты будынак

Але ён марыў пра большае: слава Гранд-опера Шарля Гарнье не давала яму спакою. Будынак парыжскай Оперы, якую будавалі пятнаццаць гадоў і завяршылі ў 1874-м, быў прызнаны эталонам раскошы. Казлоўскі хацеў даць Варшаве "польскую Гранд-опера" — Палац музыкі. І гэта яму ўдалося ажыццявіць! Услед за мінскім тэатрам ён праектуе неабарочны будынак Філармоніі ў Варшаве — як перайманне парыжскай Гранд-опера.

Тая Філармонія стала лепшым тварэннем архітэктара, гонарам перадваеннай сталіцы Польшчы. Яна была пабудавана ў рэкордна кароткі тэрмін: усяго за паўтара года. Будаўніцтва пачалося ў маі 1900-га, а першы канцэрт адбыўся ў лістападзе 1901-га. Архітэктар спяшаўся: тады ён ужо хварэў… У будынку спалучыліся рысы эклектыкі і нацыянальнага рамантызму, прадыктаванага густамі заказчыкаў і фундатараў — польскіх мецэнатаў — князя Стэфана Любамірскага, барона Леапольда Кроненберга, графа Замойскага і графа Уладзіслава Тышкевіча. Для роспісу плафонаў быў запрошаны самы знакаміты мастак тагачаснай Польшчы — Генрых Семірадскі.

Філармонія здзіўляла сучаснікаў пышнасцю дэталей і памерамі (чаго вартая канцэртная зала на 2 000 месцаў!). Пры пэўным падабенстве з парыжскай Гранд-опера, архітэктар імкнуўся надаць ёй нацыянальны польскі дух. Напрыклад, гардэроб быў дакладнай копіяй параднай залы замка ў Мальбарку. Інтэр'ер глядзельнай залы — вырашаны ў багатай вішнёва-залатой гаме. На трох плафонах столі былі роспісы, сярод якіх асабліва вылучаўся адзін: з выявай Апалона, што дырыжыруе хорам муз і іншых міфалагічных персанажаў. Семірадскі (верагодна, са згоды архітэктара) зрабіў арыгінальны, нават дзёрзкі ход, парушаючы ўсе правілы манументальнага мастацтва: намаляваў мастака (ці не сябе?), што стварае сцэну выхаду Апалона і... партрэт архітэктара Казлоўскага. Побач з аголеным фаўнам на столі гледачы са здзіўленнем заўважалі мужчыну з бародкай, які сядзеў апрануты ў фрак з вытанчаным каўнерыкам ды папіхваў воблака лакаванымі чаравікамі. Не звяртаючы ўвагі на Апалона і яго хор, ён пазіраў уніз, проста на гледачоў у зале. Гэта і быў партрэт Караля Казлоўскага — апошні падарунак сябру і калегу ад Генрыха Семірадскага…

Казлоўскі пайшоў з жыцця праз паўгода пасля заканчэння будаўніцтва Філармоніі — 21 чэрвеня 1902-га ў Карлсбадзе. Месяцам жа раней у сваім маёнтку пад Чэнстаховам скануў і Генрых Семірадскі.

Калі "ўся Варшава" праводзіла ў апошні шлях Караля Казлоўскага, жалобны картэж спыніўся ля будынка Філармоніі. Музыканты выйшлі на балкон і ў памяць архітэктара выканалі Марш Шапэна, развітваючыся з будаўніком абіцелі музыкі, дзе пасля выступала ўся сусветная музычная эліта…

Але слава, асабліва прыжыццёвая, — падманлівая і недаўгавечная. Казлоўскі будаваў напярэдадні дзвюх сусветных войнаў. Ад яго багатай спадчыны засталося ўсяго чатырыпяць будынкаў. У верасні 1939-га пры бамбёжках Варшавы быў знішчаны "Артыстычны тэатр" у Кракаўскім прадмесці, узведзены ў 1898 годзе. У купал Варшаўскай філармоніі патрапіла бомба, знішчыўшы роспісы, а варшаўскае паўстанне 1944-га завяршыла справу: будынак разваліўся і не быў адноўлены ў ранейшым выглядзе ў эпоху ПНР з-за сваёй "буржуазнасці".

Казлоўскі, па прызнанні гісторыкаў архітэктуры, амаль цалкам забыты цяпер у Польшчы, не кажучы ўжо пра Беларусь, дзе яго ведалі па адзінай пабудове гарадскога тэатра ў Мінску.

Фасад тэатра добра дакументаваны на мноства фатаграфій, і аднавіць яго не склала вялікай працы. Інтэр'еры глядзельнай залы і рэкрэацыя аднаўляліся па чарцяжах Казлоўскага ды іх аналагах. На жаль, не быў знойдзены асабісты архіў В.Ф. Мааса, пад чыім кіраўніцтвам праходзіла распрацоўка мастацкага афармлення тэатра. Як мяркуецца, дакументы Мааса знаходзяцца ў Каўнасе, дзе гэты архітэктар правёў апошнія гады жыцця.

Рэканструкцыя фасада гарадскога тэатра ў Мінску згодна з аўтарскім праектам Караля Казлоўскага стала прыкладам аднаўлення гістарычнай справядлівасці і захаванням памяці пра архітэктара, ад тварэнняў якога засталося так мала. У знак павагі да аўтара і прызнання яго заслуг яго скульптурны бюст устаноўлены ў пабудаваным ім касцёле ў польскім горадзе Сасноўцы. Копія гэтага бюста з часам можа ўпрыгожыць абноўлены інтэр'ер Купалаўскага тэатра…

Надзея УСАВА,
намеснік генеральнага дырэктара
Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь

Невядомы факт

У час будаўніцтва тэатра Караль Казлоўскі запрасіў да сябе лепшага ў Мінску каваля Хацкевіча (прадзеда нашага беларускага мастака-манументаліста Віктара Хацкевіча) і разам з віцэ-губернатарам горада М.Дараганам заказаў яму каваную франтальную агароджу вакол Александрыйскага сквера, у паўднёвай частцы якога якраз будаваўся тэатр. Каваль абгарадзіў прыгожай рашоткай сквер па баках вуліц Падгорная (цяпер — вуліца К.Маркса), Захар'еўская (цяпер – праспект Незалежнасці), Скобелеўская (цяпер — вуліца Чырвонаармейская) і Дамініканская (цяпер — вуліца Энгельса). Побач была царква Аляксандра Неўскага з невялікай капліцай (зараз там Дом афіцэраў). Захаваліся фотаздымкі таго часу, дзе выяўлены і летні сквер з тымі самымі рашоткамі, і людзі, якія шпацыруюць каля ўваходу ў сквер, і цэрквы... Лёс рашотак — невядомы: па адной з версій, іх вывезлі з Мінска гітлераўцы ў гады фашысцкай акупацыі…

Б.К.

Акім Міхайлавіч Шаўчэнка (1902 — 1980 гг.)... Таленавіты беларускі жывапісец (не блытаць з яго педагогам, рускім мастаком Аляксандрам Шаўчэнкам). Выхаванец ВХУТЕМАСа і Ленінградскага інстытута пралетарскага мастацтва, вучань С.Герасімава, А.Дрэвіна і Д.Штэрэнберга. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, ардэнаносец. Пасля адкрыцця Мінскага мастацкага вучылішча ў 1947-м цягам дванаццаці гадоў выкладаў у ім. Сярод яго вучняў — М.Савіцкі, М.Чэпік, В.Грамыка, М.Данцыг, В.Шаранговіч, Г.Паплаўскі, Л.Дударэнка, І.Стасевіч, У.Уродніч, М.Казакевіч...

Акім Шаўчэнка.

Вялікі рукапіс мастака, які так поўна друкуецца ўпершыню

"Свае ўспаміны напішу Вам у лісце..."

У свой час Шаўчэнка як жывапісец быў "на слыху" мастацкай грамадскасці і карыстаўся вялікім аўтарытэтам сярод студэнцтва. А яго карціна "Плытагоны" (1932 г.) на Першай Дэкадзе беларускага мастацтва і літаратуры ў Маскве ў 1940-м была прызнана адной з лепшых сярод іншых палотнаў савецкіх мастакоў і па праве ўвайшла ў "залаты фонд" беларускай выяўленчай культуры.

За паўстагоддзя творчага жыцця Акім Міхайлавіч пакінуў пасля сябе не толькі дзясяткі вучняў, але і значную мастацкую спадчыну. Ягоныя карціны "Вяжуць снапы", "Тынкоўшчыцы", "На торфараспрацоўках", "Лес — будоўлям", "Горад абнаўляецца", "У саўгасе "Брылёва", "У Дзень Перамогі", "Вячэрні Мінск", "Аб гераічным мінулым", цыкл фігуратыўных палотнаў пра Янку Купалу і Якуба Коласа, вострапсіхалагічныя партрэты, маляўнічыя нацюрморты і светлыя лірычныя пейзажы калісьці з поспехам экспанаваліся на розных рэспубліканскіх і ўсесаюзных выстаўках.

З дня смерці Акіма Шаўчэнкі прайшло не так шмат: трохі больш за трыццаць гадоў. Але, на жаль, ягонае імя сёння ўжо мала хто ведае. Нават студэнтам Беларускай дзяржаўнай акадэміі мастацтваў, не кажучы пра шараговага гледача, яно мала што кажа. Ну, хтосьці з больш-менш пісьменных і дапытлівых можа ўспомніць толькі тых самых "Плытагонаў", якія ўпрыгожваюць пастаянную экспазіцыю нашага Нацыянальнага мастацкага музея. Часам добрым словам у кулуарах узгадваюць пра Акіма Міхайлавіча і яго малодшыя сучаснікі, што яго ведалі, і вучні, якіх, праўда, становіцца ўсё менш і менш: час не спыніць, смерць — таксама…

Мне пашанцавала: я вельмі добра ведаў гэтага цудоўнага жывапісца-каларыста, які, мне здаецца, з-за сваёй унікальнай сціпласці не атрымаў ніякага ганаровага звання. Я ж ведаў, як іншым разам такія званні тады, у 1960 — 70-я, здабываліся. Для гэтага трэба было мець не толькі хоць крыху таленту, але і моцныя сувязі, і ўменне грудзьмі пракласці сабе дарогу ў калідоры Саўміна і ЦК КПБ… Добры, чалавечны, сардэчны, мяккі па натуры Шаўчэнка меў талент ад Бога, але ўсё астатняе ў сэнсе "прабівальнасці" ў яго адсутнічала… Вось у 2002-м споўнілася 100 гадоў з дня яго нараджэння (а ў мінулым — 110), але хто, акрамя гамяльчан, успомніў пра гэта? Можна ж было арганізаваць яго персанальную выстаўку, каб не толькі паказваць дзве-тры работы жывапісца ў кантэксце вялікіх калектыўных экспазіцый. Можа, прыйшоў час яшчэ раз успомніць імя А.М. Шаўчэнкі, вярнуць яго, шчырага чалавека і дзіўнага каларыста, на тое месца, якое ён па праве заслужыў сваёй біяграфіяй ды творчасцю?..

І вось аднойчы, за дзевяць гадоў да яго смерці, у 1971-м, я звярнуўся да Акіма Міхайлавіча з просьбай распавесці ці напісаць "пра час і пра сябе", у прыватнасці — пра гомельскі і маскоўскі перыяды яго паслярэвалюцыйнага мастацкага жыцця, якія тады былі "белай плямай" у нашым мастацтвазнаўстве. Як вядома, першае дзесяцігоддзе пасля Кастрычніка — гэта час суіснавання, сутыкнення і барацьбы розных кірункаў у мастацтве: ад радыкальнага авангарда да рэалізму ў духу перадзвіжнікаў. Да гэтых гадоў адносіцца і ажыўленне мастацкага жыцця ў Гомелі, звязанае перш за ўсё з такімі імёнамі, як Георгій Ніскі, Сяргей Каўроўскі, Аляксандр Быхоўскі, Алена Машкоўцава (Самойленка), Леў Смехаў, Афанасій Сазонаў, Канстанцін Малец і, канешне ж, Акім Шаўчэнка. Гэта значыць, перыяд — тады амаль невядомы для даследчыкаў.

А.Шаўчэнка. "Плытагоны". 1932 г.

На маю прапанову Акім Міхайлавіч, падумаўшы, сказаў, што лепш у спакойнай хатняй абстаноўцы напіша мне пра ўсё гэта. І, сапраўды, праз нейкі час ён запрасіў мяне ў сваю майстэрню па вуліцы Чычэрына і падарыў вялікі рукапіс, напісаны чорнай тушшу, які пачынаўся так: "Паважаны Барыс Аляксеевіч! Вашу просьбу напісаць пра тое, што памятаю пра мастацкае жыццё на Гомельшчыне ў 20-я гады, я вырашыў у форме ліста да Вас, і Вы па сваім меркаванні зможаце скарыстацца тым матэрыялам, які пакажацца найбольш заслугоўваючым увагі…"


Уважаемый Борис Алексеевич,
выполняя Вашу просьбу написать о том, что помню о художественной жизни на Гомельщине 20-х годов, пишу в форме письма к Вам и Вы, по своему усмотрению, сможете воспользоваться тем материалом, который покажется наиболее достойным внимания.

У сваім хатнім архіве я беражліва захоўваю гэты рукатворны дакумент. Праўда, аднойчы, у 1990-я гады, фрагмент яго я апублікаваў у газеце "Культура", але матэрыял прайшоў неяк не заўважаным: тады культуролагаў і грамадства хвалявалі зусім іншыя праблемы ў беларускім выяўленчым мастацтве.

Спадзяюся, што зараз час іншы, і гэтыя ўспаміны з цікавасцю прачытаюць не толькі сучасныя мастацтвазнаўцы, гісторыкі мастацтва і мастакі, але і ўсе, хто цікавіцца праблемамі нацыянальнай культуры 20-х гадоў мінулага стагоддзя. Такіх людзей, на шчасце, сёння ўжо шмат. Падкрэслю, што Акім Шаўчэнка, карэнны беларус, нарадзіўся ў вёсцы Карма Добрушскага павета Гомельскай губерні. І ўсё жыццё ён лічыў сябе беларусам не толькі па крыві, але і па духоўным складзе. І калі ў яго неаднойчы з'яўлялася магчымасць назаўсёды застацца ў Маскве ці ў Ленінградзе, як гэта, напрыклад, зрабілі яго землякі з Гомельшчыны — Георгій Ніскі і Яўсей Маісеенка, ён не скарыстаўся такой магчымасцю і, у адрозненне ад сваіх знакамітых калег-беларусаў, на пачатку 30-х гадоў вярнуўся на радзіму, дзе да вайны кіраваў мастацкай студыяй пры Гомельскім абласным доме народнай творчасці, а пасля Перамогі ўчарашні франтавік Шаўчэнка звязаў сваё жыццё ўжо з Мінскам…

Такім чынам, слова — Акіму Міхайлавічу.

"…Ні ў якой ступені не прэтэндуючы на абавязковасць маіх тых або іншых ацэнак, мае ўспаміны, хутчэй, з'яўляюцца вольным аповедам пра ўражанні тых далёкіх гадоў майго вучнёўства. А пачалося ўсё тады, калі я, 15-гадовы хлопчык, скончыў вясковую школу ў вёсцы Карма Добрушскага павета. Паехаў у Гомель, паступіў у настаўніцкую семінарыю. Там я і захапіўся маляваннем. Свае першыя поспехі ў гэтай справе я замацаваў на педагагічных курсах у цудоўнага мастака-акварэліста і рысавальшчыка — Сяргея Іванавіча Грамыкі, выхаванца Кіеўскага мастацкага вучылішча, вучня выдатнага ўкраінскага педагога Фёдара Крычэўскага.

Там жа, у Гомелі, у 1921 годзе, я паступіў у мясцовае педагагічнае вучылішча і з гэтага часу зразумеў, што маё сапраўднае прызванне — мастацкае рамяство. Натуральна, я цікавіўся ўсім, што адбывалася тады ў культурным жыцці горада і, асабліва, у выяўленчым мастацтве. Часта хадзіў па вуліцах, разглядваў старажытныя помнікі, назіраў, як будаваліся новыя, іншым разам зазіраў у цэрквы, любаваўся невытлумачальнай прыгажосцю і мудрасцю абразоў, хаця на гэты час барацьба з "опіумам для народа" набірала ўсё большую моц.

Першае, што мяне гранічна зацікавіла ў новым мастацтве, — гэта роспіс у агітпункце чыгуначнага вакзала. Велізарная зала, вялікія вокны з прыгожымі прасценкамі. І на сценах — некалькі кампазіцый, выкананых клеявымі фарбамі. Асабліва цікавай падалася мне адна, шматфігурная, кампазіцыя: людзі — у поўны рост, у разнастайных нацыянальных строях; у цэнтры — жаночая постаць Свабоды, у царскім вянцы і багатай вопратцы. Праз усю кампазіцыю адмыслова вілася ружовая стужка з масіўным надпісам "Інтэрнацыянал". Гэтая постаць чымсьці нагадвала казачную царэўну, што нібыта сышла з папулярных тады шкатулак. На міжваконнях былі адлюстраваны сюжэты меншага памеру, прысвечаныя чырвонаармейцам, якія ідуць у атаку, рабочым з чырвонымі сцягамі і сейбітам.

Акрамя гэтага, былі раскіданы стракатыя дэкаратыўныя эмблемы і пячаткі. Як я даведаўся ад Грамыкі, аўтарам гэтых роспісаў быў мастак Афанасій Сцяпанавіч Сазонаў, з якім я пазней пазнаёміўся пад час маіх заняткаў у студыі імя Урубеля. У гэтую студыю, што размяшчалася ў Клубе чыгуначнікаў, я ўпершыню трапіў восенню 1920-га, калі тут экспанавалася выстаўка твораў студэнтаў і мастакоў-педагогаў С.Каўроўскага, К.Мальца, А.Быхоўскага ды іншых. Тут жа месцілася і пастаянная экспазіцыя, складзеная з эцюдаў натуршчыкаў, малюнкаў з гіпсавых масак і постацей — гэта значыць, твораў навучальнага, "класнага" характару. Аднак студэнты ў сваіх творчых спробах часта капіравалі гэтыя ўзоры.

Добра памятаю эцюды маладога таленавітага Жоры Ніскага, што адлюстроўвалі нейкія надзвычай фантастычныя каляровыя матывы з дзіўнымі крыналінавымі фігурамі — вельмі арыгінальна і зусім нязвыкла для погляду. Яны былі выкананы асобнымі каляровымі палоскамі, квадрацікамі, ромбікамі, што аддалена нагадвалі сілуэты гарадскіх будынкаў, дрэў, аблокаў.

Потым я блізка пасябраваў з Ніскім. Трошкі пазней мы разам рысавалі гіпсавую мадэль "Помніка Працы". У той час у Гомелі часова знаходзіўся і аўтар гэтага манумента — нейкі спадар па прозвішчы Дэ Валера, іспанец ці француз па паходжанні. Гэты помнік пазней быў устаноўлены на плошчы Працы: гіпсавая трохметровая напаўаголеная фігура ў моцным руху, размаляваная алейнымі фарбамі. Праўда, неўзабаве манумент кудысьці знік, хаця яго вобразатвор доўга заставаўся на вокладках школьных сшыткаў фабрыкі "Палесдрук". Дык вось, з Жорам Ніскім мы хадзілі на Працоўную вуліцу, дзе знаходзілася майстэрня гэтага скульптара. Спачатку — употай: зазіралі ў вялікія вокны майстэрні, глядзелі, як там гэты Дэ Валера з вучнямі ляпіў бюсты Маркса, Троцкага, Свярдлова, Энгельса. Потым, сціпла так, стукалі ў дзверы і ўваходзілі ў майстэрню, каб на свае вочы пабачыць, як працуюць будучыя "геніі розуму"…"

(Працяг будзе.)

Барыс КРЭПАК

АК Афіша "К"

з 9 лютага — да 16 лютага

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ МАСТАЦКІ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. Леніна, 20. Тэл.: 327 45 62.

Экспазіцыі:
- Мастацтва Беларусі XII — XVIII стст.
- Мастацтва Беларусі XIX — пач. XX стст.
- Мастацтва Беларусі XX — пач. XXI стст.
- Мастацтва Расіі XVIII — пач. XX стст.
- Мастацтва краін Заходняй і Цэнтральнай Еўропы XVI — XX стст.

Выстаўкі:
- **З 15 — "Польская кераміка XVIII — XX стст. з фондаў Верхнесілезскага музея з Бытомы".**
- **"Сустрэча. М.Фердынандаў і А.Рэверон. Дзве гамы аднаго натхнення".**
- **"Мастак і час"** (да 90-годдзя Л.Шчамялёва).
- **"Вайна 1812 года вачыма відавочцаў. Графіка Х.-В. Фон Фабера дзю Фора".**
- Партрэт Войцэха Пуслоўскага пэндзля Валенція Ваньковіча.
- **Слуцкія паясы** з фонду Нацыянальнага мастацкага музея Літвы.

Філіялы Нацыянальнага мастацкага музея Рэспублікі Беларусь:

МУЗЕЙ "ДОМ ВАНЬКОВІЧАЎ. КУЛЬТУРА І МАСТАЦТВА ПЕРШАЙ ПАЛОВЫ XIX СТ."

г. Мінск, вул. Інтэрнацыянальная, 33а. Тэл.: 327 87 96.

- Пастаянныя экспазіцыі: "Парадныя залы", "Жыццё і творчасць Валенція Ваньковіча", "Сядзібны партрэт XVII — сяр. XIX стст.".
- **"Цярноўнік крэсаў".**
- **"Аўтапартрэт"** Валенція Ваньковіча.

МУЗЕЙ БЕЛАРУСКАГА НАРОДНАГА МАСТАЦТВА Ў В. РАЎБІЧЫ

Спарткомплекс "Раўбічы", Мінскі раён. Тэл.: 507 44 68.

- Пастаянная экспазіцыя.
- Выстаўка А.Вярбіцкага. **"Сучаснасць. Былое. Майстар".**

МУЗЕЙ В.К. БЯЛЫНІЦКАГА-БІРУЛІ Ў Г. МАГІЛЁВЕ

г. Магілёў, вул. Ленінская, 37.

Тэл.: (8–0222) 22 48 87.

- Экспазіцыя **"Культура 1-й пал. XIX ст."**.
- **"Вясельныя традыцыі Усходу. Японія. Індыя. Карэя".**

МУЗЕІ

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТАРЫЧНЫ МУЗЕЙ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, вул. К.Маркса, 12. Тэл.: 327 43 22.

Экспазіцыі:
- **"Старажытная Беларусь".**
- **"Беларусь XVI — XVIII стст. у партрэтах і геральдыцы".**
- **"Водбліскі ваеннай славы".**
- **"Мастацтва ў гарадской культуры XIX — пач. XX стст.".**
- **"Вайна 1812 г. у гісторыі Мінска".**

Выстаўкі:
- Выстаўка **"Скарбы Беларусі"** (са збору музея).
- Выстаўка **"Чатыры пэндзлі: Бархатковы".**
- Выстаўка **"Душы маёй чароўнае святло".**

Дом-музей І З'езда РСДРП *г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 31а. Тэл.: 290 68 47.*
- **"Народная архітэктура беларускай вёскі ў здымках Уладзіміра Шарнікава".**

ЗАМКАВЫ КОМПЛЕКС "МІР"

г.п. Мір, Карэліцкі раён, Гродзенская вобласць. Тэл.: (8–01596) 2 82 91, (8–01596) 2 82 70.

- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:
- **"Мір стары — Мір новы"** (фотавыстаўка).
- **"Таварыства перасоўных мастацкіх выставак. XXI стагоддзе (Санкт-Пецярбург)"**.
- **"Рэмінісцэнцыя"** (выстаўка Ю. Каралевіча).

НАЦЫЯНАЛЬНЫ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНЫ МУЗЕЙ-ЗАПАВЕДНІК "НЯСВІЖ"

г. Нясвіж, вул. Ленінская, 19. Тэл.: 8–01770 5 51 81, 5 31 96, 2 06 02

- Выстаўка **"Вера, Надзея, Уваскрэсенне"**. З Музея Рокішкскага краю (Літва).

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНА-МЕМАРЫЯЛЬНЫ МУЗЕЙ ЯКУБА КОЛАСА

г. Мінск, вул. Акадэмічная, 5. Тэл.: 294 91 96.

- Экспазіцыя **"Якуб Колас. Жыццё і творчасць"**.
- Тэатралізаваная экскурсія паводле казак Якуба Коласа.
- **"Шляхам Янкі Купалы да Якуба Коласа"** (у філіяле "Мікалаеўшчына", у Мемарыяльнай сядзібе "Смольня").
- Выстаўка да 130-годдзя з дня нараджэння Якуба Коласа **"Якуб Колас — народны паэт Беларусі".**
- **"Таямніцы Дома Песняра".**

ДЗЯРЖАЎНЫ ЛІТАРАТУРНЫ МУЗЕЙ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Янкі Купалы, 4. Тэл.: 327 78 66.

- Пастаянная экспазіцыя **"Шляхі"** з праглядам роліка ў 3D-фармаце.
- Выстаўка **"Не загаснуць зоркі ў небе"** са збору Пушкінскага запаведніка.
- Цыкл музейна-педагагічных заняткаў з элементамі тэатралізацыі **"Дзядзька Янка, добры дзень!"** для дзяцей малодшага школьнага ўзросту і сямейнага наведвальніка.

ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

г. Мінск, вул. М.Багдановіча, 15. Тэл.: 334 56 21.

Выстаўкі:
- **"Апякункі паэтычных нябёс".**
- **"Васіль Быкаў. Шлях, вызначаны лёсам"** (жыццё і творчасць).
- **"Паэт з Нарачанскага краю"**. Да 100-годдзя з дня нараджэння Максіма Танка.
- **"Ходзіць Сон ля вакон..."** (прысвечана беларускай перадачы "Калыханка").
- **"А.П. Чэхаў. Лінія жыцця"** з фондаў Дзяржаўнага літаратурна-мемарыяльнага музея-запаведніка А.П. Чэхава "Меліхава" (Расія).

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 25а. Тэл: 226 03 98.

- Пастаянная экспазіцыя.

Выстаўкі:
- **"1812 г. Вайна і мір".**

ГОМЕЛЬСКІ ПАЛАЦАВА-ПАРКАВЫ АНСАМБЛЬ

г. Гомель, пл. Леніна, 4. Тэл.: (8-0232) 74 19 11. Цэнтральная частка палаца

Выстаўкі:
- **"Загадкавыя фантазіі мора"** (грот палаца).
- Экспазіцыя, прысвечаная дзяржаўнаму дзеячу СССР А.Грамыку.
- **"Чырвоная гасцёўня".**
- "Залаўрачыстых прыёмаў".
- Экспазіцыя адкрытага захавання археалагічнай калекцыі музея (цокаль паўднёвай галерэі).
- **"Старажытная гісторыя Гомельшчыны"** (археалагічная экспазіцыя). *Вежа палаца*

Экспазіцыя:
- **"Уладальнікі Гомельскага маёнтка Румянцавы і Паскевічы".**

Выстаўкі:
- **"Конны партрэт генерал-фельдмаршала І.Ф. Паскевіча (1874 г.)"** (выстаўка адной карціны з калекцыі Д.Асташонка).
- **"Мінулага прасочваючы ніць..."** (мемуарная літаратура канца XVIII — XX стст.).
- **"Класікі беларускага мастацтва".** *Паўночнае крыло палаца*

Экспазіцыя:
- **"Свет звяроў Гомельшчыны".**

Выстаўкі:
- **"Вось зіма прыйшла серабрыстая..."** (гомельскія мастакі).
- Куток жывых экзатычных рэптылій. *Зімовы сад*
- Свет субтрапічных раслін і жывёл.

ПАСПЯШАЙЦЕСЯ НА ПОШТУ!

НАГАДВАЕМ! ПРАЦЯГВАЕЦЦА ПАДПІСКА НА ГАЗЕТУ "КУЛЬТУРА" НА САКАВІК І НАСТУПНЫЯ МЕСЯЦЫ І-га паўгоддзя 2013 г.

Падпісныя індэксы: індывідуальная падпіска — 63875, ведамасная падпіска — 638752.

МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ ГОРАДА ГОМЕЛЯ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 32. Тэл.: (80232) 74-28-23.

Экспазіцыі:
- Інтэр'еры гарадскога асабняка к. XIX — пач. XX стст.
- Прагулкі па старым Гомелі.
- Гісторыя Гомеля ад старажытнасці да пачатку XX ст.

Выстаўкі:
- Фотаапараты і фотатэхніка XX ст. (каля 100 адзінак).

ГРОДЗЕНСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ МУЗЕЙ ГІСТОРЫІ РЭЛІГІІ

г. Гродна, вул. Замкавая, 16. Тэл.: (8-0152) 74 25 13.

Экспазіцыі:
- **"Рэлігія і культура ў Беларусі"** (ад старажытных часоў да XXI ст. — архаічныя вераванні, хрысціянскія канфесіі, іслам, іудаізм).
- **"Эпоха. Час. Будынак"** (гісторыя палаца, у якім размешчаны музей, сямейныя традыцыі і каштоўнасці XIX — пач. XX стст.).

Выстаўка:
- **"Пад Віфлеемскай зоркай"** (мастацкія творы з перламутру, ражджэсцвенскія паштоўкі канца XIX — пач. XX стст.).

ГОМЕЛЬСКІ АБЛАСНЫ МУЗЕЙ ВАЕННАЙ СЛАВЫ

г. Гомель, вул. Пушкіна, 5. Тэл.: (8-0232) 77 60 60.

- Пастаянная ваенна-гістарычная экспазіцыя.
- Выстаўка тэхнікі на адкрытай пляцоўцы.
- Выстаўка **"Салдацкі доўг"**.
- На тэрыторыі музея працуе пнеўматычны цір.
- **"Музей крыміналістыкі"**.

ЛІДСКІ ГІСТОРЫКА-МАСТАЦКІ МУЗЕЙ

г. Ліда, вул. Перамогі, 37а. Тэл.: (8-0154) 53 22 44.

- Пастаянная экспазіцыя **"Прырода Лідчыны"**.

Выстаўкі:
- **"Вядзём пачатак свой ад Гедыміна...".**
- **"Прадметы побыту к. XIX — пач. XX стст.".**
- Выстаўка адной карціны **"Партызаны".**
- **"Прывітанне, ранейшая Ліда!".**
- **"Музейна-вобразная зала "Хрушчоўка-60".**
- Турыстычна-пазнавальная праграма **"Праз вякі, праз стагоддзі"** ў Лідскім замку.

ГАЛЕРЭІ

ПАЛАЦ МАСТАЦТВА

г. Мінск, вул. Казлова, 3. Тэл./факс.: 290 60 10.

- Кірмаш-распродаж **"Дары Усходу са Светам мёду, здароўя і прыгажосці"**.

МАСТАЦКАЯ ГАЛЕРЭЯ "УНІВЕРСІТЭТ КУЛЬТУРЫ"

г. Мінск, Кастрычніцкая плошча, 1. Тэл.: 327 26 12.

- Выстаўка мадэльера Яважыны Неклашэвіч **"Куцюр: поры года"**.
- Выстаўка аўтарскай скульптурнай лялькі Ірыны Ханунік-Рамбальскай **"Манекеншчыцы. Iznanka"**.

ТЭАТР

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ВЯЛІКІ ТЭАТР ОПЕРЫ І БАЛЕТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

г. Мінск, пл. Парыжскай камуны, Тэл./факс: 334 11 56.

Гастролі Нацыянальнай оперы "Эстонія"
- **9 — "Травіята"** Дж.Вердзі.
- **10, 13 — "Манон"** Дж.Пучыні.
- **12 — "Шчаўкунок"** П.Чайкоўскага.
- **15 — "Трыстан і Ізольда"** Р.Вагнера.

"Серэнада" П.Чайкоўскага.
"Балеро" М.Равеля.
- **16 — "Іяланта"** П. Чайкоўскага.

НАЦЫЯНАЛЬНЫ АКАДЭМІЧНЫ ТЭАТР ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

г. Мінск, вул. Энгельса, 7. Тэл./факс: 227 60 81.

На сцэне Цэнтральнага Дома афіцэраў:
- **9, 10 — "Ноч на Каляды"** паводле М.Гогаля.
- **11 — "Выкраданне Еўропы, або Тэатр Уршулі Радзівіл"** паводле Ф.У.Радзівіл.
- **13 — "Чорная панна Нясвіжа"** А.Дударава.
- **6 — "Лістапад. Андэрсен"** А.Паповай.
- **7 — "Офіс"** І.Лаўзунд.
- **8 — "Вечар"** А.Дударава.

На сцэне Палаца культуры прафсаюзаў:
- **15 — "Сымон-музыка"** паводле Я.Коласа.

ЗАСЛУЖАНЫ КАЛЕКТЫЎ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ "РЭСПУБЛІКАНСКІ ТЭАТР БЕЛАРУСКАЙ ДРАМАТУРГІІ"

г. Мінск, вул. Крапоткіна, 44. Тэл./факс: 334 60 08.

- **9 — "Шчаслівы муж"** Ф.Аляхновіча.
- **10 — "Інтымны дзённік" ("Дзённік паэта")** С. Кавалёва.
- **11 — "В уснувшем парке в поздний час..."** (вечар цыганскага раманса).
- **12, 13 — "Дажыць да прэм'еры"** М.Рудкоўскага.
- **14 — "Адамавы жарты"** С.Навуменкі.
- **15 — "Адвечная песня"** паводле Я.Купалы.
- **16 — "Ліфт"** Ю.Чарняўскай.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ АКАДЭМІЧНЫ МУЗЫЧНЫ ТЭАТР

г. Мінск, вул. Мяснікова, 44. Тэл.: 200 81 26.

- **9, 10 — "Звычайны цуд"** Г.Гладкова.
- **12 — "Граф Люксембург"** Ф.Легара.
- **13 — "Аднойчы ў Чыкага"** Дж.Стайна, Г.Мілера, Дж.Кандэра і інш.
- **14 — "Асоль"** У.Саўчыка.
- **15 — "Юнона" і "Авось"** А.Рыбнікава.
- **16 — "Айбаліт-2002"** І.Левіна. **"Шчаўкунок"** П.Чайкоўскага.

БЕЛАРУСКІ ТЭАТР "ЛЯЛЬКА"

г. Віцебск, вул. Пушкіна, 2. Тэл.: (8-0212) 36 32 50.

- **9 — "Аладдзін"** Н.Гернэт.
- **10 — "Брэменскія музыкі"** В. Ліванава, Ю.Энціна.
- **13 — "Нататкі вар'ята"** паводле М.Гогаля (спектакль для дарослых).
- **16 — "Церам-церамок"** С.Маршака.

КУЛЬТУРА

ШТОТЫДНЁВАЯ ГРАМАДСКА — АСВЕТНІЦКАЯ ГАЗЕТА
Выдаецца з кастрычніка 1991 года
Заснавальнік — **Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь**
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 637, выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь

Галоўны рэдактар — Сяргей Сяргеевіч ТРАФІЛАЎ
Рэдакцыйная калегія:
Лілія АНАНІЧ, Уладзімір АРЛОЎ, Міхаіл БАРАЗНА, Уладзімір ГІЛЕП, Ірына ДРЫГА, Аляксей ДУДАРАЎ, Кацярына ДУЛАВА, Валянцін ЕЛІЗАР'ЕЎ, Міхаіл КАЗІНЕЦ, Віктар КУРАШ, Барыс СВЯТЛОЎ, Святлана СУХАВЕЙ, Міхаіл ФІНБЕРГ, Леанід ШЧАМЯЛЁЎ, Уладзімір ШЧАСНЫ.

Рэдакцыя:
Марына САМОНЧАНКА (адказны сакратар).

Рэдактары аддзелаў:
Дар'я АМЯЛЬКОВІЧ, Канстанцін АНТАНОВІЧ, Надзея БУНЦЭВІЧ, Таццяна КОМАНАВА, Барыс КРЭПАК, Яўген РАГІН, Ілья СВІРЫН.
Спецкарэспандэнты:
Пётр ВАСІЛЕЎСКІ, Юрый ЧАРНЯКЕВІЧ.
Загадчык аддзела фотаілюстрацый — Юрый ІВАНОЎ
Карэктар — Інга ЗЕЛЬГІС
Мастацкі рэдактар — Наталля ОВАД
Адрас рэдакцыі: 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77. Пакоі 16-28, 94-98, чацвёрты паверх.
Тэлефоны: (017) 290 22 50, (017) 286 07 97, (017) 334 57 23
Тэлефон/факс: (017) 334 57 41
Рэкламны аддзел: тэл. (017) 334 57 41

www.kimpress.by
E-mail: kultura@tut.by

Аўтарскія рукапісы не рэцэнзуюцца і не вяртаюцца.
Аўтары допісаў у рэдакцыю паведамляюць сваё прозвішча, поўнасцю імя і імя па бацьку, пашпартныя звесткі (нумар пашпарта, дату выдачы, кім выдадзены пашпарт, асабісты нумар), асноўнае месца працы, зваротны адрас.
Меркаванні аўтара могуць не адпавядаць пункту гледжання рэдакцыі.
Аўтары нясуць адказнасць за дакладнасць матэрыялаў.
***Матэрыял на правах рэкламы.**

"Культура", 2013.
Індэксы 63875, 638752
Наклад 7542
8.02.2013 у 18.30
Замова 673
Дзяржаўнае прадпрыемства "Выдавецтва "Беларускі Дом друку".
ЛП № 02330/0494179 ад 03.04.2009.
пр. Незалежнасці, 79, 220013, Мінск.

Выдавец — Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова "Культура і мастацтва"
Ліцэнзія на выдавецкую дзейнасць ЛВ №02330/0003879 ад 17 красавіка 2009 г.

Дырэктар — ПРЫКО Алег Васільевіч
Першы намеснік дырэктара — КРУШЫНСКАЯ Людміла Аляксееўна
Намеснік дырэктара па маркетынгу — СІДАРЭНКА Антон Васільевіч

220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 77.
Тэл.: (017) 290 22 50 (прыёмная).
Бухгалтэрыя: тэл.: (017) 334 57 35

9 771994 478007 13006